ДУ «МІНСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ А. С. ПУШКІНА»

# *БІБЛІЯТЭКІ МІНШЧЫНЫ Ў 2019 ГОДЗЕ: АГЛЯД ДЗЕЙНАСЦІ*

МІНСК
2020

УДК 02
ББК 78.3(4Беі)

Бібліятэкі Міншчыны ў 2019 годзе : агляд дзейнасці / ДУ "Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна". – Мінск, 2020. – 136 с.

# Змест:

**Лазарава І. П.** Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва……………………………… 4

**Анацка В. Л., Барахоўская М. В., Вярхоўская К. Д.** Змест і арганізацыя работы з чытачамі ……………….. 6

**Рудзянок І. С.** Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей …….. 83

**Гіль В. М.** Камплектаванне і арганізацыя адзінага фонду ……………………………………… 117

**Крахмалюк К. І.** Інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне ……………………………………….. 120

**Несцярэнка А. Г.** Метадычная дзейнасць ……………. 130

# Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва

На 31.12.2019 г. сетку публічных бібліятэк Мінскай вобласці складаюць **445 бібліятэк:** абласная бібліятэка, 22 цэнтральныя раённыя і 1 гарадская, 421 бібліятэка-філіял, з іх – 41 гарадскі, 21 гарпасялковы, 359 сельскі.

На працягу 2019 г. сетка **скарацілася на 3 адзінкі.** Сваю дзейнасць спынілі Манькаўшчынская сельская бібліятэка Валожынскага раёна і Соланская сельская бібліятэка-клуб Старадарожскага раёна. Чэрвеньская дзіцячая раённая бібліятэка рэарганізавана ў аддзел па рабоце з дзецьмі Чэрвеньскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.

Інтэграцыя публічных бібліятэк ажыццяўляецца з улікам сацыякультурнай і дэмаграфічнай сітуацыі ў рэгіёне. На 31.12.2019 г. на тэрыторыі Мінскай вобласці дзейнічаюць **157 інтэграваных бібліятэк,** 149 з якіх знаходзяцца ў ведамаснай падпарадкаванасці Міністэрства культуры, 8 – Міністэрства адукацыі.

На 31.12.2019 г. у Мінскай вобласці налічваецца **39 бібліятэк-клубаў.**

З мэтай поўнага ахопу бібліятэчным абслугоўваннем насельніцтва маланаселеных і аддаленых вёсак пры публічных бібліятэках дзейнічаюць **345 бібліятэчных пунктаў,** а таксама **18 біблібусаў,** якія абслугоўваюць 435 аддаленых населеных пунктаў.

У 2019 г. карыстальнікамі бібліятэк вобласці з’яўляліся **438,3 тыс. чытачоў** (з улікам чытачоў абласной бібліятэкі). У бібліятэках вобласці ў цэлым назіраецца тэндэнцыя да памяншэння колькасці чытачоў: у параўнанні з 2018 г. іх колькасць паменьшылася на 2,6 тыс. чал. Працэнт ахопу насельніцтва бібліятэчным абслугоўваннем складае 28,6%. **Колькасць наведванняў склала па вобласці 4 324,1 тыс.,** што на 134,4 тыс. больш, чым ў папярэднім годзе і на 20,3% болей у параўнанні з 2015 годам.

Чытальнасць па вобласці склала 18,1; абарачальнасць фонду – 1,2. Кнігавыдача па вобласці склала 7 931,3 тыс. экз. дакументаў (з улікам абласной бібліятэкі), што на 15,7 тыс. экз. менш, чым у 2018 г.

У Мінскай вобласці **камп'ютарызавана 455 бібліятэк – 100%** ад агульнай колькасці. Зараз сукупная колькасць камп'ютараў складае 1 100 (з улікам абласной бібліятэкі), з якіх у Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С. Пушкіна – 109, у цэнтральных бібліятэках – 494, гарадскіх філіялах – 76, гарпасялковых – 29, сельскіх – 392, у бібліятэках аграгарадкоў – 299. З 2018 года ўсе цэнтральныя бібліятэкі цалкам або часткова ў тэставым рэжыме перайшлі на праграмнае забеспячэнне ALISWeb.

Усяго па вобласці **выхад у глабальную сетку і электронную пошту маюць 455 бібліятэк – 100%** ад агульнай колькасці.

**Уласныя сайты маюць 35 бібліятэк** Мінскай вобласці: абласная бібліятэка, цэнтральныя – 23, дзіцячыя – 3, гарпасялковыя – 1, сельскія – 7.

У мінулым годзе публічныя бібліятэкі вобласці працягвалі дзейнасць па аказанні дадатковых платных паслуг насельніцтву. У сярэднім па вобласці аказваецца каля 30 відаў паслуг. Самымі запатрабаванымі платнымі паслугамі застаюцца выдача дакументаў з камерцыйнага фонду і чытальнай залы, ксеракапіраванне, раздрукоўка і сканіраванне.

# Змест і арганізацыя работы з чытачамі

## Прававое выхаванне

Бібліятэкі вобласці праводзяць вялікую работу, накіраваную на павышэнне ўзроўню **прававой культуры**. Бібліятэкі становяцца інфармацыйна-прававымі цэнтрамі сваёй мясцовасці. Тут прадастаўляецца доступ да прававой і сацыяльна-значнай інфармацыі насельніцтву, распаўсюджваюцца прававыя веды, выхоўваецца прававая культура.

На базе ДУК "Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўлюка Пранузы" працуе праект "Защити себя сам", у рамках якога праходзіць цыкл мерапрыемстваў, галоўнай тэмай якіх з'яўляецца права і прававая адукацыя. З мая 2019 года пачаў сваю дзейнаць праект "Прававы мерыдыян". Мэта праекта – зрабіць прававую інфармацыю больш даступнай насельніцтву. Праект узгоднены з юрыдычнай кансультацыяй Нясвіжскага раёна, судом Нясвіжскага раёна, натарыяльнай канторай Нясвіжскага раёна, ГУ "Рэдакцыя газеты "Нясвіжскія навіны" і праграмай радыёвяшчання "Раніца Нясвіжчыны".

Працягвалася рэалізацыя ДУК "Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка" доўгатэрміновага праекта "Молодежь. Закон. Право", накіраванага на фарміраванне прававой культуры маладога пакалення, выхаванне інфармацыйна-прававой культуры асобы, якая ведае свае правы і абавязкі.

Сумесна з іншымі ўстановамі культуры ДУК "Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна" быў распрацаваны праект "Мы вместе". Мэта праекта – стварэнне агульнай арганізацыйнай сістэмы мерапрыемстваў для ўключэння непаўналетніх у дасугавую занятасць на пастаяннай аснове.

Лясноўская сельская бібліятэка Капыльскага раёна вялікую ўвагу надае **прававому выхаванню**. У бібліятэцы прайшоў Дзень прававой інфармацыі "Прававы калейдаскоп", бібліятэкары пазнаёмілі чытачоў з заканадаўчай літаратурай з

фонду бібліятэкі, электроннай інфармацыйна-пошукавай сістэмы “Эталон” НЦПІ Рэспублікі Беларусь.

У Сямкоўскай сельскай бібліятэцы Лагойскага раёна праведзена гутарка “У свеце законнасці”, удзельнікі якой даведаліся пра гісторыю ўзнікнення права, аб важным значэнні “Дэкларацыі праў чалавека”, якая адкрыла цэлую эпоху ў барацьбе за правы асобы і яе свабоды.

10 снежня ў гарадской бібліятэцы-філіяле №1 Маладзечанскага раёна адбыўся прававы лікбез “Няведанне праў не вызваляе ад адказнасці” сярод навучэнцаў УА “Маладзечанскі дзяржаўны каледж”. У ходзе мерапрыемства навучэнцы даведаліся пра тое, якімі правамі і абавязкамі яны надзелены, азнаёміліся з асноўнымі прававымі дакументамі. Удзельнікі прававога лікбезу актыўна адказвалі на пытанні віктарыны “Ты и твои права”.

На гадзіну разважанняў “От правил – к праву” запрасіла да сябе ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”. З падлеткамі былі абмеркаваны розныя сітуацыі, якія максімальна даступна давалі зразумець, як правільна выкарыстоўваць свае правы. Кожная асобная праблема была разгледжана на прыкладзе таго ці іншага артыкула. У канцы мерапрыемства ўжо на прыкладах з жыцця расказвалі пра тое, як яны выконваюць свае абавязкі як вучняў і грамадзян сваёй краіны.

Аддзел абслугоўвання і інфармацыі ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка” арганізаваў сустрэчу “Нить Ариадны. В лабиринте права” з мэтай прафілактыкі правапарушэнняў у падлеткавым асяроддзі і павышэнне ўзроўню прававых ведаў падлеткаў. Мерапрыемства з вучнямі СШ № 2 і прафесійна-будаўнічага ліцэя правялала старшыня суда Чэрвеньскага раёна Наталля Уладзіміраўна Тарасік. Супрацоўнікі бібліятэкі правялі прававую гульню для замацавання атрыманых ведаў.

Таксама прайшлі іншыя мерапрыемства прававой тэматыкі: інфармацыйная гадзіна “Твои права и твои обязанности”, круглы стол “Тебе о праве и право о тебе”

(Барысаўскі раён); размова з юрыстам "Прававы лікбез", інтэлектуальная гульня "Чалавек мае права" (Вілейскі раён); інфармацыйна-прававыя акцыі "Закон аб нас, для нас, за нас" (Рассветаўская сельская бібліятэка Клецкі раён); прававы трэнінг "Жыць у адказе за свае ўчынкі", інфармацыйная гадзіна "У свеце права і закона", пазнавальная гадзіна "О правах и свободах интересно и просто" (Крупскі раён); гадзіна пытанняў і адказаў "Я паважаю свае правы" (Лагойскі раён); гульня-віктарына "Прававы эрудыт", брэйн-рынг "Права человека в литературных произведениях", гадзіна праблемных пытанняў "Правовая культура и правовое воспитание личности" (Маладзечанскі раён); гадзіна даверу "Кожны чалавек мае права" (Мядзельскі раён); урок-кансультацыя "Можна і нельга", прэс-кансультацыя "Пытайце – вам адкажуць" (Пухавіцкі раён); прававое кола "Тэрарызм і адказнасць", віртуальны экскурс "Запрашаем у Музей дзяржаўнасці", школа права "Першы статут Вялікага княства Літоўскага", час сацыяльнай інфармацыі "Электронныя сродкі плацяжу", адкрыты прагляд юрыдычнай літаратуры "Юрыдычная думка: адкрыты фармат", адзіны дзень юрыдычнай адукацы "Правы чалавека – галоўная каштоўнасць дзяржавы" (Слуцкі раён); юрыдычная гадзіна "Правовое государство: взгляд в будущее", прававая акадэмія "Равные права. Равны ли возможности?", медыя-агляд "Это знать не помешает" (Старадарожскі раён); лабараторыя прававога інфармавання "Правовые знания – молодежи", экспрэс-кансультацыя "Правовой багаж пенсионера", лікбез спажыўца "Знай свои права, потребитель" (г.Жодзіна).

Бібліятэкі прымалі актыўны ўдзел ў міжведамаснай прафілактычнай акцыя "**Дружим с законом!**" у рамках комплекснага плана мерапрыемстваў па прафілактыцы безнагляднасці, правапарушэнняў непаўналетніх, абароне правоў і законных інтарэсаў непаўналетніх

У рамках акцыі ў аддзеле абслугоўвання і інфармацыі ДУ "Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" прайшоў духоўны дыялог-адкрыццё "Достигнув дна,

вернуться к свету”, удзельнікамі якога сталі члены раённага клуба для падлеткаў уліковых катэгорый “Шаг вперёд”.

У Шчэпіцкай сельскай бібліятэцы Клецкага раёна прайшла гутарка-дыялог “Сябруем з законам” з запрашэннем старшага ўчастковага інспектара Канановіча А. В. Падчас дыялогу абмяркоўваліся пытанні адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці, пытанні асабістай бяспекі ў вячэрні час, правілы перамяшчэння на роварах, мапедах, скутэрах, а таксама рух пешаходаў у населеных пунктах. Актыўна абмяркоўваліся правілы паводзін дзяцей і падлеткаў у грамадскіх месцах

У рамках акцыі ў Ждановіцкай сельскай бібліятэцы Мінскага раёна адбылася сустрэча з суддзёй Мінскага раённага суда Кулага Г.П. “Защищая детство”. У рамках круглага стала чытачы былі азнаёмлены з асаблівасцямі канстытуцыйнага ўладкавання Рэспублікі Беларусь і гісторыяй яго развіцця, даведаліся, што Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь па ўсіх галоўных параметрах – гэта сімвал развітога, свабоднага грамадства.

Таксама ў бібліятэках прайшлі: сустрэча з участковым інспектарам “Падлетак і закон” (Валожынскі раён); хвілінка “Все вправе знать о праве” (Дзяржынскі раён); прававая літдапамога “О детях и для детей”, бібліягадзіна “Азбука прав ребёнка” (Капыльскі раён); круглы стол “У свеце законнасці”, інфармацыйная гадзіна “Моладзі аб законе” (Крупскі раён); прававы компас “Прававая інфармацыя для ўсіх”, тэматычна-інфармацыйная гадзіна “Закон мне друг” (Мінскі раён); вечар пытанняў і адказаў “Дорожная азбука”, квэст-гульня “От правила – до права” (Старадарожскі раён); інтэрактыўная бібліятэчная акцыя “Я ведаю закон”, гутарка-практыкум “Знаешь ли ты законы?” (Уздзенскі раён).

У сельскай бібліятэцы №33 в. Маісееўшчына Барысаўскага раёна прайшла тэматычная гадзіна “Беларусь моя, мой край родной”, прысвечаная **дзяржаўнай сімволіцы Рэспублікі Беларусь**. У ходзе мерапрыемства бібліятэкары распавялі чытачам аб стварэнні і зацвярджэнні Дзяржаўнага

герба і сцяга, адзначыўшы, што дзяржаўная сімволіка – гэта агульнаграмадзянская каштоўнасць і да яе трэба ставіцца з павагай. Акрамя таго, удзельнікі сустрэчы адказалі на пытанні тэматычнай віктарыны, прапанаванай бібліятэкарам, і праслухалі песні пра Радзіму.

З нагоды Дня Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь супрацоўнікі ДУК “Вілейская цэнтральная бібліятэка ім. Г. Новік” у чытальнай зале правялі інфармацыйную гадзіну “Дзяржаўныя сімвалы краіны”. У праграме мерапрыемства: мультымедыйная прэзентацыя аб гісторыі ўзнікнення сімвалаў Рэспублікі Беларусь, кніжная выстава і агляд каля выставы “Дзяржаўныя сімвалы краіны”, пазнавальная віктарына “Мая краіна”. Напачатку сустрэчы намеснік дырэктара ДУК “Вілейкая РЦБ імя Г.Новік” Г.М. Аўласовіч павіншавала прысутных з гэтым важным для беларускай дзяржаўнасці святам. Напрыканцы ўсе чытачы праспявалі гімн Рэспублікі Беларусь.

У ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка” быў арганізаваны гістарычны хранограф “Три символа в истории Беларуси”. Задачы мерапрыемства: садзейнічаць засваенню вучнямі асноўных ведаў аб Дзяржаўным сцягу і гербе Рэспублікі Беларусь; спрыяць выхаванню паважлівага стаўлення да сімвалаў сваёй дзяржавы; фарміраванне актыўнай дзяржаўнай і асобаснай пазіцыі падрастаючага пакалення. Бібліятэкар пазнаёміла ўдзельнікаў мерапрыемства з гістарычнымі фактамі пра дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь, правяла настольную гульню “Правовая мудрость”, якая дапамагла ўспомніць народныя прыказкі і прымаўкі пра мараль, права, законнасць.

Таксама былі праведзены: інфармацыйная гадзіна “Государственный герб и Государственный флаг Республики Беларусь”, патрыятычная старонка “Наш герб и флаг” (Барысаўскі раён); гісторыка-патрыятычная гадзіна “Сімвалы надзеі і дабра”, гадзіна сімволікі “Немеркнущие символы”, інфармацыйная гадзіна “Герб. Сцяг. Гімн” (Лагойскі раён); брэйн-рынг “Ведай і шануй сваю сімволіку”, гадзіна гісторыі

“Сімвалы, якімі ганарыцца краіна”, медыя-прэзентацыя “Галоўныя сімвалы тваёй краіны” (Любанскі раён); інфармацыйная гадзіна “Ведай і шануй сваю сімволіку”, інфарміна “Сімвалы Рэспублікі Беларусь” (Мінскі раён); інфарміна “Галоўныя сімвалы свабоды”, тэматычная гадзіна “Сімвалы роднай дзяржавы” (Пухавіцкі раён); пазл-віктарына “Символы Родины”, прававы ўрок “Герб и флаг моей страны” (Салігорскі раён); юрыдычная гадзіна “Вялікія сімвалы дзяржавы: Герб, Гімн, Сцяг” (Слуцкі раён).

**Да 25-годдзя прыняцця Канстытуцыі РБ** ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка” было праведзена мерапрыемства “Мы Конституции верны”. Бібліятэкары з дапамогай слайд-прэзентацыі пазнаёмілі навучэнцаў з гісторыяй узнікнення і развіцця канстытуцыйнага права ў нашай рэспубліцы, структурай Канстытуцыі, з асноўнымі правамі і абавязкамі грамадзян РБ. Па заканчэнні мерапрыемства была праведзена прававая віктарына.

Для наведвальнікаў Коранскай сельскай бібліятэкі Лагойскага раёна была арганізаваная гутарка-дыялог “Вучымся быць грамадзянамі”. Прагучала інфармацыя аб тым, калі была прынятая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, якія правы і абавязкі маюць грамадзяне нашай краіны.

Шашкоўская сельская бібліятэка Стаўбцоўскага раёна правяла прававы ўрок “Асноўны закон дзяржавы – юрыдычная база ўсяго заканадаўства”. Дзеці вучыліся аналізаваць учынкі з пункту гледжання правамернасці, актыўна выказвалі свае думкі і прымалі ўдзел у дыскусіі. Участковы інспектар расказаў аб магчымасці і ролі Дзіцячага прававога сайта ў фарміраванні прававой культуры дзяцей і падлеткаў.

Да юбілею былі арганізаваны: гістарычны экскурс “Главный гарант наших прав”, тэматычная гутарка “Права человека – гарантия государства” (Барысаўскі раён); гадзіна палітычнай культуры “Канстытуцыя.Чалавек. Дзяржава” (Вілейскій раён); урок грамадзянскасці “Сімвалы, якімі ганарыцца наша краіна” (Дзяржынскі раён); дзень інфармацыі “Канстытуцыя – асноўны закон жыцця”, гадзіна

грамадзянскасці “Галоўны закон тваёй краіны” (Крупскі раён); інфарміна “Канстытуцыя – вышэйшая юрыдычная сіла”, інфармацыйная гадзіна “Закон, па якім жыве краіна” (Любанскі раён); прававы лікбез “Пра тое, што важна: да Дня канстытуцыі Рэспублікі Беларусь”, правазнаўчая гадзіна “Основной закон государства: права, гарантии, защита” (Маладзечанскі раён); кіналекторый “Канстытуцыя – сімвал эпохі”, пазнавальная гадзіна “Все мы соблюдать должны основной закон страны!” (Мінскі раён); пазнавальная гадзіна “Мы жывём пад аховай закона” (Мядзельскі раён).

У лістападзе ў Рэспубліцы Беларусь прайшла важная палітычная падзея – **выбары ў Савет Рэспублікі і Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання**. Бібліятэкі Міншчыны актыўна ўключыліся ў інфармацыйную падтрымку выбарчай кампаніі.

У Ждановіцкай сельскай бібліятэцы Мінскага раёна і Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэцы” прайшла сустрэча з кандыдатам у дэпутаты Падлужнай Людмілай Браніславаўнай: “Слышать людей! Работать для людей!”. Падчас сустрэчы з чытачамі бібліятэкі Людміла Браніславаўна расказала аб сваёй перадвыбарнай праграме, адказала на пытанні прысутных.

У Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшла інфармацыйная гутарка “Выбіраем будучае”, адбылася сустрэча з кандыдатам ў дэпутаты ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі па Пухавіцкай выбарчай акрузе №65 Белаконевым Алегам Аляксеявічам.

ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна” прыняла ўдзел у акцыі “Мы голосуем вместе”. Бібліятэкары і члены Беларускага саюза жанчын запрашалі прыняць удзел у выбарах, расказалі аб мерапрыемствах, якія будуць праведзены на выбарчых участках.

Бібліятэкі правялі шэраг мерапрыемств насустрач выбарам: цыкл кніжных выстаў “Беларусь выбирает” (Барысаўскі раён), выстава “Наш выбор – наше будущее” (Гародзькаўская сельская бібліятэка, Валожынскі раён), тэматычная паліца “Да ўвагі выбаршчыкаў” (Нарачанская

сельская бібліятэка, Вілейскі раён); выстава-агляд “Сделай правильный выбор” (Семежаўская сельская бібліятэка, Капыльскі раён); канцэртная праграма “За Беларусь!”, тэматычныя праграмы “Радзіма для кожнага адна”, дзень інфармацыі “Я будучы выбаршчык” (Клецкі раён); куток выбаршчыка “Зрабі правільны выбар” (Мядзельскі раён); куток выбаршчыка “Насустрач выбарам – 2019”, выстава-заклік “Выбары – гэта права выбару” (Пухавіцкі раён); інфармацыйная гадзіна “25 лет по новой Конституции”, прававая гульня “Грамадзяне краіны дзяцінства” (Смалявіцкі раён).

Працягвалі працу клубы Міншчыны: клуб для падлеткаў уліковых катэгорый «Шаг вперёд» (Дзяржынскі раён); клуб “Клуб выходного дня” (Крупскага раёна)**;** клуб для падлеткаў “Дыялог” (Несвіжскі раён); школа прававых ведаў “Правовой меридиан” (Салігорскі раён).

**Экалагічнае выхаванне**

Экалагічная асвета і адукацыя – неад’емная частка маральнага выхавання асобы з ранняга дзяцінства і на працягу ўсяго жыцця. Бібліятэкі Міншчыны праводзяць цікавую і мэтанакіраваную работу па экалагічнай асвеце і адукацыі разнастайных катэгорый наведвальнікаў бібліяэк.

Крупская сельская бібліятэка працуе па рэалізацыі доўгатэрміновай мэтавай **рэгіянальнай праграмы** “Любіць і аберагаць непаўторнае хараство”, афармлены экалагічны куток пад аналагічнай назвай. Пры бібліятэцы сумесна са школай і лясгасам працуе гурток “Лесавічок”. У рамках праграмы праводзіліся акцыі, экскурсіі, віктарыны, экалагічныя падарожжы.

У 2019 годзе ў ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўлюка Пранузы” працягвалася работа над праектам “Зялёныя дні ў бібліятэцы. Мерапрыемствы садзейнічалі фарміраванню экалагічнай культуры. Бібліятэкары імкнуліся паказаць сваім чытачам з дапамогай

кнігі прыгажосць навакольнага свету, вучылі беражлівым адносінам да прыроды.

Сістэматычнасць працы ў экалагічным кірунку забяспечваюць мэтавыя праграмы, якія рэалізуюцца ў Старадарожскім раёне: “Жить в согласии с природой” , “Открой для себя мир природы”, “Мир вокруг нас”.

Сацыяльна-экалагічны праект “Новая жизнь в обмен на крышечки” рэалізуе ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г.Жодзіна”. Мэта праекта: арганізацыя цэнтралізаванага паасобнага збору розных відаў адходаў пластмасы.

10 студзеня да 610-годдзя ўстанаўлення запаведнага рэжыму ў Белавежскай пушчы ў гарадской бібліятэцы № 2 г. Барысава адбылася віртуальная экскурсія “В пущу ты входи смелей, словно в редкостный музей” для вучняў 4 “Г” класа ДУА “Сярэдняя школа № 18”. Школьнікі здзейснілі віртуальную экскурсію ў Белавежскую пушчу і пазнаёміліся з дзіўным жывёлам і раслінным светам унікальнага запаведніка.

Экалагічны суд “Земли не вечна благодать” прайшоў у Негарэльскай сельскай бібліятэцы Дзяржынскага раёна. Кожны чалавек – гэта часцінка Зямлі, таму ён павінен разважаць над экалагічнымі праблемамі, неабыякава ставіцца да кожнага матыля і страказы, кожнага звера і птушкі, і ў канчатковым выніку – да самога сабе. Падчас мерапрыемства гучалі вершы паэтаў пра тое, што трэба берагчы прыроду і нашу зямлю.

У Акцябрскай сельская бібліятэцы Лагойскага раёна адбылося эколага-краязнаўчае падарожжа “Птушкі нашага краю, занесеныя ў Чырвоную кнігу”. Школьнікі пазнаёміліся з выданнем “Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь”, адказалі на пытанні міні-віктарыны. Былі адзначаны і птушкі-чырвонакніжнікі, якія распаўсюджаныя ў дадзенай мясцовасці – шэры журавель, чорны бусел.

ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка” ўрачыста падвяла вынікі раённага экалагічнага конкурса “Захаваем прыроду разам!”. На конкурс былі прадстаўлены малюнкі, фотаработы, вырабы з прыроднага матэрыялу. Вынікі літаратурнага конкурсу падвяла дзіцячы пісьменнік, старшыня

Мінскага абласнога аддзялення ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі" Святлана Анатольеўна Быкава.

У бібліятэках вобласці прайшлі і іншыя мерапрыемства экалагічнай тэматыкі: экалагічнае падарожжа "Мир заповедной природы", інтэрактыўная гутарка "Вода – сокровище Земли" (Барысаўскі раён); вечар экалагічных ведаў "Новае пакаленне, беражы планету!" (Бярэзінскі раён); дзень экалагічных ведаў "У гэтым краі я нарадзіўся", экагід "Полна загадок чудесница Земля" (Вілейскі раён); гутарка "Мы іх не ўбачым да вясны", акцыя "Верни природе чистоту" (Капыльскі раён); экалагічны дэсант "Час збіраць смецце", экалагічны рынг "Зямля, дзе мы жывём", тэст-агляд "Энергазберажэнне ў нашым доме" (Клецкі раён); экападарожжа "Беларуская прырода – вядомая, нечаканая і неверагодная" (Крупскі раён); падарожжа па Чырвонай кнізе "Мы павінны іх выратаваць", тыдзень экалогіі "Мы хочам, каб птушкі спявалі і была на ягадах раса" (Лагойскі раён); мультымедыйная віктарына "Любители природы", экалагічны гід "Путешествие в орлиную страну" (Любанскі раён); эка-квіз "Ждёт помощников природа", экалагічны кактэйль "Таямніцы роднай прыроды", экалагічны калаж "Защитим окружающую природу" (Маладзечанскі раён); гадзіна практычнага меркавання "Рециклинг – чудеса из ничего" (Мінскі раён); урок экалагічнай адукаванасці "Брось природе спасательный круг", гадзіна карыснай інфармацыі "Бяспечна і эканомна: утылізацыя электроннага абсталявання" (Пухавіцкі раён); эка-гадзіна "Экалагічная культура – вышэйшая форма гуманізма", экалагічнае сафары "Такие разные, такие классные", экалагічны кнігамаршрут "Красная Книга и её обитатели" (Слуцкі раён); гадзіна інфармацыі "З жыцця дрэў і жывёл Беларусі", калыска даўніны "Белавежскі матыў" (Смалявіцкі раён); эка-марафон "Лесные тайнички", гадзіна экалогіі "Што мы пакінем нашчадкам", экамарафон "Знакомый и незнакомый мир природы" (Старадарожскі раён).

У зале літаратуры на замежных мовах ДУК "Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча" да **Дня Зямлі** арганізаваны "Тыдзень зямлі". У

яго рамках для падлеткаў была праведзена інтэрактыўная праграма “Зямля – наш агульны дом”. Яе ўдзельнікі актыўна абмяркоўвалі праблемах, разважалі пра экалогію нашай планеты. Падлеткі паглядзелі і абмеркавалі фільм, прысвечаны экалагічным пытанням. Мерапрыемства закончылася спевам песні пра магчымую экалагічную катастрофу.

Таксама прайшлі: гадзіна разважанняў “Земля – слезинка на щеке Вселенной”; гутарка “Как хрупка наша планета” (Барысаўскі раён); віктарына “Адзіная ў свеце” (Дорская сельская бібліятэка, Валожынскі раён); бяседа “Зямля – слязінка на шчацэ Сусвету” (Вілейскі раён); гульня-конкурс “Знаўцы прыроды” (Капыльскі раён); інфармацыйная гадзіна “Прырода. Экалогія. Жыццё. Будучыня”, падарожжа ў свет запаведнай прыроды “Зямлі рознакаляровае ўбранне нам берагчы і прымнажаць” (Лагойскі раён); экавіктарына “Эта хрупкая планета”, парады Рабінзона “День, проведённый с природой” (Любанскі раён); экалагічная гадзіна “Чыстая экалогія – здаровае жыццё”, экаўрок “І вечная прыроды прыгажосць”, экалагічная гасцёўня “Чаруе душу вечная краса” і экалагічная гульня-віктарына “Экалагічны калейдаскоп” (Пухавіцкі раён).

У Гародзькаўскай сельскай бібліятцы Валожынскага раёна была праведзена гадзіна смутку “Чарнобыль – наш боль” для моладзі і падлеткаў. Бібліятэкар распавяла пра тое, што прайшло ўжо 33 гады з таго дня, калі ў памяшканні 4-га энергетычнага блока **Чарнобыльскай АЭС**, адбыўся магутны выбух. У выніку аварыі кожны пяты жыхар Беларусі стаў ахвярай Чарнобыля.

Ці захаваем мы прыроду планеты, прычыны аварыі, яе ліквідацыя і наступствы – аб гэтым і расказала бібліятэкар Баравікоўскай інтэграванай сельскай бібліятэкі Дзяржынскага раёну ў час правядзення відэафакта “Чернобыль – взгляд сквозь время”. У ходзе мерапрыемства была паказана хроніка тых трагічных дзён. Удзельнікі даведаліся, што ядзерны выбух, які знішчыў 26 красавіка 1896 года Чарнобыльскую АЭС, звязаў народы многіх краін адной бядой.

У сельскай біблітэцы аг. Маркава Маладзечанскага раёна прайшла гадзіна смутку і памяці “Чорны боль” з удзелам ліквідатара аварыі на Чарнобыльскай АЭС Бобрыка М.А. Ён расказаў аб тым, як быў накіраваны з групай выратавальнікаў на месца трагедыі, якія прыходзілася здзяйсняць аперацыі, каб ліквідаваць аварыю, аб тым, праз якія выпрабаванні прыйшлося прайсці, каб як мага хутчэй зрабіць бяспечнай крыніцу радыцыйнага выпраменьвання.

26 красавіка ў чытальнай зале Смалявіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя. М. Багдановіча прайшоў літаратурны вечар памяці “Чарнобыль баліць, Чарнобыль вучыць”, прысвечаны катастрофе на Чарнобыльскай АЭС. На мерапрыемстве прысутнічалі навучэнцы ДУА “Смалявіцкая раённая гімназія”. Вядучыя пазнаёмілі іх з падрабязнасцямі тых страшных дзён: выпрабаванні на станцыі, пажар і непапраўныя наступства. Была паказана відэапрэзентацыя “Рэха Чарнобыля. Гады праз”, а само мерапрыемства суправаджала кніжная выстава “І свет здрыгануўся”. Прагучала шмат вершаў і песень на тэму Чарнобыльскай катастрофы.

Смілавіцкая гарпасялковая бібліятэка Чэрвеньскага раёна прапанавала карыстальнікам інфармацыйную гадзіну “Чёрная боль Белой Руси”, на якой вялася размова пра мужнасць і гатоўнасць да самаахвяравання людзей, якія першымі прынялі ўдар Чарнобыльскай аварыі на сябе.

Да Міжнароднага дня памяці ахвяраў радыяцыйных аварый і катастроф бібліятэкі Міншчыны падрыхтавалі: рэквіем-гадзіна “Чарнобыль спальвае сэрцы”, літаратурная вечарына “Апаленая попелам Чарнобыля пяшчотная кветка кахання” (Бярэзінскі раён); вечар смутку “Бядой запаленае слова”, дзень памяці “Незабыўны дзень Чарнобыля” (Валожынскі раён); экалагічны час “Чарнобыль баліць, папярэджвае, вучыць” (Капыльскі раён); круглы стол “Балючы ўспамін” (Халопеніцкая гарпасялковая бібліятэка, Крупскі раён); дзень памяці і смутку “Чарнобыль жывы і назаўжды небяспечны”, дзень памяці “Чарнобыль: паміж мінулым і

будучым” (Лагойскі раён); віртуальны агляд літаратуры “Чарнобыль: праз 33 гады”, экавідэафільм “Зямля, параненая Чарнобылем” (Любанскі раён); гутарка-напамін “След Чорнага ветру”, дзень смутку і перасцярогі “Чарнобыль – боль, які спальвае сэрца” (Мінскі раён); літаратурная кампазіцыя “Незагоенай ранай Чарнобыль баліць”, вусны часопіс “Чарнобыль: помнім дзеля будучага”, урок-напамін “Чарнобыль: 33 гады пасля трагедыі” (Мядзельскі раён); інфармацыйная гадзіна “Имя той звезды – ПОЛЫНЬ”, мультымедыйная прэзентацыя “20 секунд, которые потрясли мир” (Салігорскі раён); літаратурная гадзіна “Чернобыль и мы”, абмеркаванне кнігі І.Шамякіна “Злая зорка”, гадзіна-рэквіем “Чарнобыль. Боль. Жыццё.” (Стаўбцоўскі раён) і інш..

Працягвалі сваю творчую дзейнасць **аматарскія аб’яднанні** экалагічнай тэматыкі: літаратурна-экалагічны клуб “Фларыда” (Заастравецкая сельская бібліятэка Клецкага раёна); клуб экалагічнага напрамку “Жаўраначак” (Лагойскі раён); клубы “Крынічка”, “Аука”, “Росинка”, “Раслінка”, “Пчелка” (Мінскі раён); клуб аматараў-кветкаводаў “Лотас” (Свірская пасялковая бібліятэка Мядзельскі раён); клуб кветкаводаў “Флора”, клубы “Лесавічок”, “Родничок”, “Светлячок”, “Муравейник” (Салігорскі раён); студыя “Вернісаж”, “Мурашок”, “Фларыяна”, “Вясёлка”, “Рамонак”, “Кропелька” (Слуцкі раён); гурток па экалагічнаму выхаванню “Пралеска” (Старадарожскі раён); экалагічны клуб “Родничок”, экалагічны клуб “Дом под крышей голубой” (Уздзенскі раён) і інш..

**Сацыяльна неабароненыя катэгорыі насельніцтва**

У бібліятэках Міншчыны створаны базы дадзеных аб пражываючых у зонах абслугоўвання бібліятэк ветэранах вайны і працы, адзінокіх састарэлых, інвалідах і ўсіх тых, хто патрабуе сацыяльнай апекі і абароны. На працягу года ў бібліятэках традыцыйна праходзілі дні абслугоўваня на даму з дастаўкай бібліятэчных выданняў людзям пенсійнага ўзросту і інвалідам, якія па стане здароўя не могуць самастойна наведваць бібліятэку.

Абслугоўванне сацыяльна-неабароненых слаёў насельніцтва ў Капыльскім раёне праводзіцца ў рамках **мэтавай праграмы** бібліятэчнага абслугоўвання пажылых, састарэлых, адзінокіх людзей і інвалідаў “Вы не адны, пакуль мы з Вамі”. Працягвалася супрацоўніцтва паміж ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А.Астрэйскі” і Капыльскім тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, на базе якога працуюць аддзяленні дзённага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў. Вялася работа ў рамках праектаў “Кніжны свет”, сумесна с інвалідамі цэнтра і “Старонкі жыцця”, сумесна з ветэранамі ТЦСАН.

У 2019 годзе працягвалася работа Плешчаніцкай гарпасялковай бібліятэкі Лагойскага раёна па мэтавай праграме “Бібліятэка – за міласэрнасць”, мэта якой – аказанне падтрымкі і дапамогі сацыяльна неабароненым катэгорыям насельніцтва, бібліятэчнае абслугоўванне людзей з абмежаванымі магчымасцямі, далучэнне іх да кніг, улічваючы стан іх здароўя.

Бібліятэкі-філіялы ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка” працуюць у рамках мэтавай сацыяльнай праграмы “Душу исцелит добро”, Любанская раённая цэнтральная бібліятэка – у рамках сацыяльнай праграмы “Наполним милосердием сердца”.

Працягвалася работа па праекту “Жыццё патрабуе міласэрнасці” (сумесны праект бібліятэкі сямейнага чытання “Верасок” Маладзечанскага раёна, ДУ “Маладзечанскі раённы тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва” і ДУА “Цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі г. Маладзечна”). ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча” працягвае працу па праектах “Серебряная нить” (па рабоце з пажылымі людзьмі) і “З любоўю да Беларусі” (сумесны праект з ДУА “Маладзечанская санаторная школа-інтэрнат”).

У Мінскім раёне рэалізуецца мэтавая рэгіянальная праграма “Бібліятэка без межаў”. У рамках якой

арганізоўваюцца вечарыны, пасядзелкі, агеньчыкі, сустрэчы з прадстаўнікамі сацыяльных служб, медыцынскімі работнікамі, праходзяць урокі дабрыні, міласэрнасці і духоўнасці.

У Салігорскім раёне дзейнічае праект “Согреть своей заботой”. Мэта – забеспячэнне адкрытага доступу да інфармацыі для людзей сталага ўзросту і людзей з абмежаваннямі ў жыццядзейнасці праз інфармацыйна-бібліятэчнае абслугоўванне і вольнага часу, інтэграцыя іх у актыўнае жыццё грамадства.

Бібліятэкі Слуцкага раёна ў 2019 годзе вялі змястоўную працу з сацыяльна ўразлівымі групамі насельніцтва ў рамках сацыяльнай праграмы “Вера. Надзея. Любоў”. Асноўныя адрасаты праграмы: адзінокія, састарэлыя, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, пенсіянеры, мнагадзетныя сем’і; інваліды рознага ўзросту. Мэта праграмы – стварэнне безбар’ернага бібліятэчнага асяроддзя для даных катэгорый грамадзян. Галоўныя напрамкі праграмы накіраваныя на задавальненне індывідуальных інтарэсаў дадзенай катэгорыі карыстальнікаў, змястоўную арганізацыю вольнага часу, магчымасць самарэалізацыі і пошуку новай сацыяльнай ролі. Работа па праграме плануецца і вядзецца сумесна з грамадскімі арганізацыямі і дзяржаўнымі ўстановамі горада і раёна: ДУ “Слуцкі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва”, Слуцкім адзяленнем ГА “Дзеці ў бядзе”, Цэнтрам карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі дзяцей і падлеткаў.

Усе мерапрыемствы ў Старадарожскім раёне праводзяцца ў рамках раённай праграмы “Праз кнігу да міласэрнасці”. Пашыраецца дабрачынная і гуманітарная дзейнасць бібліятэк: арганізоўваюцца дні добрых паслуг, акцыі міласэрнасці, рэйд міласэрнасці.

Супрацоўнікамі бібліятэкі сямейнага чытання г. Жодзіна быў распрацаваны і рэалізаваны доўгатэрміновы праект “Мобильная библиотека”. У рамках гэтага праекта бібліятэкары наведвалі дома пенсіянераў і інвалідаў сумесна з

сацыяльнымі работнікамі, папярэдне патэлефанаваўшы і ўдакладніўшы, якія кнігі яны хочуць чытаць.

**Да Міжнароднага дня пажылых людзей** у ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка” прайшоў вечар “Душою молодые, сердцем золотые”. На мерапрыемства былі запрошаны ўдзельнікі клуба “Міласэрнасць”. Госці пачулі шмат пажаданняў у свой адрас ад вядучых мерапрыемства, атрымалі зарад бадзерасці і станоўчых эмоцый. Святочны настрой задавалі баяніст і салісты, якія з’яўляюццв актыўнымі чытачамі бібліятэкі.

Да Міжнароднага дня пажылых людзей ладзіліся і іншыя мерапрыемствы: літаратурны вечар “Мои года – моё богатство”, восеньскія вячоркі “И на жизнь свою оглянусь…”, дзень ушанавання сталасці “Капелькой тепла согреем душу…” (Барысаўскі раён); акцыя-віншаванне “Калі мы разам, бяда адступае”, конкурс успамінаў людзей сталага ўзросту “Адзін дзень з пражытага жыцця” (Бярэзінскі раён); вечар-успамін “Душы маёй чароўны свет”, гадзіна карысных парад “Гаючая сіла прыроды”, круглы стол “Дзякую сваім гадам” (Валожынскі раён); свята-ушанаванне “Осень – в золото листьев одета, осень – в золоте прожитых лет!”, акцыя-віншаванне “Как молоды мы были”, гадзіна добрага настрою “Калі старасць у радасць” (Вілейскі раён); вечарына ўдзячнасці “Молодость сердца не скроешь годами”, сустрэча-віншаванне “Славім ўзрост залаты”, вечар адпачынку “Советы от моих дедушек и бабушек” (Дзяржынскі раён); свята мудрасці і духоўнай маладосці “Люди пожилые, сердцем молодые”, вечар адпачынку “Серебро седин” (Лагойскі раён); школа камп’ютарных ведаў “Пенсіянер за камп’ютарам”, гадзіна знаёмства “И года – не беда, если есть любимое дело” (Любанскі раён); свята “Матчына хата, заўсёды багата”, вечар шчырасці “Узрост мудрасці, цяпла і дабрыні” (Маладзечканкі раён); вечар-пасядзелкі “Цудоўны шлях гадоў пражытых”, літаратурная гасцёўня “Для пожилого человека – всегда важна библиотека” (Мінскі раён); літаратурна-музычная гасцёўня “Асенняга лісця і вершаў букет” (Мядзельскі раён); сустрэча

“Нам обоим к лицу седина…”, інфармацыйна-пазнавальная праграма “Узрост – жыццю не перашкода”, сустрэча за самаварам “Днём мудрасці завем мы гэты дзень” (Пухавіцкі раён); акцыя “С уверенностью в завтрашний день”, бібліякафэ “Вечные ценности”, тэматычны вечар “Возраст мудрости, тепла и доброты” (Салігорскі раён); вечар адпачынку “Мае гады – маё багацце…” (Стаўбцоўскі раён).

Штогод 3 снежня ва ўсім свеце адзначаецца **Дзень інвалідаў**. Напярэдадні Дня інвалідаў у канферэнц-зале ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка” прайшоў круглы стол “Добрым словом друг друга согрейте”. Бібліятэкары пастараліся стварыць ўтульную атмасферу, за кубкам чаю пагаварылі аб тым, што хвалюе, з якімі праблемамі часта сутыкаюцца людзі з абмежаванымі магчымасцямі.На мерапремства былі запрошаны старшыня аддзела таварыства Чырвонага крыжа А.В. Трацэўская, спецыяліст ДУ “Валожынскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва” А.А. Рай. Для прысутных была падрыхтавана кніжная выстава “Дабрыня зблiжае сэрцы”, дзе яны пазнаёміліся з кнігамі аб лекавых раслінах, гаючых травах.

З 1 лістапада па 15 снежня 2019 года бібліятэкі Вілейскага раёна прынялі ўдзел у раённым дабрачынным марафоне “Делай великое, не ожидая великого”. Мэта марафону – аказанне дапамогі і падтрымкі людзям з абмежаванымі магчымасцямі. У чытальнай зале ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя. Г. Новік” у рамках марафону прайшоў сацыяльны форум “Праз занятасць – да годнага жыцця”. Праграма форуму складалася з двух блокаў: “Самазанятасць людзей з інваліднасцю” і “Грамадскія аб'яднанні і іх вопыт работы па працаўладкаванню людзей з інваліднасцю”. Мерапрыемства сабрала многіх людзей з абмежаванымі магчымасцямі, кіраўнікоў і прадстаўнікоў зацікаўленых службаў. Адкрываючы сустрэчу, дырэктар ДУ “Вілейскі ТЦСАН” Людміла Сляпцова адзначыла важнасць пытання сацыялізацыі, інтэграцыі інвалідаў у грамадства, якому ў нашай дзяржаве надаецца вялікая ўвага. “Хто, калі не

мы” – так называўся матывацыйны ролік пра людзей з інваліднасцю, якія змаглі стаць паспяховымі. Намеснік начальніка інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Вілейскім раёне Марыя Яхімовіч распавяла аб самазанятасці як аб варыянце вырашэння пытання працаўладкавання. Казалі аб рамеснай дзейнасці, аграэкатурызме, відах дзейнасці, якімі можна займацца, не будучы прадпрымальнікам, і ільготах пры выплаце адзінага падатку. Начальнік аддзела занятасці ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Вілейскага райвыканкама Таццяна Цітуленка спынілася таксама на вельмі важным пытанні – субсідыях на адкрыццё ўласнай справы. Для прысутных была падрыхтавана і пісьмовая інфармацыя па многіх пытаннях. Не менш цікавым атрымаўся другі блок форуму. Прысутныя прагледзелі відэафільмы аб працы сацыяльных прадпрыемстваў для людзей з інваліднасцю – УП “Дорога в жизнь” (г. Столін), “Бараньские арабески” (г. Барань) і польскага грамадскага аб'яднання “Радость без границ” (г. Острув Велькупольскі). Кожны з удзельнікаў форуму меў магчымасць выказацца, падзяліцца ўражаннямі. Гучалі словы ўдзячнасці ў адрас зацікаўленых службаў, якія шмат робяць для сацыялізацыі і працаўладкавання людзей з інваліднасцю.

Актыўна працавалі з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі здароўя бібліятэкары вобласці. Для дадзенай катэгорыі карыстальнікаў праведзены: акцыя міласэрнасці “Мир для всех”, гутарка “Смотри на меня как, на равного себе”, гадзіна зносін “С добром в сердце” (Барысаўскі раён); акцыя “Не бывае чужой бяды” (Бярэзінскі раён); сустрэча з мед. работнікам “Пра тое, што нас хвалюе” інфармацыйнае рэвю “Па старонках часопіса “Народны доктар”, урок міласэрнасці “Любоў і дабрыня вяртуюць свет” (Валожынскі раён); ўрок дабрыні “Чужога гора не бывае”, дыялог-разважанне “Приятное общение – вот главное умение” (Дзяржынскі раён); вечар-прысвячэнне “Наше наследие” (Капыльскі раён); вечар-сустрэча “Наперакор лёсу”, гадзіна добразычлівасці “Калі чужы боль становіцца тваім” (Лагойскі

раён); дабрачынная акцыя “Кропелькай цяпла сагрэем душу”, гутарка “Турботы, якія нас хвалююць” (Мінскі раён); сэанс бібліятэрапіі “Цікавая кніга – лепшы дасуг” (Пухавіцкі раён); дзень добрых паслуг “Знай, я рядом!”, выстава творчых работ чытачоў з абмежаванымі магчымасцямі “Ищи в себе радость”, гадзіна шчырасці “Міласэрнасць і ты” (Слуцкі раён); урок душавыратавальных думак “Духовный цветник”, відэа-прэзентацыя “Измени жизнь – ищи радость” (г. Жодзіна).

**Для інвалідаў па зроку** ў рамках месячніка “Человек с белой тростью” ў ДУК “Крупская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы” быў праведзены круглы стол «Мир глазами души», прысвечаны 55-годдзю ГА “БелТІЗ” на якім прысутнічалі ўсе зацікаўленыя прадстаўнікі арганізацый горада. Да мерапрыемства была падрыхтавана персанальная выстава мастацкіх вырабаў Г.А.Сініцынай “Рук прекрасное творенье” і аформлена выстава аўдыёкніг “Я вижу сердцем”.

У рамках акцыі гарадской спецыялізаванай бібліятэкай г. Маладзечна для людзей з парушэннем зроку і аддзелам рэабілітацыі УП “Энва” ГА “БелТІЗ” была праведзена конкурсная праграма “Восеньскі калейдаскоп”. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел інваліды па зроку, па агульных захворваннях, а таксама іншыя працаўнікі прадпрыемства. Праграма ўключала наступныя конкурсы: прасторавае арыентаванне з трасцінёй, тактыльнае распазнаванне прадуктаў харчавання, чытанне тэксту па Брайлю на хуткасць, настольныя гульні, навыкі карыстання камп’ютарам і смартфонам, конкурсы вакалістаў і “Угадай мелодыю”. Была арганізавана выстава карцін і дэкаратыўна-прыкладных работ супрацоўнікаў УП “Энва” ГА “БелТІЗ”. Для жадаючых прайшоў майстар-клас па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве.

Для невідушчых і слабавідушчых людзей у бібліятэках былі праведзены мерапрыемствы: вечар-сустрэча ў коле сяброў “Смотреть на мир особыми глазами”, гутарка-абмеркаванне “Книга и ты: удивления, переживания, открытия” (Барысаўскі раён); гадзіна рэабілітацыі “Незрячий в обществе: социальные

контакты” (спецыялізаваная бібліятэка філіал №27 Слуцкі раён).

27 сакавіка на абанеменце ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя. І. Х. Каладзеева” адбылося пашыранае пасяджэнне клуба “Золотой возраст”. Літаратурна-музычная кампазіцыя “Как здорово, что все мы здесь сегодня собрались” была прымеркавана да 15-гадовага юбілею клуба. У ходзе мерапрыемства супрацоўнікі абанемента Людміла Ракіцкая і Алена Шалайка нагадалі дамам аб тым, як 15 гадоў таму пры абанеменце цэнтральнай бібліятэкі пачаў сваю дзейнасць клуб “Золотой возраст”, а таксама распавялі ўдзельніцам клуба аб асноўных этапах гісторыі развіцця Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя. І.Х. Каладзеева, якая ў 2019 годзе з'яўлялась юбілярам і адзначала сваё стагоддзе.

У бібліятэках Міншчыны працягвалі сваю працу: клубы “Золотой возраст”, “Славянка”, “Вдохновение”, “Собеседник”, “Милосердие”, “БриЗ”, “Надежда”, “Субботея”, “Сельчанка”, “Радзімічы” (Барысаўскі раён); клуб “Міласэрнасць” (Валожынскі раён); клуб “Святліца” (Дзяржынскі раён); клуб для пенсіянераў “Добрыя сустрэчы” (Капыльскі раён); клуб “Те, кто молоды душой” (Клецкі раён); клубы “Крынічка”, “Хрызантэма”, “Были-небылицы” (Крупскі раён); клуб “Ностальгия”, аматарскае аб’яднанне “Добрыя сустрэчы”, клуб “Чытаем разам” (Любанскі раён); клубы “Дабрадзея”, “Ля самавара”, “Русь”, “Бяседа”, “Лада”, жаночы клуб “Гаспадынька” (Мінскі раён); клуб “Задушэўная размова”, клуб для пажылых людзей “Завалінка” клуба для пажылых “Надзея” (Мядзельскі раён); клубныя аб’яднанні “Чысты чацвер” і “Клуб цікавых сустрэч” (Пухавіцкі раён): клубы для людзей сталага ўзроста “Собеседник”, “Ветеран”, “Землякі”, “Залаты ўзрост”, “Молодушки”, “Доброта”, “Сяброўка” (Салігорскі раён); клуб для людзей сталага ўзросту “Дабрыня” (Слуцкі раён); жаночы клуб “Сударушка”, клуб для людзей са слабым зрокам “Вдохновение” (Смалявіцкі раён); клубы “Пасядзелкі”, “Залатая восень”, “Субяседніца”, “Суседкі”

(Старадарожскі раён); клуб “Залаты ўзрост” (Уздзенскі раён); клуб “Журавінка”, клуб “Вясёлыя бабулі” (Чэрвеньскі раён); клубы “Собеседник”, “Ключ к здоровью”, “Восхождение”, “Гармония”, “Золотая осень” (г.Жодзіна).

**Здаровы лад жыцця**

У рамках **праекта** “Борисов – в стиле “вело” ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя. І. Х. Каладзеева” сумесна з ініцыятыўнай групай вела-клуба “Вела Барысаў” 20 красавіка правялі адкрыццё веласезона ў г. Барысаве. Больш за 30 барысаўчан прынялі ўдзел у велаквесце “10 мгновений весны”.

У рамках прафілактычнага раённага праекта “Беразіно – здаровы горад” (2019-2020 гг.) было рэалізавана правядзенне акцый і дзён здароўя ў Бярэзінскім раёне.

Мерапрыемствы па фарміраванні здаровага ладу жыцця і непрыязнасці да шкодных звычак праводзіліся ў Крупскім раёне ў рамках праекта “Да здароўя праз кнігу”. Сярод работнікаў бібліятэк было праведзена анкетаванне “За здаровы вобраз жыцця”, выдадзены шэраг лістовак-закладак,памятак для бацькоў: “Асцярожна: СПАЙС”, “Залежнасць ад алкаголю і наркотыкаў у падлеткаў”, “У будучыню без рызыкі”, “Брось курить” і інш.

У 2019 годзе бібліятэкі сеткі публічных бібліятэк Лагойскага раёна працягвалі працаваць у рамках раённай мэтавай праграмы “Мы – за здаровую будучыню” (2018-2020 гг.). Дадзеная праграма – гэта правядзенне комплексу мерапрыемстваў, якія актыўна прапагандуюць здаровы лад жыцця, садзейнічаюць прафілактыцы шкодных звычак сярод насельніцтва. Праграма прызвана сфарміраваць устойлівую цікавасць да здаровага ладу жыцця, адрадзіць прэстыж маральных ідэалаў і каштоўнасцяў, якія дапамогуць у далейшым рэалізаваць сябе як паўнавартасную здаровую асобу.

Дзеля прапаганды здаровага ладу жыцця публічныя бібліятэкі Любанскага раёна працавалі ў рамках комплекснай бібліятэчнай праграмы “З кнігай і здароўем па жыцці”.

Вось ужо тры гады ў горадзе Заслаўе ажыццяўляецца праект “Горад Заслаўе – здаровы горад”. У Заслаўскай гарадской бібліятэцы Мінскага раёна экспанавалася выстава з аднаіменнай назвай праекта, дзе, акрамя літаратуры, можна было пазнаёміцца з Комплексным планам мерапрыемстваў па рэалізацыі праекта. На тэрыторыі Заслаўя дзейнічае тэрэнкур “Тропа здоровья”. Сцежка пачынаецца ў Дзіцячым скверы, праходзіць па маляўнічых месцах горада ўздоўж вадаёмаў, культурна-гістарычных помнікаў, у месцах, далёкіх ад аўтамабільнага шуму і гарадской мітусні. Сцежка здароўя ўключае ў сябе два маршруты “просты” і “складаны” з уздымам і спускам. Супрацоўнікі бібліятэкі актыўна папулярызавалі сярод сваіх карыстальнікаў гэты маршрут.

У справаздачным годзе бібліятэкі Салігорскага раёна мэтанакіравана праводзілі асветніцкую працу па папулярызацыі здаровага ладу жыцця ў рамках праектаў “Город Солигорск – здоровый город”, “Стиль жизни – здоровье”. “Стиль жизни – здоровье” – праект па прафілактычнй работы і папулярызацыі здаровага ладу жыцця сярод насельніцтва, выхаванне ў карыстальнікаў пазітыўнага стаўлення да жыцця і здароўю.

У 2019 годзе бібліятэкі Слуцкага раёна працягнулі працу ў рамках інфармацыйна-асветніцкай праграмы “За здаровы лад жыцця”. Дадзеная праграма складаецца з пяці падпраграм: “Інфарм-кур’ер”, “Люстэрка”, “Выратаванне”, “Сямейны лабірынт”, “Бібліятэрапія”, якія фарміруюць комплекс мерапрыемстваў па фарміраванні здаровага ладу жыцця, маральнаму выхаванню асобы, сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі моладзі і падлеткаў, прафілактыцы шкодных звычак, псіхалагічнаму і духоўнаму камфорту сям’і, пераадоленні крызісных сітуацый з дапамогай кнігі і чытання.

Для чытачоў Завішынскай сельскай бібліятэкі Лагойскага раёна было арганізавана **свята здароўя** “В здоровом теле здоровый дух”, мэта якога – фарміраванне ў насельніцтва патрэбы ў здаровым ладзе жыцця, развіццё цікавасці да фізічнай культуры і спорту. Бібліятэкар

прадставіла кніжную выставу "Займись спортом! Стань ярче!", дзе былі прадстаўлены кнігі па медыцыне і спорце. Якія сакрэты трэба ведаць, каб заставацца здаровым? Як звычкі ўплываюць на наша здароўе, характар? Як выпрацаваць у сябе карысныя звычкі і пазбавіцца ад шкодных? У ходзе гутаркі і ўдзелу ў гульнявых конкурсах і віктарынах прысутныя атрымалі адказы на гэтыя пытанні. Замацавалі атрыманыя веды відэаролікі "Шкодныя звычкі" і "Мы выбіраем спорт!". Усе ўдзельнікі і балельшчыкі атрымалі зарад бадзёрасці і добрага настрою.

У рамках раённага праекта "Здаровае пакаленне XXI стагоддзя" ў Нарацкай пасялковай бібліятэцы Мядзельскага раёна для дзяцей была праведзена квэст-гульня "Спорт любіць – здаровым быць". У мерапрыемстве прымалі ўдзел вучні 3-4 класаў са школьнага лагера "Вясёлка". На спаборніцкіх этапах школьнікам давялося праявіць творчасць, кемлівасць, знаходлівасць. Удзельнікі квэст-гульні адказвалі на пытанні віктарыны "Вучыцеся быць здаровымі". Напрыканцы мерапрыемства пераможцы былі ўзнагароджаны прызамі. Бібліятэкары правялі валанцёрскую акцыю "Моладзь за здаровы лад жыцця". Падлеткі раздавалі плакаты і лістоўкі, прапагандуючы здаровы лад жыцця сярод маладога пакалення ў Нарацкай сярэдняй школе №2.

8 лютага бібліятэкары ДУК "Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўлюка Пранузы" правялі дыскусійныя арэлі "Глоток беды", якія былі падрыхтаваныя з мэтай прафілактыкі шкодных звычак у падлеткаў: алкаголю, наркаманіі, курэння і прапаганды здаровага ладу жыцця. Сутнасць гэтай займальнай формы складаецца ў імітацыі разгойдвання арэляў. У дадзеным выпадку ў дыскусію ўступілі дзве групы навучэнцаў, якія размясціліся адзін супраць аднаго. Пасля таго, як прапанаваны пытанні для абмеркавання, яны па чарзе ад кожнай групы выказваюць свае меркаванні –"арэлі" пачынаюць свой рух. Вучні 10 класа ДУА "Сярэдняя школа №3 г. Нясвіж" адказвалі на пытанні, абмяркоўвалі сітуацыі,

падмацоўваючы расказанае прыкладамі з жыцця, а таксама разважалі як весці здаровы лад жыцця.

У Смілавіцкай гарпасялковай бібліятэцы Чэрвеньскага раёна актыўна праводзіцца прапаганда здаровага ладу жыцця. На гістарычным экскурсе “Сколько лет жить человеку” прысутнічалі людзі сталага ўзросту і моладзь.

На працягу года ў бібліятэках для розных катэгорый карыстальнікаў праведзена мноства мерапрыемстваў па папулярызацыі здаровага ладу жыцця: спартыўнае свята “Радуга дружбы”, сустрэча з інструктарам па ёзе “Слагаемые здоровья” (Барысаўскі раён); гадзіна карысных парад “Усё для здароўя – здароўе для вас”, урок здароўя “Крочу са здароўем блізка”, прэзентацыя кніг “Жыві сапраўдным – думай пра будучыню” (Бярэзінскі раён); спор-час “Кніга, кампьютар, чалавек” (Валожынскі раён); валеалагічнае свята “Экспресс здоровья “Долой курение!”, бібліятэчны форум “Опасные привычки! Умей сказать “Нет!” (Капыльскі раён); інфармацыйны дыялог з праглядам відэафільма “Будзь здаровым, моцным, адважным”, флэш-моб “Здароўе – мудрых ганарар” (Клецкі раён); урок-папярэджанне “Падумай пра здароўе цяпер”, вусны часопіс “Усім, хто хоча быць здаровым”, квэст-гульня “Падарожжа па горадзе “Здароўе” (Маладзечанскі раён); кактэйль здароўя “Тварам да здароўя”, гадзіна карысных парад “Активность – путь к долголетию”, гадзіна здароўя “Движение вместо лекарств” (Мінскі раён); слайд-часопіс “Даўгалецце ў добрым здароўі”, конкурс карысных парад сярод маладых сем’яў “Здароўя шмат не бывае” (Пухавіцкі раён); гастранамічны лофт “PRO-питание”, актуальная размова “Быть здоровым, жить активно – это стильно, позитивно”, ярмарка карыснай інфармацыі “Быть здоровым – это модно!”, дыялог з чытачом “Мы выбираем здоровую нацию” (Слуцкі раён); акцыя-папярэджанне “Інтэрнэт – сябар, Інтэрнэт – вораг”, заняткі па правілах бяспечнага падарожжа па інтэрнэту “Інтэрнэт: каму паскардзіцца”, інтэрнэт-практыкум “Правілы бяспекі ў сеціве” (Уздзенскі раён).

У Міжнародны дзень **адмовы ад курэння** ДУК "Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка" правяла акцыю "Спорт і тытунь не сумяшчальныя" на базе фізкультурна-аздараўленчага цэнтра "Лазурный". Супрацоўнікі бібліятэкі расказалі наведвальнікам, якія шкодныя і канцэрагенныя рэчывы ўваходзяць у склад цыгарэты, як курэнне адбіваецца на здароўі чалавека і прапанавалі буклеты "Курэнне наносіць непапраўную шкоду арганізму чалавека".

У Пяршайскай сельскай бібліятэцы Валожынскага раёна для наведвальнікаў была праведзена інфармацыйная гадзіна "Цыгарэты наш вораг" Да ўвагі ўдзельнікаў была прадстаўлена выстава-перасцярога. У ходзе гутаркі бібліятэкар расказала пра гісторыю ўзнікнення тытуню, прыкладах пашкоджання органаў чалавека.

Курыць або не курыць? На гэтае пытанне многія адказваюць сцвярджальна, не задумваючыся аб наступствах прынятага рашэння. І для таго, каб ўзважыць усе "за" і "супраць", у Фаніпальскай гарадской бібліятэцы Дзяржынскана раёна сярод моладзі прайшла бібліятэчная пастаноўка "Слушается дело о сигарете": суд заснаваны на пытаннях, якія часцей за ўсё ўзнікаюць, калі гаворка заходзіць пра шкоду курэння. Маладыя людзі атрымалі кожны сваю ролю: падсудная – цыгарэта, абаронца, абвініцель, сведкі, судовыя засядацелі. Загадчыца бібліятэкі – старшыня суда – цікавымі каментарыямі ўмела кіравала ходам судовага прадстаўлення-паседжання. У ходзе мерапрыемства таксама адбылася акцыя "Памяняй цыгарэту на цукерку".

Па **прафілактыцы тытунекурэння** ў бібліятэках прайшлі наступныя мерапрыемствы: інфарміна "Дыши свободно!", гадзіна здароўя "Жизнь без сигарет" (Барысаўскі раён); акцыя "Дыскатэка без тытунёвага дыму", інфармацыйная гадзіна "Кінь курыць – дыхай свабодна" (Бярэзінскі раён); гадзіна шчырай размовы "Смерть из табакерки" (Валожынскі раён); мультымедыйны ўрок "Табачный туман обмана", калейдаскоп трывожных фактараў "Курэнне, якое адбірае жыццё" (Дзяржынскі раён); дзень

інфармацыі “Курыць – сабе шкодзіць”, сустрэча з медработнікам “Цыгарэта – гэта яд, ён небяспечны для рабят” (Клецкі раён); актуальны дыялог “Курыць – здароўю шкодіць”, інфармацыйная гадзіна “Никотин – медленное самоубийство”, гутарка-заклік “Хочаш жыць – кідай курыць” (Лагойскі раён); актуальная гутарка “Жыццё без тытуню”, гадзіна развагі “Жыццё без дрэнных звычак”, конкурс малюнкаў “Скажем сигаретам НЕТ!” (Любанскі раён); відэалекторый “Тытунь – здароўю вораг”, тэматычны прагляд літаратуры “Вредным привычкам – книжный заслон !”, фізкульт-прапанова “Они не курят! А ты?” (Мінскі раён); тэматычная віктарына “Если долго хочешь жить – сигареты брось курить”, пазнавальная гадзіна “Зрабі свой выбар – не курыць” (Мядзельскі раён); бібліятэчная трыбуна “Тытунь – забойца: пад прыцэлам мужчыны”, гутарка-дыялог “Курэнне або здароўе – усё ў вашых руках”, відэалекторый “У абдымках тытунёвага дурману” (Пухавіцкі раён); брэйн рынг “Здоровой жизни аромат не променяй на горький яд”, бібліятэчны флэшмоб “Знать, чтобы жить” (Салігорскі раён); час інфармацыі “Сигарета – это яд для больших и маленьких”, гадзіна-паведамленне “Курить в XXI веке не модно” (Старадарожскі раён).

**У рамках Сусветнага дня барацьбы са СНІДам** у Івянецкай гарпасялковай бібліятэцы Валожынскага раёна была праведзена інфарміна “СНІД. Кошт адной памылкі”. Падчас мерапрыемства бібліятэкар распавяла пра гісторыю праблемы, шляхі заражэння і метадах яго ранняга выяўлення.

На гадзіне-папярэджанні “СПИД и ВИЧ – мышеловка. Не попадись!”, якая прайшла ў Астрошыцкай сельскай бібліятэкі Лагойскага раёна, хлопцы і дзяўчаты даведаліся пра гісторыю хваробы, пра тое, як пазбегнуць заражэння ВІЧ-інфекцыяй, чым адрозніваецца ВІЧ ад СНІДу, ці ёсць лекі ад ВІЧ і СНІДу, а таксама пра тое, што кожны чалавек нясе асабістую адказнасць за абарону ад заражэння як самога сябе, так і іншых. Увазе прысутных была прапанавана выстава літаратуры “Бязлітасны дыягназ – СНІД”. У канцы

мерапрыемства бібліятэкар пажадала прысутным весці здаровы лад жыцця

У рамках Сусветнага дня барацьбы са СНІДам у ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча” прайшла прафілактычная інфарм-гадзіна “Жыццё без ВІЧ – твой выбар!”. На мерапрыемства была запрошана доктар-эпідэміёлаг ДУ “Маладзечанскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі” Працкова Маргарыта Аляксандраўна, якая расказала пра ВІЧ-інфекцыю, СНІД, пра тое, як ВІЧ пераходзіць у стадыю СНІД, як можна выявіць ВІЧ, якім чынам адбываецца заражэнне гэтым вірусам, аб значнасці правядзення прафілактычных мер, агучыла статыстыку і дынаміку захворвання СНІДам у Беларусі і Маладзечанскім раёне, акрэсліла магчымасць прайсці бясплатнае ананімнае тэставанне на ВІЧ. Былі прадэманстраваны ролікі пра СНІД. Напрыканцы мерапрыемства ўсім удзельнікам сустрэчы было прапанавана прайсці экспрэс-тэст на ВІЧ. На мерапрыемстве была прадстаўлена выстава літаратуры пра СНІД “Мы выбіраем жыццё”.

Інфармацыйнае паведамленне “ВІЧ: міфы і рэальнасць”, якое падрыхтавала бібліятэкар спецыялізаванай бібліятэкі філіал №27 Слуцкага раёна дало магчымасць кожнаму ўдзельніку агучыць свае погляды на праблему СНІДу і выказаць сваё стаўленне да ВІЧ-інфіцыраваных. Цікавасць прысутных выклікала гульня-практыкаванне “Каляровыя палоскі”, арганізаваная з мэтай выхавання талерантнага стаўлення да ВІЧ-інфіцыраваных.

Таксама ў бібліятэках прайшлі: ток-шоў “СПИД – проблема, касающаяся каждого”, урок здароўя “СПИД – проблемы и надежды”, гутарка-дыялог “ВИЧ – инфекция и ее профилактика” (Барысаўскі раён); інфармацыйны ўрок “Мы супраць СНІДу!” (Вілейскі раён); круглы стол “Пусть всегда будет завтра”, адкрыты дыялог “Остановись у последней черты” (Дзяржынскі раён); гадзіна разважанняў “Крок у бездну”, тэматычныя праграмы “Пожизненный плен. Живите без ВИЧ”, гутарка-прэзентацыя “Это не должно случиться с

тобой” (Клецкі раён); акцыя-пратэст “Моладзь супраць СНІДу”, актуальны дыялог “СНІД – прагноз сумны”, выхаваўчая гадзіна “ВИЧ не передаётся через дружбу. Оставайтесь людьми” (Любанскі раён); міні-акцыя “АнтиСПИД!”, прэзентацыя “СПИД – не клеймо, больной – не изгой”, гадзіна здароўя “СНІД – ведаць, каб змагацца” (Мінскі раён); гутарка “СНІД – глабальная праблема чалавецтва”, тэматычная гадзіна “Мішэнь СНІДу – моладзь” (Пухавіцкі раён); інтэрактыўная пляцоўка “Вместе против СПИДа”, круглы стол “СПИД – не вина, а беда”, мультымедыйная прэзентацыя “Этот опасный вирус”, пазнавальная гадзіна-трэніг “Твоё здоровье и ВИЧ/СПИД инфекция” (Старадарожскі раён); маніторынг “Страшная статистика”, школа здароўя “Знание против страха перед СПИДом”, інфармвідэа “Всемирный день борьбы со СПИДом” (г.Жодзіна) і інш.

Урок-перасцярога “Наркотики: от отчаяния к надежде” паспрабаваў данесці да прысутных, што прыхільнасць **да наркотыкаў** можа разбурыць жыццё чалавека. Бібліятэкар Негарэльскай сельскай бібліятэкі Дзяржынскага раёна распавяла пра тое, што больш за ўсё схільныя хуткаму прывыкання да наркотыкаў маладыя людзі з рысамі псіхічнай няспеласці, з няўстойлівым характарам, чаму людзі пачынаюць ужываць наркотыкі, пра шляхі ўключэння ў наркаманію, у чым заключаюцца наступствы наркотыкаў, спосабы абароны ад уцягвання ў наркаманію.

Актуальны дыялог “Шлях да бяды – наркотыкі” быў праведзены для моладзі ў Лагойскай цэнтральнай раённай бібліятэцы. Увазе прысутных была прадстаўлена слайд-прэзентацыя “Ад при жизни” пра ўплыў наркотыкаў на арганізм чалавека, з прыкладамі і тлумачэннямі, з жудаснымі выявамі маладых людзей, якія пакутуюць наркаманіяй. Прыведзеныя ў гутарцы статыстычныя дадзеныя аб смяротнасці сярод наркаманаў аказалі моцнае псіхалагічнае і эмацыйнае ўздзеянне на ўдзельнікаў мерапрыемства. Затым госці атрымалі буклеты “Опасно: наркотики”, падрыхтаваныя аддзелам бібліятэчнага маркетынгу. Такія сустрэчы спрыяюць

прыцягненню ўвагі да актуальнай тэмы і фарміраванню негатыўнага стаўлення да наркотыкаў, дазваляюць выявіць пункт гледжання моладзі па дадзенай праблеме.

У Пузыроўской сельскай бібліятэцы-доме вольнага часу Мядзельскага раёна была праведзена размова-перасцярога "Наркаманія – хвароба душы". Бібліятэкар расказала аб згубным уплыве пастаяннага ўжывання наркотыкаў на здароўе і псіхіку дзяцей і падлеткаў, аб смяротным выніку пры ўжыванні наркатычных сродкаў. Напрыканцы мерапрыемства прысутныя паўдзельнічалі ў віктарыне, адказалі на пытанні бібліятэкара.

У справаздачным годзе ў бібліятэках вобласці па прафілактыцы наркаманіі праведзены: семінар па супрацьдзеянні алкагольнай і наркатычнай залежнасці "Зависимость и созависимость – взгляд изнутри", гадзіна праблемнай размовы "Наркотик: будь осторожен!", гутарка-заклік "SOS. Не обманывайся!", гутарка "Не сломай свою судьбу" (Барысаўскі раён); бліц-тур "Наркотык абыходзь стараной, каб не здарылася бяды ліхой", акцыя "Знак бяды – наркотык" гадзіна разважання "Наркаманія – мінус здароўе" (Бярэзінскі раён); гадзіна-перасцярога "Наркаманія – знак бяды" (Валожынскі раён); факт-урок "Міфы пра наркотыкі", кіналекторый "Пад грыфам "смяротна" (Вілейскі раён); адкрыты дыялог "Мы хочам жыць" (Капыльскі раён); прафілактычная інфармацыйна-адукацыйная акцыя "Мы за жыццё без наркотыкаў!", гутарка-перасцярога "Небяспека, якую нясуць наркотыкі", рэкамендацыйная размова з супрацоўнікам амбулаторыі Д.І.Кудзеліч "Пагубное влияние ПАВ" (Мінскі раён); актуальны дыялог аб шкодзе спайсаў "Небяспечна – спайс!", відэаразмова "Падман душы – падман надзей", круглы стол "Гэта не павінна здарыцца з табой" (Пухавіцкі раён); дыялог-кансультацыя "Праўда і міфы пра наркотыкі", дыялогі аб здароў'і "Даётся жизнь один лишь раз" (Старадарожскі раён) і інш.

У справаздачным годзе актыўная праца ўстановамі вялася **па прафілактыцы алкагалізму і п'янства** сярод насельніцтва.

У Акцябрскай сельскай бібліятэцы Лагойскага раёна адбыўся дыспут "Праўда і хлусня пра алкаголь". Галоўнай тэмай сустрэчы стала абмеркаванне праблем прафілактыкі алкагалізма і папулярызацыі цвярозага ладу жыцця. Госці мерапрыемства прыйшлі да высновы, што, нават, бяскрыўднае піва прыносіць шкоду здароўю. Да дыспуту была падрыхтаваная выстава "Алкагалізм – праблема сацыяльная, эканамічная, экалагічная" і электронная прэзентацыя "Алкаголь – вораг здароўю".

На працягу года публічныя бібліятэкі вобласці вялі рэгулярную працу па прафілактыцы алкагалізму з дапамогай розных мерапрыемстваў прафілактычнага і папераджальнага характару, такіх як: гадзіна інфармацыі "Жизнь стоит того, чтобы жить!", інфармацыйная гадзіна "Горькая правда о пиве", слайд-гутарка "Сделай правильный выбор" (Барысаўскі раён); дзень прафілактыкі "Дзіцячыя слёзы ў чарцы спіртнога", акцыя "Залог здароўя – у цвярозасці" (Бярэзінскі раён); акцыя "Мы – за цвярозую Беларусь!" (Вілейскі раён); урок здароўя "Скажи алкоголю НЕТ" (Капыльскі раён); акцыі "Мы супраць алкаголю", гадзіна інфармацыі "Дзіцячыя слёзы ў чарцы спіртнога", гутарка-дыялог "Пагаворым пра шкоду алкаголю" (Клецкі раён); гадзіна развагі "Алкагалізм пачынаецца з піва" (Крупскі раён); прагляд відэароліка "Трезвый день календаря", гутарка "Алкоголь – опасная ловушка" (Мінскі раён); электронная відэапрэзентацыя "Алкогольная залежнасць", урок здароўя "Падлеткі і алкаголь" (Пухавіцкі раён); гадзін праблемнай інфармацыі "Алкоголизм: дурная привычка или болезнь", круглы стол "Алкаголь: асоба і здароўе", гутарка-перасцярога "Губит людей …пиво" (Стаўбцоўскі раён) і інш.

У рамках цыкла мерапрыемстваў "Время ярких побед" да **II Еўрапейскіх гульняў** у ДУК "Любанская раённая цэнтральная бібліятэка" дзейнічаў прэс-дайджэст "10 дзён, якія яднаюць Еўропу". Наведвальнікам бібліятэкі прапанавалася

разгадаць спартыўную віктарыну “20 пытанняў пра спорт ад Лёсіка”, за правільныя адказы наведвальнікі атрымлівалі салодкія прызы. Дзякуючы прэс-дайджэсту чытачы змаглі пазнаёміцца з адпаведнай літаратурай, прачытаць артыкулы з газет аб ІІ Еўрапейскіх гульнях-2019 г., пазнаёміцца з раскладам білетных сесій і відамі спорту, якія былі ўключаны ў гульні.

На інфармацыйнай гадзіне “Мінск – сталіца ІІ Еўрапейскіх гульняў” у Вішнёўскай інтэграванай сельскай бібліятэцы Мінскага раёна бібліятэкар пазнаёміла юных чытачоў з гісторыяй з’яўлення Еўрапейскіх гульняў, а таксама з гісторыяй брэнда і сімволікі, праграмай правядзення ІІ Еўрапейскіх гульняў, якія праходзілі у Мінску. Увазе дзяцей была прадстаўлена аднайменная выстава, дзе з кніг і часопісаў можна было даведацца аб розных відах спорту, знакамітых спартсменах.

Клянніцкая сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна для навучэнцаў 8-9 класаў правяла адзіны дзень інфармавання пад агульным дэвізам “Крок” – “Школа актыўнага грамадзяніна” па тэме “Беларусь спартыўная!”. У рамках мерапрыемства навучэнцы абмеркавалі пытанні здароўя людзей, якія віды спорту найбольш папулярныя ў нашай краіне, пытанні аб развіцці фізічнай культуры і спорту, якія з'яўляюцца прыярытэтнымі напрамкамі сацыяльнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь, аб значнасці Еўрапейскіх гульняў і чаму менавіта Мінск быў абраны для правядзення ІІ Еўрапейскіх гульняў

Бібліятэкары бібліятэк вобласці распавядалі сваім наведвальнікам аб дадзенай спартыўнай падзеі: інфармацыйная хвілінка “О спорт, ты – мир!”, інфарміна “Быстрее, выше, сильнее!” (Барысаўскі раён); выстава “К спорту” (Валожынскі раён); пазнавальная скарбонка “Еўрапейскія гульні – цікава, важна, прэстыжна”, квэст-гульня “К победе вместе с Лёсиком”, хвіліна інфармацыі “Еўрапейскія гульні” (Любанскі раён); інфармацыйная гадзіна “ІІ Европейские игры”, віктарына “Вселенная спорта” (Салігорскі раён); інфармацыйная

прастора “II Еўрапейскія гульні”, аздараўленчы майстар-клас “Стыль жыцця – спартыўны” (Слуцкі раён) і інш.

У Сейлавіцкай інтэграванай сельскай бібліятэцы Нясвіжскага раёна дзейнічае клуб “Крепыш” па фарміраванню здаровага ладу жыцця. Удзельнікі клуба – вучні 3-6 класаў ДУА “Сейлавіцкі НПК дзіцячы сад – сярэдняя школа”, а таксама дзеці з неблаганадзейных сем’яў.

Установка на здаровы лад жыцця, прафілактыка негатыўных з’яў – аснова дзейнасці аматарскіх аб’яднанняў для дзяцей і моладзі “Азбука здароўя” і “Оранжевый рай”, створаных пры Залужскай сельскай бібліятэцы-клубе Старадарожскага раёна.

У ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка” аддзелам абслугоўвання і інфармацыі створаны клуб для падлеткаў і моладзі “Молодёжный перекрёсток”. Яго мэта – прапаганда здаровага ладу жыцця.

З 2002 г. у ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна” працуе клуб “Ключ к здоровью”, на занятках якога выступаюць урачы, спецыялісты і людзі, якія вядуць здаровы лад жыцця. Бібліятэкары арганізуюць кніжныя выставы-прагляды, праводзяць агляды літаратуры. У Бібліятэцы сямейнага чытання праходзяць пасяджэнні клуба “Гармония”, у рамках якога арганізуюцца мерапрыемствы па здароваму ладу жыцця.

**Патрыятычнае выхаванне**

У 2019 годзе наша краіна адзначыла 75-годдзе вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна да дня 75-годдзя вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў арганізавала праект «Живёт Победа в поколениях» на 2019-2020гг.

Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі да Дня Перамогі арганізавала ў рамках сумеснага праекта з Дзіцячай школай мастацтва “Книга. Кисть. Карандаш” інтэрактыўна-патрыятычную выставу-панараму пад адкрытым небам “В книжной памяти мгновения войны”.

Актыўна вядзецца работа па патрыятычным выхаванні ў Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэцы. Быў распрацаваны бібліятэчны праект “Без прошлого нет будущего”, які накіраваны на фарміраванне ў падрастаючага пакалення высокай патрыятычнай свядомасці, пачуцця адказнасці, на аснове гістарычных каштоўнасцяў, звычаяў і традыцый сваёй радзімы.

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу Мядзельскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Максіма Танка ў справаздачным годзе распрацаваны праект па грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню падрастаючага пакалення “Память нужна нам молодым”. У рамках праекта ў бібліятэках раёна арганізавана і праведзена шмат мерапрыемстваў, найбольш значныя з іх: дзень салдацкай славы “Не гаснет памяти свеча”, вечар-успамін “Нам та весна Победу принесла” і інш.

Паспяхова працуе ў гэтым напрамку Нарацкая пасялковая бібліятэка. У рамках патрыятычнага праекта “З памяццю ў сэрцы” праходзяць сустрэчы з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, хатнія віншаванні, акцыі падзякі, выставы-прэзентацыі і іншыя мерапрыемствы.Незвычайна і цікава прайшла ў бібліятэцы патрыятычная квэст-гульня “Пусть люди помнят ваши имена”.

У 2019 годзе ў Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя П. Пранузы стартаваў праект “Пакаленне”. У рамках праекта арганізоўваюцца тэматычныя выставы, фотасушкі, праходзяць сустрэчы з воінамі-інтэрнацыяналістамі, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, малалетнімі вязнямі, жыхарамі блакаднага Ленінграда.

Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса арганізавала патрыятычна-асветніцкі праект “Выхоўваем патрыётаў разам”, які рэалізоўваўся на працягу года і ўзнік як

адказ на патрэбу грамадства данесці сучаснікам праўду аб вайне і ў памяць аб подзвігу на прыкладах герояў-землякоў.Праект быў прадстаўлены на абласны конкурс праектаў у сферы рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў намінацыі “Патрыятычнае выхаванне моладзі” і выйшаў у фінал. Была распрацавана і прапанавана чытачам на старонках раённай газеты “Чырвоная зорка” гісторыка-краязнаўчая віктарына “Праз вайну, праз памяць, праз лёсы”.

Ужо другі раз дзіцячы аддзел Барысаўскай цэнтральнай раеннай бібліятэкі імя А.Х. Каладзеева прыняў удзел у Міжнароднай акцыі, прысвечанай 74-й гадавіне Вялікай Перамогі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Акцыя была праведзена з навучэнцамі 4-х класаў ДУА "Гімназія № 3 г. Барысава", якія з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі краязнаўчага гуртка "Юныя знаўцы Барысава". Да акцыі хлопцы падрыхтавалі цікавыя паведамленні пра кнігі, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне, бібліятэкар-краязнаўца пазнаёміла дзяцей з такімі кнігамі пра вайну, як: С. Аляксееў "Волатаўская прозвішчы", А.А.Грабёнкін "Жывая боль", С.Аляксеева "Вялікія Перамогі", Б.Балтэра "Да пабачэння, хлопчыкі "і інш.

У сувязі з 75-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г.Новік актывізавала работу па патрыятычнаму выхаванню дзяцей і падлеткаў. Сярод мерапрыемстваў былі такія як акцыя “Чытаем дзецям пра вайну”, майстар-клас “Голуб міра”, слайд-знаёмства “Малыя героі Вялікай вайны”,прысвечанае 90-годдзю з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза Марата Казея.

Любанская раённая цэнтральная бібліятэка таксама актыўна працуе ў дадзеным напрамку. Так,на працягу года прымала ўдзел у акцыях: “Чыстыя чацвяргі каля помнікаў”, “Ветэран”, а таксама ў тыдні ваенна-патрыятычнай кнігі “Афганистан… Из памяти не вычеркнуть”.

“Сохраним память навсегда” – так называлася акцыя сельскай бібліятэкі в. Краснае Маладзечанскага раена. На

стэндзе, які быў устаноўлены каля бібліятэкі, наведвальнікі пісалі імёны і прозвішчы сваіх родных і блізкіх, якія загінулі на вайне, а таксама словы пажаданняў тым ветэранам, якія жывуць побач.

У Чэрвеньскай цэнтральнай раённай бібліятэцы да дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў праходзіла акцыя "Са святам Незалежнасці", падчас якой бібліятэкары наведалі ветэранаў на даму і прапанавалі літаратуру для чытання.

Літаратурная гульня "Подвиг бессмертен, память жива" была праведзена для вучняў старэйшых класаў у Мядзельскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Максіма Танка. Дзеці адказвалі на пытанні віктарыны пра піянераў-герояў, знаёміліся па энцыклапедычных кнігах з гістарычнымі этапамі Вялікай Айчыннай вайны, чыталі вершы беларускіх аўтараў пра вайну.

Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча падрыхтавала патрыятычна-конкурсную праграму "Песні франтавых дарог", якая была прысвечана 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Да дня абаронцы айчыны ў дзіцячай бібліятэцы г. Смалявічы прайшоў рад мерапрыемстваў, напраўленых на выхаванне патрыятычных пачуццяў падлеткаў. Напрыклад, гадзіны мужнасці "Во славу воинства", "Войны священные страницы навеки в памяти людской", гадзіна гісторыі "Об армии и флоте". Таксама да гэтай даты была наладжана кніжная выстава "В огнях победного салюта".

Да 50-годдзя з дня адкрыцця Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу "Хатынь" аддзел абслугоўвання Капыльскай цэнтральная раённай бібліятэкі імя А.Астрэйкі правёў інфармацыйна-патрыятычную гадзіну "Печальный набат Хатыни".

30 гадоў аддзяляюць нас ад таго памятнага дня, калі апошні савецкі салдат пакінуў зямлю Афганістана. Вайна ў

далёкай ад Беларусі краіне кранула і многіх нашых суайчыннікаў.

Да гэтай даты ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” былі арганізаваны: роздум за круглым сталом “Афганистан… Дни ушедшие в вечность” (Баравікоўская інтэграваная сельская бібліятэка), інфармацыйная гадзіна “Афганістан. Боль праз гады” (Томкавіцкая сельская бібліятэка), патрыятычная гадзіна “Афганистан – незаживающая рана” (Энергетыкаўская сельская бібліятэка), урок мужнасці “Мужали мальчишки в бою” (Скірмантаўская сельская бібліятэка); і інш.

У лютым да Дня Памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў у Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэцы была аформлена тэматычная выстава-рэквіем «Афганистан – дорога Памяти»; сумесна з ДАСААФ у рамках месячніка абаронна-патрыятычнай і спартыўнай работы была арганізавана сустрэча з воінамі-інтэрнацыяналістамі “Отвага. Мужество. Честь”. Вечар-сустрэча “Афганістан… Гэта подзвіг і памяць” прайшла ў гарадской б/ф №2. Вучні сустрэліся з удзельнікамі баявых дзеянняў у Афганістане, якія падзяліліся сваімі ўспамінамі, расказалі аб баявых буднях, прадэманстравалі свае ўзнагароды. Да мерапрыемства была аформлена кніжная выстава “Горькая память афганской войны” і інфармацыйны стэнд “Память о них бессмертна”, дзе былі прадстаўлены фотаздымкі землякоў, загінуўшых у полыме афганскай вайны.

На ўрачыстым мерапрыемстве “Рубцом на сэрцы лёг Афганістан...”, якое адбылося ў ДУА “Салігорская дзіцячая школа мастацтваў”, Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка прадставіла тэматычную выставу “Афганістан. Без права на забыццё” і відэапраект “Афганістан. Яшчэ раз пра вайну”. Нікога не пакінула раўнадушным сустрэча “Боль маёй душы – Афганістан” з воінам-інтэрнацыяналістам, журналістам, пісьменнікам Вадзімам Багданавым.

Супрацоўнікі Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Труса прынялі ўдзел у раённым мітынгу, прысвечаным 30-годдзю вываду савецкіх войскаў з

Афганістана. На вечар-памяці “Мы ушли из Афгана”, які прайшоў на базе бібліятэкі,былі запрошаны вучні 8 класа сярэдняй школы №2 імя К.К. Крапівы, удзельнік баявых дзеянняў у Афганістане, маёр у адстаўцы Міхаіл Іванавіч Бокуць, яго жонка Вольга Рыгораўна, удзельніца літаратурнага аб’яднання “Нёманец”.

“Афганістан: праз трыццаць гадоў” – такую назву мела сустрэча з воінамі-інтэрнацыяналістамі, якая прайшла ў Чэрвеньскай цэнтральнай раённай бібліятэцы. На мерапрыемства ўдзельнікамі афганскай вайны прыйшлі вучні старэйшых класаў СШ№2 і навучэнцы Чэрвеньскага прафесійна-будаўнічага ліцэя. 30-годдзю вываду савецкіх войск з Афганістана была прысвечана гадзіна памяці “Особый день в истории страны” у Грабянецкай сельскай бібліятэцы Чэрвеньскага раёна.

**Эстэтычнае выхаванне**

Асноўнай мэтай эстэтычнага выхавання з'яўляецца далучэнне чытачоў да скарбніцы айчыннай і сусветнай культуры, садзейнічанне развіццю мастацкага густу, фарміраванне творчай гарманічна развітай асобы.

Барысаўская цэнтральная раенная бібліятэка імя І.Х. Каладзеева прыняла ўдзел у Міжнароднай акцыі “Книговички-2019”, ініцыятарам і арганізатарам якой стала МБУК г. Самара “Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк”.

Супрацоўнікі дзіцячага аддзела правялі майстар-клас для дзяцей і бацькоў па вырабе “Книговичков” – ёлачных упрыгожванняў, зробленых сваімі рукамі. Усе госці трапілі ў святочную атмасферу чараўніцтва і радасці, з задавальненнем удзельнічалі ў гучных чытаннях казкі “Навагодні паштальён” Таццяны Комзалавай.

Хлопцы з энтузіязмам разам з Дзедам Марозам, Снягуркай і Бабай Ягой майстравалі галоўнага персанажа казкі “Снегавік-паштальён”.

Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Ганны Новік арганізавала праект “Цуды сваімі рукамі”. У рамках праекта у гэтым годзе прайшлі выставы работ: “Зимние увлечения” выхаванцаў ДУА “Вілейскі раённы цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі”; творчых работ майстроў Дома рамёстваў “Гліняная казка” і г.д.

“Творчыя людзі пасёлка” – так называецца арт-праект сельскай бібліятэкі-філіяла пасёлка Чысць Маладзечанскага раёна, у рамках якога праводзяцца сустрэчы чытачоў з творчымі людзьмі, арганізуюцца майстар-класы, выставы.

У зале мастацтва Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя М.Багдановіча быў распрацаваны арт-праект “Цудоўнае сваімі рукамі”, накіраваны на развіццё эстэтычнай культуры моладзі, фарміраванне мастацкага густу, абуджэнне цікавасці і любові да мастацтва роднага краю. На працягу года ў рамках праекта праведзены чатыры майстар-класа.

У Буйкаўскай сельскай бібліятэцы Мядзельскага раёна пачаў сваю работу праект “Разам з кніжкай мы расцём” з выхаванцамі дзіцячага садка і вучнямі пачатковых класаў. Мэта праекта – прывіць у маленькіх чытачоў любоў да кнігі, чытання з маленства. Цікава былі арганізаваны такія мерапрыемствы, як Дзень рэкламы кнігі “Твая першая кніга”, гучныя чытанні “Падарожжа ў краіну казак”, майстар-класы і выставы.

Эстэтычнае выхаванне моладзі ў Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Паўлюка Пранузы ажыццяўляецца праз рэалізацыю пректа па эстэтычнаму выхаванню дзяцей і моладзі “ART-тэрыторыя”. “ART-тэрыторыя” – гэта не толькі выставы, але і творчыя сустрэчы з мастакамі і майстрамі народай творчасці.

У Заслаўскай гарадской бібліятэцы працуе Арт-прастора “Каскад”. Кожны карыстальнік бібліятэкі на працягу года знаёміўся з работамі таленавітых людзей горада, якія экспанаваліся ў бібліятэцы. Так, у 2019 годзе прайшлі: выстава ўдзельнікаў гуртка “Капитошка” “Снежно нежная сказка зимы”, на якой былі прадстаўлены дзіцячыя малюнкі пра зіму;

выстава выцінанкі “Волшебный силуэт”. Работы да гэтай выставы выкананы кіраўніком творчай майстэрні “Мастацкай аплікацыі” ДУ “ТЦСАН Мінскага раёна” Нэллі Бабіч і падапечнымі аддзялення дзённага прыбывання інвалідаў.

З мэтай эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення пры Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэцы імя А.Астрэйкі працуе клуб “Ліра”, у рамках якога былі праведзены літаратурна-паэтычнае падарожжа да 220-годдзя А.С.Пушкіна “Я в гости к Пушкину спешу” і паэтычны вечар “Кветкі для любімага паэта”. Бібліятэкай была арганізавана сустрэча з артыстамі знакамітага тэатра песні і паэзіі “Разам” пад кіраўніцтвам сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі і саюзнай дзяржавы Ф.І.Баравога. Выступленне маладога спявака, дыпламанта міжнароднага фестывалю “Ветер удачи” Міхаіла Раджа зачаравала слухачоў прыгажосцю голаса і вялікай адданасцю творчасці.

Да дня закаханых у Коранскай сельскай бібліятэцы Лагойскага раена была прымеркавана гадзіна паэзіі “На крыллях кахання”. На мерапрыемстве прагучалі вершы У.Шэкспіра, Р.Гамзатава, М.Цвятаевай, Г.Ахматавай.

Тэатральнае прадстаўленне, як форма работы з дзецьмі, стала запатрабавана ў Заслаўскай гарадской дзіцячай бібліятэцы Мінскага раена, дзе дзейнічае лялечны тэатр “Казачная скарбонка”. Да Новага 2019 года работнікі бібліятэкі і члены клуба падрыхтавалі новую пастаноўку “Як мядзведзь Новы год сустракаў” і святочную праграму з конкурсамі, загадкамі і прызамі. На тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі для дзецей былі падрыхтаваны лялечныя спектаклі “Дружба” і “Прыгоды ў казачным каралеўстве”. Пры Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэцы дзейнічае клуб эстэтычнага выхавання “Зазеркалье”. Шэраг мерапрыемстваў на працягу года ў бібліятэцы збіраў як дзяцей, так і іх бацькоў: тэатралізаваная гульня “Сказочный мир в лучах света”, вечар-прадстаўленне “Мир волшебных теней”, тэатралізаванае прадстаўленне “Планета сказочных героев”, гульня-падарожжа “Королевство теней”.

Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэкай імя Максіма Багдановіча была падрыхтавана прэзентацыя кнігі “Барыс Аракчэеў. Бэз малюецца на шчасце”, якая прайшла з удзелам творчай інтэлігенцыі горада, а таксама будучых мастакоў – навучэнцаў мастацкіх каледжаў.

Прыхільнікам творчасці А.Пахмутавай, А.Пугачовай Голацкай сельскай бібліятэкай Пухавіцкага раена быў прапанаваны музычны фуршэт “Жанчына, якая спявае”, “Гучаць знаёмыя мелодыі”. Чытачам сталага ўзросту быў прапанаваны бібліятэчны тэлесеанс ”Галоўныя ролі” прысвечаны 85-годдзю з дня нараджэння народнага артыста Г.Гарбука. На працягу года бібліятэкар знаёміла чытачоў з кампазітарамі, творчымі людзьмі краю, рыхтавала музычныя хвіліны аб творчасці вядомых кампазітараў.

Абчугская сельская бібліятэка-клуб Крупскага раёна ў рамках клуба “Были-небылицы” правяла свята “Новый год в кругу друзей”, на якім была прадстаўлена выстава падзелак мясцовай жыхаркі ў стыле фларыстыка, качанне з воўны, пляценне з гумак, вышыванкі, а таксама кірмаш навагодніх падарункаў.

У Мядзельскай раённай дзіцячай бібліятэцы шмат увагі надаецца рабоце па выяўленні і падтрымцы таленавітых дзяцей, стварэнні ўмоў для самарэалізацыі падрастаючай асобы, яе творчага развіцця. На працягу лютага дзейнічала выстава “Радуга хорошего настроения”, на якой былі прадстаўлены работы з салёнага цеста вучаніцы 2 класа Круцько Асі. Для дзяцей арганізавалі майстар-клас “Базовые формы оригами”. Да Свята жанчын афармілі інтэрактыўную выставу “Единственной маме на свете”. На ёй экспанаваліся работы дэкаратыўна-прыкладной мастацтва вучняў 4-9 класаў. У снежні дзеці прынялі ўдзел у святочным афармленні бібліятэкі да Новага года. намалявалі малюнкі і зрабілі навагоднія ўпрыгожванні з паперы

У Салігорскай раённай цэнтральнай бібліятэцы былі арганізаваны: выстава творчых прац навучэнцаў ДУА “Салігорская дзіцячая мастацкая школа мастацтваў” “Малюем

родны горад”, выстава творчых работ студыі выяўленчага мастацтва “Малахіт”, “Палітра талентаў” і г.д.

Не застаюцца раўнадушнымі наведвальнікі бібліятэкДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П.Труса” да выстаў самадзейных майстроў, вернісажаў дзіцячых малюнкаў і паробак, якія традыцыйна праводзяцца да розных святаў: конкурсы малюнкаў “Прыгажуня-Зіма” (Кухціцкая сельская бібліятэка), “Я чытаю, я малюю” (Ліцвянская сельская бібліятэка), “Как мы радугу рисовали” (Лашанская сельская бібліятэка), вернісажы партрэтаў “Нашы мамы – самыя прыгожыя” (Цепленская сельская бібліятэка), “Феерверк казачных герояў” (Каралёўская сельская бібліятэка), майстар-клас “Чудесная снежинка” (Дзешчанская сельская бібліятэка),

У Чэрвеньскім раёне ў Кліноцкай бібліятэцы-клубе прайшло мерапрыемства “Пошук добрых спраў”, дзе дзеці рабілі віншавальныя паштоўкі да Міжнароднага дня жанчын. У Грабянецкай бібліятэцы-клубе была праведзена выстава дзіцячых вырабаў “Детству солнце подарите”, прысвечаная Дню абароны дзяцей. Пад назвай “День оранжевого настроения” прайшоў конкурс малюнкаў на асфальце.

**Духоўна-маральнае выхаванне**

Бібліятэкі пастаянна надаюць ўвагу пытанням духоўнага адраджэння, прапагандзе і вывучэнню праваслаўнай літаратуры, памятаючы пра тое, што толькі праз развіццё маральнасці, духоўнасці магчыма выхаванне высокадухоўнай асобы.

Садзейнічанню духоўнаму развіццю дзяцей і падлеткаў спрыяла правядзенне Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкай для вучняў 4-х класаў СШ №2 урока духоўнасці “Светлое, доброе, вечное!” у рамках святкавання Дня праваслаўнай кнігі. Пра гісторыю ўзнікнення і асаблівасці праваслаўнай кнігі прысутным расказаў настаяцель храма Свяціцеля Мікалая Ілля Ганчарук. Для вучняў іерэй правёў

віктарыну і перадаў у дар дзіцячай бібліятэцы падборку праваслаўнай літаратуры.

Традыцыйным у бібліятэках Вілейскага раёна стала правядзенне Тыдня праваслаўнай кнігі. Адна з асноўных задач гэтага мерапрыемства заключаецца ў тым, каб дапамагчы адрадзіць у грамадстве лепшыя духоўныя і сямейныя традыцыі.

11-17 сакавіка ў бібліятэках Вілейскага раёна ў рамках Тыдня праваслаўнай кнігі “Слова веры” прайшлі наступныя мерапрыемствы: агляд і знаёмства з духоўнай літаратурай “Кніжны свет праваслаўя” (Куранецкая сельская бібліятэка), гадзіна духоўнасці “Книги, просвещение, разум – чтение полезное душе” (Бібліятэка сямейнага чытання), гадзіна духоўных зносін для вучняў 5-9-х кл. “Святая праведная Сафія Слуцкая” (Іжская сельская інтэграваная бібліятэка), вечарына духоўных зносін “Неугасимый огонь православной поэзии” (Ерхаўская сельская бібліятэка). Госцем мерапрыемства стаў настаяцель храма Святога Духа в. Рэчкі айцец Валянцін Пешко. Спадабаліся чытачам інтэрактыўная выстава “Светлое Воскресение” і арт-выстава “Калядны вернісаж”, якія прайшлі ў Людвіноўскай сельскай інтэграванай бібліятэцы. У іх арганізацыі прымалі ўдзел работнікі ДК і іх выхаванцы з гурткоў “Мальберт” і “Фантазія”.

Да найбольш значных праваслаўных святаў бібліятэкі Валожынскага раёна рыхтавалі кніжныя выставы і мерапрыемствы. Асабліва значная падзея – гэта Нараджэнне Хрыстова. У многіх бібліятэках прайшлі экскурсы ў гісторыю свята: “Віфліемская зорка” (Дорская сельская бібліятэка), “Каляды і калядныя традыцыі” (Сакаўшчынская сельская бібліятэка), “От Рождества до Крещения” (Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка), “Чароўнае святло Нараджэння Хрыстова” (Вішнеўская сельская бібліятэка). Да Дня праваслаўнай кнігі ў Суднікаўскай сельскай бібліятэцы прайшоў гістарычны вечар “Духоўная кніга – крыніца вялікай мудрасці”. Бібліятэкар пазнаёміла прысутных з асветнікамі,

прапаведнікамі хрысціянства Кірылам і Мяфодзіем. Сугваздаўская сельская бібліятэка-клуб ужо некалькі гадоў вядзе мэтанакіраваную сумесную працу са святаром Дорскай царквы.Сістэматычна праводзяцца разнастайныя па форме і змесце мерапрыемствы: гутарка “На шляху любові і дабра”, гадзіна духоўнасці “Пагаворым аб вечным”, гутарка-роздум “Да духоўнасці праз кнігу” і інш.

У Дзень закаханых у Духоўна-культурным цэнтры Дзяржынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі ў рамках праекта “Духоўны свет моладзі” прайшоў шчыры дыялог “Влюбленность или первая любовь?”. Удзельнікамі праекта сталі вучні 9-х класаў ДУА “Сярэдняя школа №4 г. Дзяржынска”. У дзень адкрыцця фестываля праваслаўнай культуры “Кладезь” у Дзяржынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшла сустрэча з кандыдатам культуралогіі, аўтарам кнігі “Православные святыни Беларуси” Наталляй Шчарбаковай. У кастрычніку традыцыйна адбыліся IV Пакроўскія чытанні “Духовные истоки малой родины: от прошлого к настоящему”, якія адкрылі для ўдзельнікаў новыя старонкі духоўнай гісторыі роднага края.

Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі працуе у рамках мэтавай праграмы “Строим Храм в душах” і з’яўляецца інфармацыйным, адукацыйным і асветніцкім цэнтрам, які мае ў сваіх фондах багацейшыя матэрыялы па гісторыі цэркваў Капыльскага раёна, традыцыях праваслаўнай веры і свяшчэнаслужыцелях. Пры раённай бібліятэцы дзейнічае духоўна-асветніцкі цэнтр “Дорога к Храму”, на базе якога праходзяць мерапрыемствы духоўнай тэматыкі. У рамках праваслаўнай праграмы “Строим Храм в душах” і клуба духоўна-маральнага выхавання "Чысты Свет" на базе Цімкавіцкай сельскай бібліятэкі сумесна са Свята-Нікольскай царквой аг.Цімкавічы было праведзена некалькі мерапрыемстваў: літаратурна-музычнае свята “Рождественская история”, свята “Пасхальный перезвон”, размова-развага “Понятие о добре и зле”. Таксама было арганізавана сумеснае мерапрыемства Цімкавіцкай сельскай бібліятэкі і

Літаратурнага музея Кузьмы Чорнага «Письмо Святому Николаю», прымеркаванае да свята Мікалая Цудатворца.

Ухвальская сельская бібліятэка Крупскага раёна працуе па праграме на 2019-2021 гг. “На шляху да духоўнасці”, мэта якой – выкарыстанне бібліятэкай усіх магчымасцей па выхаванню духоўна-маральных каштоўнасцей у сваіх чытачоў праз розныя формы і метады бібліятэчнай работы, маральнае выхаванне дзяцей і падлеткаў у традыцыях праваслаўнай культуры. У рамках праграмы ў бібліятэцы адбыліся наступныя мерапрыемствы: праваслаўныя гадзіны “На шляху да Бога” і “Свет віфліемскай зоркі”, гадзіны духоўнасці “Мудрасць нябесная і зямная” і “Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы” і творчая гадзіна для ўдзельнікаў аматарскага аб’яднання “Знайка” “Калядны падарунак”.

Лагойскай дзіцячай бібліятэкай наладжана цесная сувязь з Лагойскім дабрачыннем. З удзелам святароў арганізуюцца і праводзяцца розныя мерапрыемствы. Так, з удзелам іерэя А. Тарасевіча ў бібліятэцы адбыўся літаратурны круіз “Дзідаскал з Полацка”, прысвечаны 390-годдзю з дня нараджэння вялікага беларускага асветніка С.Полацкага. Школьнікі пазнаёміліся не толькі з цікавымі біяграфічнымі фактамі, але і яго асветніцкай дзейнасцю. У бібліятэцы быў праведзены агляд праваслаўнай літаратуры “Скарбы вечнай мудрасці”. Былі таксама праведзены: гадзіна духоўнасці “180 гадоў Полацкаму праваслаўнаму сабору” (Лагойская цэнтральная раённая бібліятэка), інфармацыйная гадзіна “Першыя крокі ў Храме” (Коранская сельская бібліятэка), урок міласэрнасці “Час милосердия, доброты и всепрощения” (Засоўеўская сельская бібліятэка-клуб), свята “Духоўная кніга – крыніца вялікай мудрасці” (Завішынская бібліятэка), агляд духоўнай літаратуры “Праз кнігу – да духоўнасці” (Астрошыцкая бібліятэка).

У справаздачным годзе ў Мядзельскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Максіма Танка паспяхова працаваў духоўна-асветніцкі цэнтр “Духоўнасць. Вера. Вечнасць”.

Выставы і агляды новай літаратуры тут заўсёды запатрабаваны чытачамі.

Духоўнае выхаванне і асвета, праваслаўная кніга як элементы выяўляюцца ў многіх напрамках бібліятэчнай работы і мерапрыемствах па папулярызацыі кніг. Сталі традыцыйнымі цыклы духоўных чытанняў для дзяцей "Чытанне для душы і сэрца" у Баярскай сельскай бібліятэцы-доме вольнага часу. Княгінінская сельская інтэграваная бібліятэка арганізавала гадзіну даверлівай размовы "Пагаворым пра сумленне і Евангельскія запаведзі". На мерапрыемстве ішла размова пра асноўныя запаведзі, па якіх павінен жыць кожны хрысціянін. Вершы і музычныя творы духоўнай тэматыкі прадоўжылі размову.

У 2019 годзе працягваў працу духоўна-асветніцкі цэнтр "Існасць" пры Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Паўлюка Пранузы. У яго рамках дзейнічаюць клуб духоўна-маральнага выхавання падлеткаў і моладзі "Ноеў каўчэг", сямейны клуб "Згода", праходзяць заняткі Нядзельнай школы храма Узнясення Гасподня г. Нясвіжа. Выйшлі ў эфір 11 выпускаў духоўна-асветніцкай перадачы "Абуджэнне" як вынік сумеснага праекта бібліятэкі, раённага радыё і Нясвіжскага благачыння. Самымі запамінальнымі сталі: свята духоўнасці ў гонар Нараджэння Хрыстова, у якім прынялі ўдзел наведвальнікі клуба духоўна-маральнага выхавання падлеткаў і моладзі "Ноеў каўчэг", а таксама другі фестываль духоўнасці "Велікоднае святло душы", падрыхтаваныя сумесна з Нясвіжскім цэнтрам культуры. У рамках дзейнасці духоўна-асветніцкага цэнтра "Існасць" адбыліся і паломніцкія паездкі: манастыр Ксеніі Пецярбургскай і Ксенеўскую крыніцу в. Барань Барысаўскага раёна, Свята-Благавешчанскі манастыр в. Ляды, магілку Валянціны Мінскай "Па святых мясцінах Беларусі", паездка і ўдзел у літургіі, якую ўзначаліў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел "Новая святыня Слуцкай зямлі – храм Паісія Святагорца", паездка ў храм Архангела Міхаіла ў в. Сынкавічы Зельвенскага раёна, Жыровіцкі Свята-Успенскі манастыр, Жыровіцкую крыніцу, жаночы скіт прападобнага

Амвросія Опцінскага в. Русакова Слонімскага раёна “Дарогамі праваслаўнай Беларусі”, падарожжа ў расійскі горад Пскоў і яго ваколіцы “Святыні Расіі” і паездка ў Свята-Благавешчанскі манастыр в. Малыя Ляды, магілку Валянціны Мінскай, Вітаўскую крыніцу з цыкла “Па святых мясцінах Беларусі”.

У Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы пастаянна дзейнічае цэнтр праваслаўя “Шляхі да духоўнасці”. На працягу года арганізоўваліся выставы, прысвечаныя датам царкоўнага каляндара і народным святам: “Святая Таццяна – падзвіжніца набожнасці”, “И сышло на зямлю хараство... Вялікдзень”, “У нядзелю Вербную”, “ДзеньТройцы нам таямніцы адкрывае” і інш.

У справаздачным годзе ў рамках сацыяльна-духоўнай праграмы “Благавест” бібліятэкары Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі праводзілі мэтанакіраваную і паслядоўную работу па папулярызацыі духоўнай літаратуры, фарміраванні ў чытачоў маральна-духоўных каштоўнасцей. Рэалізацыя праекта засноўваецца на супрацоўніцтве са Слуцкім Благачыннем, рэсурсным цэнтрам па духоўна-маральнаму выхаванню (ДУА «Сярэдняя школа № 6 г. Слуцка»), установамі адукацыі раёна, краязнаўцамі. Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка сумесна са Слуцка-Салігорскай Епархіяй Мінскай Мітраполіі Беларускай Праваслаўнай Царквы падрыхтавалі Дзень праваслаўнай кнігі “Духоўнасць. Культура. Кніга”. На ўрачыстым адкрыцці Дня праваслаўнай кнігі была адзначана вялікая роля праваслаўнай кнігі ў фарміраванні маральных якасцей асобы. Таксама прайшла духоўна-асветніцкая гутарка “Праваслаўе ў Беларусі”, прысвечаная 180-годдзю Полацкага царкоўнага сабора, якую правёў кандыдат багаслоўя протаіерэй Аляксандр Шклярэўскі. У дзіцячым аддзеле раённай цэнтральнай бібліятэкі прайшла гадзіна духоўнасці “Вечная кніга – Біблія” з удзелам пратаіерэя Г. Пятроўскага, кіраўніка аддзела рэлігійнай адукацыі і катэхізацыі Слуцка-Салігорскай Епархіі. Юныя карыстальнікі сталі гледачамі лялечнага спектакля “Непаслухмяная авечка”,

пазнаёміліся з выставай-калекцыяй дзяўчынкі-інваліда па зроку “Колокольчиков чудесные созвучия”.

З 2018 года пры Языльскай сельскай бібліятэцы Старадарожскага раена пачаў працаваць клуб для дарослых “Свеча”. Для удзельнікаў клуба да праваслаўных святаў былі праведзены: сустрэча “Мерцала звезда по пути в Вифлеем”, тэматычны вечар “Пусть сердце раскроется на Святую Тройцу”, духоўная гутарка “Сретение Господне”, пасхальныя сустрэчы “Звенит Пасхальная радость”, вечар духоўнай культуры “И боль моя, и Гордость, и Краса: Храмы Беларуси”. Да ўдзелу ў мерапрыемствах запрашаўся святар.

На працягу года ў бібліятэках Уздзенскага раёна афармляліся кніжныя выставы духоўнай тэматыкі: “Жывое слова мудрасці духоўнай”, “Сияние Рождества”, “Вечной Пасхи живительный свет”, “Пасху радостно встречаем”, “Азбука православия”, “Волшебное слово”, “Скарбы праваслаўнай культуры”, “Мир православной книги”, “Покров Святой Матери”, “И сошла на Землю благодать…”, “Да не погаснет в душах Свет!”, “Чудесный свет православной книги”, “Книги, меняющие жизнь”, “Обрати своё сердце к вере”, “Дарога да храма – дарога дарог”, “Спачатку было Слова…”, “Духовных книг божественная мудрость”,“В книжном доме – Рождество” і інш. “Жизнь дана на добрые дела”– такую назву атрымаў урок для вучняў 8 класа ДУА “Уздзенская сярэдняя школа №1 імя А.С.Пушкіна”. У гэты дзень у літаратурнай гасцёўні абмяркоўвалася спрадвечная тэма супрацьдзеяння дабра і зла, узніМаліся актуальныя пытанні маральна-этычных якасцей сучаснага чалавека. Навучэнцы абмяркоўвалі прагледжаны відэаролік, узгадвалі прыказкі і прымаўкі, прысвечаныя тэме дабра, уважліва слухалі выступленне запрошанага госця – Валянціны Шытыкі.

### Сямейнае выхаванне

Злучным звяном бібліятэкі з грамадствам з'яўляецца чытаючая сям'я. Узаемадзеянне бібліятэкі і сям'і вядзецца па

многіх кірунках і з рознымі катэгорыямі чытачоў: бацькі, дзеці, людзі сталага ўзросту, інваліды дзяцінства. Уся гэтая праца праходзіць сумесна з адукацыйнымі ўстановамі і іншымі партнёрскімі арганізацыямі, якія займаюцца праблемамі сям'і.

У ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Ганны Новік” Міжнароднаму дню сям'і былі прысвечаны: конкурсна-забаўляльная праграма “Великое чудо – семья!” (аддзел абслугоўвання і інфармацыі раённай бібліятэкі), вечар сямейнага адпачынку “Дружная сям’я” (Сцешыцкая сельская інтэграваная бібліятэка), сямейнае свята “Мая сям’я – мая радасць!” (Ерхаўская сельская бібліятэка), спартыўнае свята “Папа, мама, я – дружная семья!” (Іжская сельская інтэграваная бібліятэка).

Да Міжнароднага дня сям’і ў Валожынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы была падрыхтавана і праведзена гутарка “Загляни в семейный альбом”. Кожны ўдзельнік мерапрыемства прынёс фатаграфію і распавёў яе гісторыю. У гэтую гадзіну былі закрануты сямейныя традыцыі, рэліквіі, звычаі, узаемаадносіны і, вядома ж, каханне. Таксама была падрыхтавана кніжная выстава-прагляд “Семья – начало всех начал”.

Клецкая дзіцячая бібліятэка прыняла ўдзел у мерапрыемстве, прысвечанаму Міжнароднаму дню сям’і, якое адбылося ў гарадскім парку. Супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі гульнёвую праграму “Семья – любви великой царство”. Да мерапрыемства была арганізавана кніжная выстава “Под семейным зонтиком”. Творчыя здольнасці дзеці змаглі выявіць, прыняўшы ўдзел у конкурсе малюнкаў на асфальце “Моя семья”.

Бібліятэкар аграгарадка Валевачы Чэрвеньскага раена сумесна з настаўніцай пачаткавых класаў Т.А.Сядзьковай арганізавала ў бібліятэцы Свята сям’і “Счастлив тот, кто счастлив дома”. На мерапрыемства былі запрошаны вучні малодшых класаў і іх бацькі. У конкурснай праграме “ Все профессии важны, все профессии нужны” прымалі ўдзел каманды 3 і 4 класаў Валевачоўскай сярэдняй школы.

Урачыста, святочна і сардэчна прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя Дню маці ў бібліятэках Вілейскага раена: святочны вечар “Самая лепшая ў свеце” (Нарачанская сельская бібліятэка), святочная праграма “Матушка! Пречистая! Святая!” (Шылавіцкая сельская бібліятэка), акцыя-віншаванне “От улыбки солнечной светлей” (Чурлёнская сельская інтэграваная бібліятэка), бібліятэчныя пасядзелкі “Дзякуй жанчынам сяла” (Партызанская сельская інтэграваная бібліятэка). Былі арганізаваны конкурсы малюнкаў, конкурсы і майстар-класы па вырабу паштовак.

Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка далучылася да Рэспубліканскай прафсаюзнай акцыі “Поздравим маму вместе!”. Віншавальныя паштоўкі на працягу тыдня знаходзіліся ў чытальнай зале. Падчас наведвання бібліятэкі вучні ДУА “СШ № 1 г. Валожына” падпісалі і адправілі віншавальныя паштоўкі родным і блізкім. Святочная паштоўка з шчырымі пажаданнямі, ласкавымі і кранальнымі словамі – добры напамін аб нашай любові, падзяцы і павазе.

Для дзіцячых карытсальнікаў Чэрвеньскай цэнтральнай раённай бібліятэкі былі праведзены розныя інфармацыйна-пазнавальныя мерапрыемствы, якія дазваляюць дзецям пашырыць свой светапогляд і папоўніць веды школьнай праграмы. Да Міжнароднага дня жанчын правялі гульнёвую праграму “В марте солнышко пригрело”, удзельнікамі якой былі вучні 2 класа СШ №1. Яны чыталі вершы, спявалі песні і прымалі ўдзел у гумарыстычных конкурсах. Да Дня Маці ў бібліятэцы прайшла акцыя “Мама, я тебя люблю!”, затым з вучнямі 3 класа СШ №2 правялі святочную праграму “Под материнским покровом”.

У Валожынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы сумесна з тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва для ўдзельнікаў клубаў “Леди”, “Золотая осень” і гасцей падрыхтавалі вечар адпачынку “Любовью материнской мы согреты”.

Запамінальна і ярка ў публічных бібліятэках Уздзенскага раёна праходзяць мерапрыемствы, прысвечаныя Дню жанчын і Дню маці. Гэта гадзіны творчасці “Открытка для любимой мамы” (Слабадская сельская бібліятэка-клуб), “Что же маме подарить на Восьмое марта?” (Нёманская сельская бібліятэка), “Нарисую твой портрет” (Ліцвянская сельская бібліятэка), “Мама – слово дорогое” (Кухціцкая сельская бібліятэка). Выраб святочных сувеніраў захапляе дзяцей, спрыяе развіццю фантазіі, творчых здольнасцей, і адначасова дае магчымасць выказаць любоў, увагу і цеплыню да родных людзей.

Пры Багданаўскай сельскай бібліятэцы Валожынскага раена дзейнічае клуб сямейнага чытання “Сямейная акадэмія”. У рамках клуба у бібліятэцы праводзіўся дзень сямейнага адпачынку “Наша дружная семья”. Госці мерапрыемства паслухалі аповяд бібліятэкара аб маральных, духоўных каштоўнасцях сям’і канца XIX стагоддзя, аб складанні радавога дрэва і сямейнага календара. Прысутныя прынялі ўдзел у абмеркаванні важных пытанняў, якія тычацца сям’і, і назвалі тыя чалавечыя якасці, якія найбольш каштоўныя ў сям’і. Да Міжнароднага дня жанчын для ўдзельнікаў клуба быў прапанаваны дзіцячы ранішнік “Мама – сонейка маё”. Да Дня маці ў рамках клуба прайшоў круглы стол “Матулін альбом”. Члены аб’яднання падзяліліся ўражаннямі сямейных рэліквій.

## ***Краязнаўчая дзейнасць***

Краязнаўчая дзейнасць працягвае заставацца адным з прыярытэтных напрамкаў у рабоце бібліятэк Мінскай вобласці.

У справаздачны год краязнаўчая дзейнасць бібліятэк вялася ў адпаведнасці з **рэгіянальнымі і мясцовымі праграмамі і праектамі**: спецыяльны краязнаўча-асветніцкі інавацыйна-творчы праект “Гісторыя раёна ў суквецці датаў і імёнаў”, краязнаўчы праект “Краязнаўчы лекторый на колах” (ДУК “Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка”), літаратурна-

краязнаўчы праект “Пад зоркай паэзіі” (ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка”), раённая мэтавая праграма “Вяртанне да вытокаў” (Ракаўская сельская бібліятэка Валожынскага раёна), віртуальны фотапраект “Малая радзіма на старых фотаздымках”, праекты “Бібліятэка – інфармацыйна-краязнаўчы цэнтр” і “Чытаем кнігі мясцовых аўтараў”, праграма “Жыве народ, пакуль жыве яго гістарычная памяць” (ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік”), праект “Гісторыя малой радзімы ў асобах і падзеях” (Партызанская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), праект “Кросны” (Чурлёнская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), праграма “Мая зямля, мае землякі”, праекты “На літаратурным небасхіле Дзяржыншчыны”, “Гісторыя Дзяржыншчыны ў асобах”, “Краязнаўчая палітра”, “Крочым родным краем, старонкі гісторыі збіраем” (ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”), краязнаўчыя праекты “Крочым родным краем, старонкі гісторыі збіраем”, “Гучыць напеўна, бы меладыя, гаворка скірмунтаўская” (Скірмантаўская сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна), краязнаўчая праграма “І для мяне не было б Беларусі, без маленькай Радзімы маей” (ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі”), раённая краязнаўчая праграма “Зямля бацькоў – майго жыцця крыніца” (ДУ “Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка”), краязнаўчая праграма “Жыву і дыхаю, мой Крупскі край, табой”, мультымедыйны праект “Унікальныя насельнікі жывельнага і расліннага свету Крупскага раёна” (ДУК “Крупская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Купалы”), мэтавая праграма “Святло малой радзімы” (сетка публічных бібліятэк Лагойскага раёна), рэгіянальны краязнаўчы праект “Наша спадчына” (ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка”), праект “Мой край – Маладзечаншчына” ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча), “Пра цябе, мой родны горад, я з любоўю раскажу” (Бібліятэка сямейнага чытання “Верасок” г. Маладзечна), мэтавая праграма “Зямля мая, святая і адзіная.

Адраджэнне…”, праект “Міншчына” (ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”), “Спеў пра малую радзіму” (Шаршунская сельская інтэграваная бібліятэка Мінскага раёна), “Возращение к истокам” (Навасельская сельская бібліятэка Мінскага раёна), краязнаўча-асветніцкі праект “На гэтай зямлі нашы продкі жылі” (ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка”), праект “Лёсам з Нясвіжчынай” (ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы”), раённы бібліятэчны праект “Літаратурнае сузор’е Пухавіччыны” (ДУК “Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка”), тэкстыльны арт-праект “Мягкая Родина”, праекты “Зямля, дзе ўтульна сэрцу”, “Культурный код Солигорска” (ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”), духоўна-краязнаўчы праект “Слуцк – валошка ў вянку Беларусі” (ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка”), раённы бібліятэчны праект “Край мой – гонар мой” (сетка публічных бібліятэк Смалявіцкага раёна), “Свой родны край любі і знай” (Зялёнаборская сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), праграмы “Спадчына”, “Памяць Міншчыны”, раённая мэтавая праграма “Ён Радзімаю завецца – непаўторны мілы край” (ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка”), раённая мэтавая краязнаўчая праграма “Краязнаўчая прастора: імёны і час”, вэб-праект “Пісьменнікі Уздзеншчыны – дзецям” (ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса”), праграма “Ведаць і любіць свой край” (ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка”).

У жыцці кожнага чалавека асаблівае месца займае **малая радзіма.** Менавіта там, дзе мы нарадзіліся і выраслі, адбываюцца найважнейшыя падзеі, якія застаюцца ў памяці на ўсё жыццё.

Мінулае і сучаснасць горада, раёна, вёскі, вопыт папярэдніх пакаленняў, іх традыцыі, побыт, звычаі, прыродныя своеасаблівасці мясцовасці і многае іншае – усё гэта нярэдка становіцца тэмай **шматлікіх бібліятэчных мерапрыемстваў**.

У Барысаўскім раёне праходзіў Тыдзень, прысвечаны памяці заснавальніка горада Барысава – князя Барыса. У святочныя мерапрыемствы, што праходзілі на Тыдні ў г. Барысаве, унесла сваю лепту і Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя. І. Х. Каладзеева. У рамках Тыдня памяці ўстановай праводзіліся асветніцкія мерапрыемствы (інфармацыйная старонка “Этот город основал князь Борис”, тэматычная гутарка “Имя князя Бориса в истории нашего города”, прэзентацыя кнігі “Борисовская епархия. Прошлое и настоящее”), а таксама афармляліся кніжныя выставы (“Святой благоверный князь Борис: страницы истории Борисовского края”, “Имя в летописи: князь Борис и его время”, “…поставил град Борисов в своё имя”, “Князь Борис – основатель города Борисова”, “Князь-воитель, князь-градостроитель”).

У ДУК “Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка” працягваў работу спецыяльны краязнаўча-асветніцкі інавацыйна-творчы праект “Гісторыя раёна ў суквецці датаў і імёнаў” разлічаны на 2018–2020 гады з улікам знамянальных датаў – 95-годдзя Бярэзінскага раёна, 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 75-годдзя Перамогі. Праект спрыяе актуалізацыі краязнаўчага патрыятызму, дазваляе разбудзіць пазнавальную цікаўнасць і дапытлівасць сучаснікаў да гісторыі роднага краю, выбітных землякоў, якія з’яўляюцца духоўнай элітай грамадства, вызначаюць інтэлектуальны твар рэгіёна, з’яўляюцца для сучаснікам духоўным камертонам. За лёсам землякоў – лёс горада і раёна, багатая энцыклапедыя чалавеказнаўства.

Другі год рэалізацыі праекта ў гонар малой радзімы даў свае напрацоўкі. Зладжаны 11 акцый цыклаў “Вялікія імёны малой радзімы”, “На малую радзіму да земляка – з паклонам”, “Вядомыя бярэзінцы ў сталіцы”, “Горад у спадчыну”, “Імя на літаратурнай карце Бярэзіншчыны”, “Ветэраны – маякі памяці”, “Малая радзіма: месца добрых пачынаў”, “Сузор’е мужнасці”. Прайшлі мерапрыемствы-прысвячэнні землякам – звычайным у сваёй незвычайнасці людзям, мерапрыемствы, якія ствараюць духоўны партрэт землякоў і партрэт часу,

малююць вясёлку лёсаў – маленькія хронікі бярэзінцаў. Такія мерапрыемствы нясуць высокую адлюстравальна-пазнавальную, выхаваўча-грамадскую, краязнаўча-зберагальную місію.

У Заастравецкай сельскай бібліятэцы-філіяле Клецкага раёна быў створаны этнаграфічны куток. Тут прадстаўлены інфармацыйны краязнаўчы матэрыял, а таксама рэчы сялянскага побыту мінулых часоў: бажніца, бойка, верацяно, гарлач, калаўрот, матавіла, пранік, прас, сукала, мужчынскае і жаночае адзенне пачатку XX стагоддзя, ткацкі станок, лапці, керасінавая лямпа, радыёла, шалі, барабан, кадушка, сявенька, ступа, скрыпка, калыска і шмат іншых прадметаў. Трэба сказаць, што куток пастаянна папаўняецца новымі экспанатамі.

Значнай падзеяй для Лагойскай цэнтральнай раённай бібліятэкі стала 95-годдзе ўтварэння Лагойскага раёна.. З гэтай нагоды была арганізавана дэкада краязнаўства “Мой непаўторны, родны край”. Бібліятэкі раёна правялі цікавыя і змястоўныя мерапрыемствы, якія знаёмілі з гісторыяй, мясцовымі традыцыямі і сучаснасцю краю, знакамітымі землякамі.

Шэраг цікавых і змястоўных мерапрыемстваў адбылося на працягу тыдня краязнаўства “Лагойшчына – мая радзіма” ў Плешчаніцкай гарпасялковай бібліятэцы Лагойскага раёна. Інфармацыйная гадзіна “Лагойскаму раёну – 95” праведзена ў выглядзе падарожжа па Лагойшчыне. Мерапрыемства суправаджалася прэзентацыяй “Лагойшчына: учора і сёння” у час якога прысутныя пазнаёміліся з прыгожымі мясцінамі нашага раёна, здзейснілі завочнае падарожжа ў купалаўскія мясціны, музей “Акопы”, гарналыжныя комплексы “Лагойск” і “Сілічы”, наведалі мемарыяльныя комплексы “Хатынь” і “Дальва”. Краязнаўчае падарожжа “Тут я нарадзіўся, тут я жыву” было прысвечана Плешчаніцам. Прагучаў цікавы аповед пра былое і сучаснае, пра людзей, якія праславілі сваю маленькую радзіму. Прысутныя пазнаёміліся з выставай мясцовых паэтаў і пісьменнікаў, фотаздымкамі вядомых мясцін гарадскога пасёлка, краязнаўчымі папкамі “Мая малая

радзіма”, “Плешчаніцы і вайна 1912 года”, “З легендаў і паданняў”. Гутарка-ўспамін “Людзьмі і памяццю жыве наш край” была прысвечана паэтам і пісьменнікам Лагойшчыны. Гучалі вершы Н. Гілевіча, С. Давідовіча, В. Максімовіча. Агляд краязнаўчых матэрыялаў “Мы ўспамінем пра вайну” пазнаёміў з артыкуламі, прысвечанымі Вялікай Айчыннай вайне, партызанскаму і падпольнаму руху на тэрыторыі Лагойшчыны. Адбылося знаёмства з краязнаўчымі папкамі-дасье: “Ведаць і памятаць”, “Плешчаніцкае падполле”, “Франтавымі дарогамі”, “Бой за пасёлак”.

Сустрэчы-экскурсіі па родным краі – гэта цэлы свет, разнастайны і цікавы, які прыносіць шэраг эмоцый і выдатны настрой. З мэтай арганізацыі вольнага часу і распаўсюджвання краязнаўчай інфармацыі ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка” быў распрацаваны праект “Міншчына”, асноўнай задачай якога з’яўляецца азнакамленне з гістарычнымі і памятнымі месцамі Мінскага раёна праз стварэнне віртуальных экскурсій, якія распавядаюць аб краі і яго адметнасцях. Сацыяльная значнасць праекта – стварэнне аптымальных умоў для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, з мэтай паўнавартаснага задавальнення інфармацыйных патрэб у краязнаўчай інфармацыі і знаёмства з прысталічным рэгіёнам. Мерапрыемствы праходзілі адзін раз у месяц у цёплай атмасферы, з душэўнай гутаркай.

У рамках праекта прайшлі вечары-сустрэчы: “Анопаль, на беразе ракі”, “Міханавічы. З любоўю да Радзімы”, “Ігнацічы – старадаўняя сядзіба Мінскага краю”, “Палац у Прылуках”, “Малы Трасцянец – лагер знішчэння”, “Лашаны. Лінія Сталіна”, “Строчыцы – музей народнай архітэктуры і побыту”, “Гісторыя сядзібы Сёмкава”, “Царква Спаса-Праабражэнская ў Астрашыцкім Гарадку”, “Заслаўе – старажытны горад Беларусі”, “Сядзібна-паркавы ансамбль у в. Новае Поле”, “Раўбічы. Гісторыя і сучаснасць”.

У гарпасялковай бібліятэцы-філіяле г. п. Радашковічы Маладзечанскага раёна прайшоў гістарычны бенефіс “Мой посёлок накануне юбилеев”, прысвечаны 470-годдзю першага

ўспаміна Радашковіч як горада і 450-годдзю атрымання Радашковічамі Магдэбургскага права. На мерапрыемстве бібліятэкары распавядалі аб новых фактаграфічных звестках, датах, імёнах. Расказалі пра нараджэнне горада, яго станаўленне, аб вяльможах і простых жыхарах, пачынаючы з XV-га стагоддзя і заканчваючы XX-м. Не маглі пакінуць без увагі і 40-годдзе аб’яднання “Белмастацкераміка” – аднаго з градаўтвараючых прадпрыемстваў. На мерапрыемства быў запрошаны былы яго загадчык Кладаў Мікалай Аляксандравіч. Мерапрыемства суправаджала выстава-інсталяцыя керамічных вырабаў “Ганчарны звон”, экспанаты для якой збіралі з дапамогай прадпрыемства і чытачоў.

На базе ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы” адбылася навукова-практычная канферэнцыя “Нясвіжчына: аб мінулым для будучага”, прысвечаная гісторыі і культуры Нясвіжчыны.

Году малой радзімы была прысвечана праца над праектам “Лёсам з Нясвіжчынай”. Дадзены праект накіраваны на фарміраванне пазнавальнай актыўнасці і цікавасці да гісторыі сваёй малой радзімы праз выяўленне і знаёмства з жыццём і дзейнасцю выдатных людзей, лёс якіх цесна пераплёўся з гісторыяй Нясвіжчыны. У рамках праекта былі праведзены партрэтныя інтэрв'ю “Лёс чалавека” са значнымі для Нясвіжа асобамі.

У Мар’інагорскай гарадской бібліятэцы ўзяў старт літаратурна-краязнаўчы марафон “Мне па сэрцу маленькая Радзіма, мне па сэрцу мой любімы край”, прысвечаны 95-годдзю з дня ўтварэння раёна.

Да Году малой радзімы і 95-годдзю ўтварэння Салігорскага раёна ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка” быў распрацаваны і паспяхова рэалізоўваўся новы тэкстыльны арт-праект “Мягкая Родина” –вялікі пазл з прыбраных каляровых рэгіёнаў, пашыты рукамі бібліятэкараў, які ператвараецца ў інтэрактыўнае дзеянне.

На свяце, прысвечаным 95-годдзю Салігорскага раёна, Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка прадставіла

літаратурную пляцоўку “Шчасце жыць на роднай зямлі”. Салігарчанам і гасцям свята бібліятэкары прапаноўвалі прыняць удзел у паэтычным марафоне “Салігоршчына ў вершах”, віктарыне “Моўныя скарбы роднага краю”, з дапамогай кубікаў-пазлаў скласці “Сімвалы роднага краю”, стварыць карту Беларусі з аб'ёмных частак мазаікі “Мягкая Родина”.

Актыўна працаваў радыёуніверсітэт “Зямля мая, любоў мая” у ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка”. Радыёгутаркі знаёмілі з юбілейнымі краязнаўчымі датамі, жыццём і дзейнасцю знакамітых землякоў, гістарычнымі падзеямі Случчыны. У 2019 годзе ўвазе радыёслухачоў прапанавана 31 радыёгутарка рознай тэматычнай накіраванасці.

Зямля Міншчыны заўсёды славілася сваімі таленавітымі людзьмі, таму вялікая ўвага надаецца **папулярызацыі творчасці самадзейных мясцовых аўтараў**.

У Год малой радзімы ў ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева” правялі творчыя сустрэчы чытачоў з барысаўскім паэтам Андрэем Ніканчыкам, з членам Барысаўскага літаратурнага аб'яднання “Натхненне” Людмілай Валасевіч, з членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Лёлей Багдановіч; з паэтам-песеннікам Уладзімірам Рудзікам, з барысаўскай паэткай, пісьменніцай і журналісткай Аленай Брыцкой, з таленавітым паэтам, выхадцам з г. Барысава Аляксандрам Быкавым, з сучасным беларускім пісьменнікам, ураджэнцам г. Барысаў Кірылам Стаселькам, Янкам Лайкавым і інш.

У Бярэзінскім раёне масштабна прайшоў месячнік літаратурнага краязнаўства “Літаратура з правінцыяльнай прапіскай” з цыклам бібліятэчных мерапрыемстваў, прысвечаных творчасці пісьменнікаў-землякоў. Цэлы месяц, на працягу лістапада, наведвальнікаў раённай бібліятэкі і цэнтра культуры радавала прадстаўленая ў фае ўстановы літаратурна-мастацкая экспазіцыя “Літаратурнае сузор’е Бярэзіншчыны”.

Аддзел абслугоўвання Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі прапанаваў літаратурны круіз па творчасці

пісьменнікаў-землякоў, прэзентацыю кнігі бярэзінскага пісьменніка-фантаста А. Бычкоўскага “Ахвяры натхнення” цыкла “Пісьменнік жыве сярод нас”.

“Акрамя любімай Беларусі, мне зусім не трэба той Парнас…” – пад такой назвай у ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік” адбылася літаратурная вечарына памяці да 105-годдзя з дня нараджэння Г. А. Новік.

Яркай падзеяй у ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” стала прэзентацыя паэтычнага зборніка Анатоля Прыстаўкі “Строка, прошедшая сквозь сердце”.

Завяршыўся Год малой радзімы ў ДУ “Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” VIII Койданаўскімі чытаннямі. Для тых, хто вырашыў падзяліцца сваімі здабыткамі на ніве даследчай работы, была прапанавана агульная тэма для паведамленняў – “Малая радзіма ў гістарычным вымярэнні”.

У ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі” была праведзена літаратурна-музычная кампазіцыя “З мелодый вытканы радок” з нагоды 115-годдзя з дня нараджэння паэта-песенніка і музыканта Адама Русака.

Да 80-годдзя з дня нараджэння паэта-земляка В. Макарэвіча ДУК “Крупская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Купалы” правяла літаратурную гадзіну “Малюю вершам родны край”, да 75-годдзя паэта-земляка П. Талкачова – вечар-партрэт “Адчуваю зайдрасць да жыцця”.

У Янушкавіцкай сельская бібліятэцы Лагойскага раёна адбылася прэзентацыя гісторыка-публіцыстычнай кнігі пісьменніцы Галіны Каржанеўскай “Лагойшчына. Голас памяці”.

На вечары паэзіі “Ты самы прыгожы мой краю, цябе гэтым вершам вітаю”, які адбыўся ў Завішынскай сельскаяй бібліятэцы Лагойскага раёна, прагучалі вершы нашых паэтаў-землякоў Я. Купалы, Н. Гілевіча, В. Максімовіча, М. Лешчуна, Г. Каржанеўскай, В. Бурага, Т. Крэнь пра Лагойшчыну.

“Жыццё, звязанае словам” – пад такой назвай на базе ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка” адбылася творчая

сустрэча пісьменнікаў Мінскай вобласці. Дэлегацыю ўзначаліла старшыня абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Быкава Святлана Анатольеўна.

На творчую сустрэчу ў бібліятэку ДУ “Мінскі РЦК” Мінскага раёна і ў Гатаўскую сельскую бібліятэку-клуб Мінскага раёна завітала вядомая беларуская пісьменніца Кацярына Хадасевіч-Лісавая, якая пазнаёміла прысутных са сваімі творамі, што прасякнуты атмасферай казкі і чараўніцтва, з неверагоднымі прыгодамі, якія адбываюцца з героямі кніг.

У бібліятэках Мінскага раёна прайшлі сустрэчы з Ірынай Аляксандраўнай Карнаухавай, пісьменніцай, музыкантам, літаратарам, членам беларускага саюза музычных дзеячаў і Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Дзень памяці Максіма Багдановіча “Струменіцца Максімава крынічка” супрацоўнікі ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча” правялі ў “Фальварку Ракуцёўшчына”,

Працягвала свае маршруты і акцыя “Маладзечаншчына літаратурная – 2019”, якая прайшла праз вёску Выверы. На сустрэчу з вучнямі і настаўнікамі Выверскага вучэбна-педагагічнага комплекса завіталі пісьменнікі Тамара Аўсяннікава, Лідзія Гардынец, Тамара Бярэзіна і Міхась Казлоўскі.

Літаратурная гадзіна “Я да цябе прапісаны, мой край” у Нарацкай сельскай бібліятэцы Мядзельскага раёна была прысвечана паэту-земляку Міколу Шабовічу.

У ДУ “Мядзельская раённая бібліятэка імя Максіма Танка” адбылася творчая сустрэча з паэтамі-землякамі Міколам Шабовіч і Аляксандрам Быкавым.

У Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэцы ім. П. Пранузы адбыўся IV фестываль паэзіі імя П.Пранузы “Голасам свайго пакалення”.

Дружненскай дзіцячай бібліятэкай Пухавіцкага раёна было арганізавана і праведзена літаратурнае свята пад назвай “Пухавіцкі край ў кнігах Алеся Карлюкевіча”.

У ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка” прайшоў літаратурны тыдзень “Максім Лужанін – талент ад роднай зямлі”, прысвечаны 110-годдзю з дня нараджэння пісьменніка-земляка.

У Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэцы адбылася творчая сустрэча з З. І. Падліпскай, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтам, публіцыстам, перакладчыкам, даследчыкам сучаснай паэзіі, дырэктарам Цэнтра праваслаўнага краязнаўства і нацыянальнальнай культуры Сінадальнага аддзела рэлігійнай адукацыі і катэхізацыі Беларускага экзархата, ураджэнкай Случчыны.

У 2019 годзе адбыліся XII Віткаўскія чытанні “Па закліку сапраўднай любові”, прымеркаваныя да 108-й гадавіны з дня нараджэння Васіля Віткі.

Ва ўрачыстым адкрыцці XII Віткаўскіх чытанняў прынялі ўдзел галоўны рэдактар часопіса “Вясёлка” Уладзімір Ліпскі і супрацоўнікі рэдакцыі Анастасія Радзікевіч, Радміла Казлякевіч і Вікторыя Ляйкоўская, якая друкуе свае творы пад псеўданімам Віка Трэнас. Да школьнікаў з прывітальным словам звярнуўся Уладзімір Ліпскі. Чытачы бібліятэкі ў сваю чаргу пачыталі гасцям вершы беларускіх паэтаў. Танцавальны падарунак усім прысутным падрыхтавалі вучні гімназіі №2, удзельнікі раённага конкурсу “Вясновы вальс”.

У рамках чытанняў адбылося свята вуліцы Васіля Віткі, арганізаванае Дзяржаўнай установай “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка”і ДУА “Сярэдняя школа №11 г. Слуцк”. Для гасцей і жыхароў былі адрыхтаваны лялечна-гульнёвая праграма “Урокі Васі Вясёлкіна», кніжная выстава “Паэт. Казачнік. Настаўнік”, літаратурная сустрэча з членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Ганнай Міклашэвіч. А яшчэ ў госці да жыхароў мікрараёна завіталі вядомы віткаўскі персанаж Вася Вясёлкін і Васілінка, якія загадвалі дзецям загадкі, вялі дыялог пра творчасць пісьменніка. Школьнікі чыталі вершы, прадэманстравалі свае веды аб літаратурных персанажах паэта ў конкурсе малюнкаў на асфальце. Свята

ўпрыгожылі шоу мыльных бурбалак, паказальныя выступленні байцоў клуба «Фенікс» і спартыўныя забавы.

У 2019 г. ва ўсіх бібліятэках вобласці адзначаліся наступныя падзеі:

**Дзень роднай мовы:** урок беларусазнаўства "Які гэта цуд, мова мая родная" (сельская бібліятэка № 24 в. Кішчана Слабада Барысаўскага раёна, тыдзень беларускай мовы "Час чытаць на роднай мове" (сельская бібліятэка № 39 в. Перасады Барысаўскага раёна), літаратурная гульня "Родная мова – цудоўная мова" (сельская бібліятэка № 41 в. Зорычы Барысаўскага раёна), тыдзень беларускай мовы "Прыгарніся да роднага слова" (ДУК "Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка"), урок беларусазнаўства "Роднай мовы спадчына жывая" (Багушэвіцкая сельская інтэграваная бібліятэка-клуб Бярэзінскага раёна); акцыі для школьнікаў "Я размаўляю з бацькамі па-беларуску", "Твае першыя кніжкі па-беларуску" (Брадзецкая сельская інтэграваная бібліятэка-клуб Бярэзінскага раёна), акцыя "Размаўляем па-беларуску" (ДУК "Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік"); віктарына "Мова нанова" (Даўгінаўская і Людвіноўская сельскія інтэграваныя бібліятэкі Вілейскага раёна); літаратурныя чытанні "Любі і ведай родную беларускую (Любанская сельская бібліятэка Вілейскага раёна); урок беларусазнаўства "Шануй роднае слова" (Іжская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), гульнёва-пазнавальная праграма "Прыгарніся да роднага слова" (Валмянская інтэграваная сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна), тыдзень беларускай мовы "Гаворым па-беларуску" (ДУ "Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка"), лінгвістычная гульня "Знаўцы роднай мовы" (Клецкая дзіцячая бібліятэка), дзень роднай мовы "Твае першыя кніжкі па-беларускі" (Сякерыцкая сельская бібліятэка Клецкага раёна), пазнавальная гадзіна "Беларус, роднай мовы сваёй не цурайся" (Даматканавіцкая сельская бібліятэка Клецкага раёна), гульня-віктарына "Таямніца беларускіх слоў" (Ардзянская сельская бібліятэка-клуб Клецкага раёна), свята "Святло роднай мовы" (Зубкаўская

сельская бібліятэка Клецкага раёна), гадзіна аховы роднай мовы“ Шануйце роднае слова” (Лагойская цэнтральная бібліятэка), дзень беларускай мовы “Святло роднай мовы” (Акцябрская сельская бібліятэка Лагойскага раёна), Тыдзень беларускай мовы, турнір знаўцаў “Размаўляй са мной па-беларуску!” (Завішынская сельская бібліятэка Лагойскага раёна), вусны часопіс “Шануйце родную мову” (Астрошыцкая сельская бібліятэка Лагойскага раёна), падарожжа ў гісторыю “Мова пявучая, родная мова, ты – уладарка нявызнанных скарбаў” (Гасцілавіцкая сельская бібліятэка Лайгоскага раёна), гадзіна роднай мовы “Наша мова жывая, як вада” (Калачаўская сельская бібліятэка Лагойскага раёна), моўная скарбонка “Слова жывое, роднае, гаваркое” (Сямкоўская сельская бібліятэка Лайгойскага раёна), раённы конкурс-віктарына “Размаўляем па-беларуску” (ДУК “Любанская цэнтральная раённая бібліятэка”), літаратурна-музычная гасцёўня “Гучы, родная мова” (Бібліятэка ДУ “Мінскі РЦК” Мінскага раёна), гадзіна роднай мовы “Любім родную беларускую мову” (Вішнёўская інтэграваная сельская бібліятэка Мінскага раёна), свята “Любім і ведаем родную, беларускую мову” (Ждановіцкая сельская бібліятэка Мінскага раёна), флэш-моб “Сваёю моваю я ганаруся” (Баярская сельская бібліятэка-дом вольнага часу Мядзельскага раёна), літаратурная вітрына “І прыгожа льецца па прасторы слова беларускай мовы” (Пузыроўская сельская бібліятэка-дом вольнага часу Мядзельскага раёна), гульня-віктарына “Таямніцы беларускіх слоў” (Сваткаўская сельская інтэграваная бібліятэка Мядзельскага раёна), акцыя “Размаўляй са мной па-беларуску” (Княгінінская сельская інтэграваная бібліятэка Мядзельскага раёна), літаратурная замалёўка “Як званочак гучыць наша мова” (Нарацкая пасялковая бібліятэка Мядзельскага раёна), акцыя “Размаўляй са мной па-беларуску”, эрудыт-шоў “Мова цікавая і займальная” (ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы”), дзень мовы “Беларус, роднай мовы сваёй не цурайся” (Грыцкевіцкай інтэграванай сельскай бібліятэкай Нясвіжскага раёна), літаратурна-забаўляльная

гульня “Не проста ў словы я гуляю – на роднай мове размаўляю” (Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка), свята беларускага фальклора “Экскурс у родную мову” (Пухавіцкая раённая дзіцячая бібліятэка), літаратурна-музычная кампазіцыя “Мелодыя роднага слова” (Дрычынская сельская інтэграваная бібліятэка Пухавіцкага раёна), урок беларусазнаўства “Які гэта цуд – мова мая родная” (Блонская сельская бібліятэка Пухавіцкага раёна), гадзіна паэзіі “Мове маёй не збяднець аніколі…” (Дружненская дзіцячая бібліятэка Пухавіцкага раёна), акцыя “Гаворыць сэрца мовай песняроў” (ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”), літаратурна-музыкальная кампазіцыя “Слова роднае – вечнасці след” (Старобінская гарпасялковая бібліятэка Салігорскага раёна), літаратурная кампазіцыя “Любім і ведаем родную беларускую мову” (Клянніцкая сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), вечарына беларускай мовы “О, мова беларуская мая!” (Пятровіцкая сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), інфармацыйная гадзіна “Святло роднай мовы” (Прылепская сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), літаратурныя старонкі “Дала мне маці мову гэту” (Азярыцкаслабадская сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), гадзіна паэзіі “Ручай крыштальны мовы роднай” (Забалоцкая сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), інтэлектуальная гульня “Мова родная” (Драчкаўская сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), Дзень роднай мовы “Мова мая – ты жывая крыніца”, конкурс знаўцаў беларускай мовы і літаратуры “Таямніцы беларускіх слоў” (Залужская сельская бібліяэка Стаўбцоўскага раёна), парад беларускіх пісьменнікаў “Мовы нашай вартавыя” (Каралёўская сельская бібліятэка Уздзенскага раёна), паэтычны флэшмоб “Дала мне маці гэту мову, як спадчыну і запавет” (Зенькавіцкая сельская бібліятэка Уздзенскага раёна), паэтычны ланцужок “Мова – калыска мая…”, літаратурныя гонкі “Чытаем услых” (Нёманская сельская бібліятэка Уздзенскага раёна), гульня-крыжаванка “Любі, шануй і ведай роднае слова” (Азерская сельская бібліятэка Уздзенскага раёна), конкурс перакладчыкаў “Жывая

спадчына” (Кухціцкая сельская бібліятэка Уздзенскага раёна), гучныя чытанні “Роднаму слову – быць” (Камянкоўская сельская бібліятэка Уздзенскага раёна).

**Дзень беларускага пісьменства:** гутарка “Не знікне цуд прыгожага пісьменства” (сельская бібліятэка-клуб № 8 в. Вялікая Ухалода Барысаўскага раёна), інфармацыйная гадзіна “Ад мінулага да сучаснага нас вядзе друкаванае слова” (сельская бібліятэка № 45 в. Стара-Барысаў Барысаўскага раёна), гадзіна гісторыі “Ад першадрукара Скарыны да сучаснай беларускай кнігі” (Ільянская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), урок беларусазнаўства “Жыві, наша Слова!” (Вілейская раённая бібліятэка), свята “Дзень славянскай пісьменнасці і культуры” (Баравікоўская інтэграваная сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна), інтэлектуальная віктарына “Ля вытокаў слова і кнігі” (Грычынская сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна), галерэя гістарычных асоб “Галасы з даўніх вякоў: Кірыла Тураўскі, Еўфрасіння Полацкая, Сымон Будны” (Энергетыкаўская сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна), свята “Беларуская кніга: шляхам стагоддзяў” (ДУК “Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка”), Тыдзень беларускага пісьменства і друку (ДУК “Крупская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Купалы”), падарожжа ў гісторыю “Аз да буки – основа науки” (Коласаўская сельская бібліятэка Крупскага раёна), экскурс у гісторыю “Таямніцы выцвілых радкоў” (Ухвальская сельская бібліятэка Крупскага раёна), інфармацыйная гадзіна “Шлях да пісьменнасці”, прагляд літаратуры “Асветнікі беларускай зямлі”, віктарына “Ад Скарыны да нашых дзён” (Акцябрская сельская бібліятэка Лагойскага раёна), гістарычны экскурс “Волаты слова народнага” (Сямкоўская сельская бібліятэка Лагойскага раёна), свята “Духоўная кніга – крыніца вялікай мудрасці” (Завішынская сельская бібліятэка Лагойскага раёна), гістарычная вандроўка “Адкуль да нас прыйшла кніга” (Каменская сельская бібліятэка Лайгоскага раёна), літаратурная арбіта “З кнігай праз стагоддзі” (Асавецкая сельская бібліятэка Любанскага раёна), гутарка-разважанне

“Давай ганарыцца, што мы беларусы” (Малагарадзяціцкая сельская бібліятэка Любанскага раёна), дзень ведаў “Слова вылітае з бронзы” (Рачэнская сельская бібліятэка Любанскага раёна), літаратурны набат “Слова, што адкрыла свет” (Кузьміцкая сельская бібліятэка Любанскага раёна), краязнаўчы ўрок “Ажываюць гісторыі старонкі” (Рэдкавіцкая сельская бібліятэка Любанскага раёна), гадзіна краязнаўства “Светачы зямлі беларускай” (Вішнеўская інтэграваная сельская бібліятэка Мінскага раёна), Дзень беларускага пісьменства “Надрукаванае застаецца”, пазнавальны пазл “Гэты цудоўны свет кніг” (ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча”), гістарычны віраж “Пісьменства – крыніца культуры і духоўнасці народа” (ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы”), інфармацыйна-адукацыйную гадзіну “BOOK-дыліжанс. Падарожжа па краіне беларусаў” (Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка), літаратурная гадзіна “Мова нашага народа” (Рудзенская гарпасялковая бібліятэка Пухавіцкага раёна), віртуальнае падарожжа “Ля вытокаў пісьменства” (Пухавіцкая сельская бібліятэка), тыдзень беларускага пісьменства і друку “Каб стала вечным наша Слова!” (ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка”), інфармацыйная гутарка “Пачынальнікі беларускага пісьменства” (Алесінская сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), гадзіна пазнання “Веліч слова славянскага” (Забалоцкая сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), тыдзень беларускага пісьменства і друку “Вечны голас роднага слова” (ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка”), віртуальнае падарожжа “Гісторыя беларускай кніжнасці” (Церабуцкая сельская бібліятэка Старадарожскага раёна), храналагічны рэпартаж “На світанку кнігадрукавання”, гадзіна даследавання “Паслядоўнікі Скарыны” (Падарэская сельская бібліятэка Старадарожскага раёна), віртуальнае падарожжа “Белорусские первопечатники и просветители” (Залужская сельская бібліятэка-клуб Старадарожскага раёна), літаратурнае падарожжа “Адкуль да нас прыйшла кніга” (Горкаўская сельская бібліятэка

Старадарожскага раёна), паэтычны лабірынт "Каб бацькоўская мова непаўторнаю кветкай цвіла" (Шапчыцкая сельская бібліятэка-клуб Старадарожскага раёна).

**75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў:**

У ДУК "Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка" быў праведзены Тыдзень мужнасці і памяці "Маладым ведаць – ветэранам памятаць", які ўключаў акцыю гонару "Ветэраны – маякі памяці", якую ўвянчала вечарына ажыўшых біяграфій "Лёсы, апаленыя вайной". Ажылі маленькія хронікі лёсаў землякоў-ардэнаносцаў Вялікай Айчыннай вайны, якія заплацілі даніну вайне сваімі лепшымі гадамі. Фатаграфіі часоў вайны былі прадстаўлены прэзентацыяй "Землякі – нашага жыцця маякі".

Бібліятэкары ДУК "Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка" падрыхтавалі гісторыка-патрыятычную гадзіну "Подзвігу народа – жыць у вяках!". Мерапрыемства суправаджала электронная прэзентацыя, з дапамогай якой прысутныя пазнаёміліся з гістарычнымі помнікамі, размешчанымі на тэрыторыі Валожынскага раёна.

У ДУК "Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" быў прэзентаваны мультымедыйны расказ-рэквіем "Сёстры Хатыні", прысвечаны 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Дню памяці трагедыі Хатыні. Удзельнікі сустрэчы пачулі і ўбачылі гісторыю знішчэння вёсак Дзяржыншчыны, якія раздзялілі лёс Хатыні: Глухое Пярхурава, Літавец, Любажанка, Садкаўшчына і Скірмантава, а таксама пазнаёміліся з гісторыяй стварэння мемарыяльнага комплексу "Літавец" – сімвала трагедыі і мужнасці, гісторыі малой радзімы.

Супрацоўнікамі аддзела абслугоўвання Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэкі імя А. Астрэйкі праведзены героіка-патрыятычны час "Раўненне на Героя" – да 105-годдзя з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза, ураджэнца в. Доктаравічы А. Р. Таўпекі; урок памяці аб спаленых вёсках Капыльшчыны "Абпаленыя лёсы".

Песачанская сельская бібліятэка Капыльскага раёна правяла краязнаўчую гадзіну “Вёска Пясочнае ў гады Вялікай Айчынай вайны”.

Тэме 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, прысвечаны праведзеныя Бобрскай гарпасялковай бібліятэкай Крупскага раёна хвіліна мужнасці “Гісторыя вайны ў гісторыі маёй сям’і”, Крупскай сельскай бібліятэкай Крупскага раёна гадзіна памяці “Землякі: імёны і лёсы“, Дакудаўскай сельскай бібліятэкай-клубам Крупскага раёна гадзіна краязнаўства “Уклад нашых землякоў у вызваленне Беларусі”, Узнацкай сельскай бібліятэкай-клубам Крупскага раёна гадзіна краязнаўства “Лёсы, апалены вайной” .

Гістарычная гадзіна “Лагойшчына партызанская” адбылася ў Янушкавіцкай сельскай бібліятэцы Лагойскага раёна.

Краязнаўчы ўрок “Сталі героямі Лагойскай зямлі” бібліятэкар Завішынскай сельскай бібліятэцы Лагойскага раёна прысвяціла Героям Савецкага Саюза – ураджэнцам Лагойшчыны.

Гадзіна гісторыі “Нашы землякі ў гісторыі вызвалення Беларусі” прайшла ў Акцябрскай сельскай бібліятэцы Лагойскага раёна.

Краязнаўчая тэматыка нашла сваё адлюстраванне ў мерапрыемстваў прысвечаных 75-годдзю вызвалення Случчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў: краязнаўчы маршрут “Легендарная улица имени маршала Жукова”, ганаровы літаратурны стэнд “Слава вызваліцелям Случчыны” (аддзел абслугоўвання і інфармацыі чытачоў Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі), патрыятычная хроніка “В боях за край слутчанский” (Гацукоўская сельская бібліятэка-філіял №12 Слуцкага раёна), аповед-хроніка ваенных гадоў “Нам жыць і помніць: Грэскае партыйна-камсамольскае падполле” (Грэская сельская бібліятэка-філіял №14 Слуцкага раёна), гадзіна гісторыі “Вогненыя гады на зямлі случчанскай” (Казловіцкая сельская бібліятэка-філіял №19 Слуцкага раёна), патрыятычная панарама “Нашы землякі – удзельнікі Слуцкага падполля”

(Навадворцаўская сельская бібліятэка-філіял №30 Слуцкага раёна).

ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка” быў праведзены ўрок краязнаўства “Іх імёнамі названы вуліцы г.Чэрвеня”.

Ва ўсіх бібліятэках Мінскай вобласці матэрыялы краязнаўчага характару накапліваюцца і сістэматычна папаўняюцца новымі звесткамі ў папках-дасье. Кнігі краязнаўчага характару, тэматычныя папкі і іншыя матэрыялы шырока прадстаўлены **ў інфармацыйна-краязнаўчых кутках, на кніжных выставах і паліцах**: “Родная зямліца – шчасця крыніца” (Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка), “Такая яна, зямля мая!”, “Люблю цябе, мая Радзіма!” (Людвіноўская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), “Зямля мая, край маляўнічы” (Іжская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), “Куточак радзімы маёй” (Вязынская сельская бібліятэка Вілейскага раёна), “Наш край у мінулым” (Партызанская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), “Чурлёнскай зямлі адважныя сыны!” (Чурлёнская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), “Сэрца імкнецца да роднага краю”, “Навукоўцы зямлі валожынскай” (ДУК “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка”), “Ад сучаснасці да мінулага” (Сугваздаўская бібліятэка-клуб Валожынскага раёна), “Валожыншчына – мой родны край”, “Родам з ракаўскага краю” (Ракаўская сельская бібліятэка Валожынскага раёна), “Край мой – гонар мой” (Пяршайская сельская бібліятэка Валожынскага раёна), “Слова аб родным краі” (Дорская сельская бібліятэка Валожынскага раёна), “Веліч роднай зямлі” (Скірмантаўская сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна), “Вёска мая, я часцінка твая!” (Быстрыцкая сельская бібліятэка Капыльскага раёна), “Мой край беларускі, старонка мая!” (Браткаўская сельская бібліятэка-клуб Капыльскага раёна), “Люблю наш край, старонку гэту...” (Лясноўская сельская бібліятэка Капыльскага раёна), “Таленты роднай зямлі” (Жаліхаўская сельская бібліятэка Капыльскага раёна),

“Гісторыя шматгадовая і багатая” (Лагойская цэнтральная бібліятэка), “Люблю цябе, мой родны край ” (Астрошыцкая сельская бібліятэка Лагойскага раёна), “Край мой, мае землякі” (Засоўеўская сельская бібліятэка-клуб Лагойскага раёна), “Край мой – зямля Лагойская” (Завішынская сельская бібліятэка), “Мой родны, непаўторны край” (Акцябрская сельская бібліятэка Лагойскага раёна), “Жыву і дыхаю, мой родны край табою” (Обчынская сельская бібліятэка Любанскага раёна), “Знакамітыя землякі Любаншчыны” (Забалацкая сельская бібліятэка Любанскага раёна), “Краем сваім ганарымся “, “Карані рода твайго”, “Дом там, где твоё сердце” (ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”), “Тут Радзіма мая, тут жыву я”, “Зямля пад белымі крыламі” (Лескаўская сельская бібліятэка Мінскага раёна), “Зямля бацькоў – зямля святая" (Занарацкая сельская бібліятэка Мядзельскага раёна), “Зямля, што нам дадзеная лёсам” (Сваткаўская сельская інтэграваная бібліятэка Мядзельскага раёна), “Людзьмі і памяццю жыве мой край”, “О, край мой родны, край прыгожы”, “Датуль завёмся мы народам, пакуль шануем карані”, “Былое і сучаснае Пухавіцкай зямлі”, “Беларусь – навекі маладая, ганарлівая адвагай даўніны”, “Пухавіччына – цудоўная старонка. Квітней, красуй пад дабрачынным небам” (Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка), “Всему начало здесь – в краю родном” (Драчкаўская сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), “Зямля, дзе ўтульна сэрцу” (Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча), “Зямля бацькоў” (Пятровіцкая сельская бібліятэка Смалявіцкага раёна), “У тым краі, дзе ты жывеш”, “З малой радзімы пачынаецца краіна”, “Край мой – Старадарожчына” (ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка”), “Мой родны кут - мой клопат і мой лёс (Любкаўшчынская сельская бібліятэка Стаўбцоўскага раёна), “Ёсць на зямлі такі куток, мая радзіма Чэрвеньшчына” (ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка”).

У справаздачным годзе шэраг сельскіх бібліятэк вобласці прынялі ўдзел у арганізацыі і правядзенні **традыцыйных свят**

**вёсак**, забяспечваючы пошукавую і інфармацыйную частку мерапрыемства: свята вёсак Бакунькі, Кумельшчына “Песні, што кранаюць сэрца” (Сцешыцкая сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), свята вёскі Баранцы “Поклон селу и людям, в нём живущим” (Шылавіцкая сельская бібліятэка Вілейскага раёна), свята вёскі Каралеўцы “Няма ў свеце месца прыгажэй”, святы вёскі Слабада “Мілы куточак радзімага краю”, свята аграгарадка Іжа “І роднай вёсцы пакланюся” (Іжская сельская інтэграваная бібліятэка Вілейскага раёна), свята вёскі Кляноўка “Новае жыццё на графскіх руінах” (Станькаўская сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна), свята вёсак Цюхаі і Дзянісаўшчына (Скірмантаўская сельская бібліятэка Дзяржынскага раёна), свята вёскі Вароніна “Мая вёска – гонар мой” (Грыцэвіцкая сельская бібліятэка Клецкага раёна), свята вёскі Заляшаны “Пусть радость приходит в каждый дом”, свята вёскі Жомайдзь “Деревенька моя, деревенька родная” (Кухчыцкая сельская бібліятэка Клецкага раёна), свята вёскі Бабкі “И нет на свете милее края” (Галынкаўская сельская бібліятэка Клецкага раёна), свята вёскі Цецеравец “Старонка родная мая” (Лазавіцкая сельская бібліятэка Клецкага раёна), свята пасёлка Рассвет “Тут жыве майго сэрца часцінка…” (Рассветаўская сельская бібліятэка Клецкага раёна), свята вёскі Кукавічы (Вялікараёўская сельская бібліятэка-клуб Капыльскага раёна), свята вёскі Пясочнае (Песачанская сельская бібліятэка Капыльскага раёна), свята вёскі Янушкавічы “Жыве мая вёска” (Янушкавіцкая сельская бібліятэка Лагойскага раёна), свята вёскі “Вёсачка мая – мая чараўніца” (Вялікасліўская бібліятэка-клуб/філіял №11 Слуцкага раёна), свята вёскі “Мой родны кут, як ты мне мілы” (Церабуцкая сельская бібліятэка Старадарожскага раёна), “Квітней мая вёска” (Горкаўская сельская бібліятэка Старадарожскага раёна), свята вёскі Іванаў Бор “Сэрцу мілая старонка, вёсачка любая мая” (Камянкоўская сельская бібліятэка Уздзенскага раёна), свята вескі Карпілаўка “Я тут жыву, і край мне гэты мілы” (Кліноцкая бібліятэка-клуб Чэрвеньскага раёна).

Для захавання і папулярызацыі культурнай і гістарычнай спадчыны роднага краю пры бібліятэках вобласці працягваюць дзейнічаць **краязнаўчыя клубы, гурткі і аб'яднанні**: "Землякі" (Багушэвіцкая сельская інтэграваная бібліятэка Бярэзінскага раёна), "Зямля пад белымі крыламі" (Івянецкая гарпасялковая бібліятэка Валожынскага раёна), "Сузор'е" (Ракаўская сельская бібліятэка Валожынскага раёна), "Спадчына" (Дорская сельская бібліятэка Валожынскага раёна), "Выток", "Койданаўскія летапісцы" (ДУ "Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"), "Вытокі" (Крупская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я.Купалы), "Каласавічок" (Коранская сельская бібліятэка Лагойскага раёна), "Купалінка" (Завішынская сельская бібліятэка Лагойскага раёна), "Рунь" (Лагойская цэнтральная раённая бібліятэка), "Сябрына" (Плешчаніцкая гарпасялковая бібліятэка Лагойскага раёна), "Спадчына" (сельская бібліятэка аг. Краснае Маладзечанскага раёна), "Натхненне" (сельская бібліятэка аг. Лебедзева Маладзечанскага раёна), "Нашчадкі" (Навасельская сельская бібліятэка Мінскага раёна), "Крыніца" (Заслаўская дзіцячая бібліятэка Мінскага раёна), "Спадчына" (Крупіцкая інтэграваная сельская бібліятэка Мінскага раёна), "Крыніца", "Арэскія вытокі" (ДУК "Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка"), "Краязнаўца" (ДУК "Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка"), "Нёманец" (ДУК "Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса"), "Спадчына" (Лашанская сельская бібліятэка Уздзенскага раёна), "Радзімічы" (Кухціцкая сельская бібліятэка Уздзенскага раёна).

### *Электронныя рэсурсы*

У справаздачным годзе бібліятэкі вобласці працягвалі папаўняць свае бібліяграфічныя **БД "Краязнаўства"** электроннага каталога. На канец года агульная колькасць краязнаўчых запісаў складае: у ДУК "Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік" – 4827, ДУК "Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна" – 24335, ДУ

“Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка” – 5358, Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка — 2895, ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка” – 5210, ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса” – 5502 і інш.

Працягваўся збор матэрыялаў для папаўнення **мясцовых баз і банкаў дадзеных уласнай генерацыі**: “Память Борисовщины”, “Слово краеведа”, “Вяртанне да вытокаў” (ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева”), “Жодиноведение” (ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна”),“Капыльшчына” (ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі”), “Пісьменнікі роднага краю”, “Прыродныя рэсурсы Клецкага раёна”, “Народныя традыцыі і абрады” (ДУ “Клецкая раённая цэнтральная бібліятэка”), “Памяць Мядзельшчыны”,“М. Танк” (ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка”), “Памятнымі мясцінамі Салігоршчыны”, “Солигорщина: вчера и сегодня” (ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”), “Памяць Старадарожчыны” (ДУК “Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка”), “Майстры роднага краю” (Старадарожская сельская бібліятэка Старадарожскага раёна).

У канцы справаздачнага года ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка” была распачата работа над стварэннем БД “Таленты ад роднай зямлі: знакамітыя навукоўцы”.

Да 75-годдзя вызвалення г. Жодзіна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна” сфарміравана электронная база дадзеных “Подпольное и партизанское движение в Жодино и Смолевичском районе”.

У 2019 годзе Вялікараёўская бібліятэка-клуб Капыльскага раёна стала працаваць па папаўненні электроннай базы дадзеных “Памяць Вялікай Раёўкі”.

ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка” падрыхтавала электронныя базы дадзеных “Любаншчына літаратурная” і “Навукоўцы любанскай зямлі”.

ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча” праведзена работа па напаўненні бібліяграфічнымі і фактаграфічнымі матэрыяламі БД “Краязнаўства”, у т. л. “Максім Багдановіч у Ракуцёўшчыне”,“Вязынка – калыска Купалы”.

Электронная краязнаўчая фактаграфічная картатэка “Памяць Міншчыны. Персаналіі. Пухавіцкі раён” Пухавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі ўключае ў сябе 195 персаналій і 722 бібліяграфічных запісаў.

Бібліятэкарамі Лучнікоўскай сельскай бібліятэкі-філіяла №7 Слуцкага раёна прадоўжана праца па папаўненні поўнатэкставых баз дадзеных “Лучнікоўскі летапіс” і “Случчанская хроніка”.

Дзіцячым аддзелам Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі фарміруецца краязнаўчая поўнатэкставая база дадзеных “Горад дзевяці стагоддзяў”.

У 2019 годзе ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева” былі падрыхтаваны віртуальныя выставы з размяшчэннем іх на сайце бібліятэкі: “Беларускі гістарычны кнігазбор”, “Жыцця загадкавы палёт. Да 70 годдзя з дня нараджэння Я. Янішчыц”, “Беларусь советская: 100 лет основания БССР”, “Жураўлі ляцяць... да 90-годдзя Алеся Ставера”, “Аляксандр Быкаў. Да 65-годдзя з дня нараджэння”.

ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна” створаны 9 электронных прэзентацый з цыклу “ЖЗЛ горада Жодзіна”: “Жодзіна мастацкі” (М. М. Анруковіч, У. В. Гладкевіч); “Жодзіна спартыўны” (М. І. Астапковіч, М. З. Элімелах, У. І. Тайнікаў); “Жодзіна музычны” (С. Э. Ждановіч); “Жодзіна навуковы” (І. М. Нікітчанка, А. І. Лаппо, А. А. Гайко).

Урэцкая гарпасялковая бібліятэка-філіял №1 Любанскага раёна падрыхтавала віртуальную выставу-агляд “Мой край, маё Урэчча”.

ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка” распрацаваны банк дадзеных “Мой край родной, моя история живая”, у якім

сабраны краязнаўчы матэрыял аб Мінскім раёне (гісторыя, сучаснасць, культура, адукацыя, прамысловасць і інш.).

У справаздачным годзе супрацоўнікамі ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка” падрыхтавана мультымедыйная прэзентацая “Салдаты Перамогі, ветэраны вайны – ураджэнцы і жыхары Мядзельшчыны”.

ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Пранузы” была створана мультымедыйная прэзентацыя, прысвечаная паэту-земляку С. Новіку-Пяюну пад назвай “Пясняр зямлі Нясвіжскай”.

На працягу года онлайн карыстальнікі ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка” маглі пазнаёміцца з віртуальнымі выставамі: “Трагедия войны в памяти народной” (да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў), “Честь. Долг. Дерзость” (да 120-годдзя з дня нараджэння В. З. Каржа), “Солигорский район – жемчужина Полесья” (да 95-годдзя з дня заснавання Салігорскага раёна), “Вярнуся ветрам…” (да 110-годдзя з дня нараджэння М. Лужаніна).

### *Выдавецкая дзейнасць*

У справаздачным годзе ДУК “Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка” падрыхтавала і выдала гісторыка-краязнаўчае выданне “Они проливали свою кровь и стояли насмерть за Родину”, навукова-папулярнае выданне ветэрана фізкультуры і спорту раёна Трусевіча Б. І. “Гісторыя фізкультуры і спорту Бярэзінскага раёна”, краязнаўчае выданне да 100-годдзя КПБ “Вместе с народом и в будни, и в праздники: коммунистическая партия Беларуси на Березинщине”, паэтычны зборнік Л. Ждамавай “Ранішняя раса”, “Календар знамянальных і памятных дат Бярэзіншчыны на 2020 год”.

У ДУК “Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік” у рамках праекта “Чытаем кнігі мясцовых аўтараў” выдадзены наступныя зборнікі твораў мясцовых аўтараў: Дубовік, К. І. “Фальварак Багданава – тут жыве сама гісторыя”,

Мякчыла, Б. А. "З крыніц роднай зямлі: зборнік вершаў", "Жыццё. Лёс. Памяць: да 105-годдзя з дня нараджэння Ганны Новік", Мароз, С. П. "Вяртанне да сябе".

ДУ "Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка" быў састаўлены і выпушчаны бібліяграфічны паказальнік "Літаратура аб Валожынскім раёне за 2018 год".

ДУ "Дзяржынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" падрыхтаваны і выдадзены тэматычны зборнік удзельнікаў літаратурнага клуба "Выток" "В каждой строке голос памяти", прысвечаны 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У выдавецтве "Четыре четверти" выдадзена другая частка кнігі "Солдаты Победы".

Распрацаваны і выдадзены шэраг метадычных матэрыялаў і рэкамендацый, прысвечаных вядомым асобам Дзяржыншчыны: "Вандроўнік па краіне Беларусь. Міхась Раманюк: метадычныя рэкамендацыі да 75-годдзя беларускага мастацтвазнаўцы і этнографа Міхася Раманюка"; "Гвардейский подвиг Николая Шарко: методические материалы к 95-летию со дня рождения Героя Советского Союза Н. Ф. Шарко"; "Жизнь и судьба Марата: методические материалы к 90-летию со дня рождения Героя Советского Союза М. И. Казея"; "Слово звало в бой: методические материалы к 105-летию Павла Никитича Хмелевского, одного из организаторов и руководителей Дзержинского патриотического подполья, комиссара партизанского отряда "Большевик"; "Неспокойное сердце Янины Бандак: материалы к 110-летию со дня рождения Героя Социалистического труда Янины Викентьевны Бандак" і г. д.

Распрацаваны і выдадзены шэраг інфармацыйных буклетаў, прысвечаных людзям навукі і мастацтва Дзяржыншчыны; матэрыялаў даследаванняў, закладак, лістовак, памятак, буклетаў і г. д.

За справаздачны год ДУК "Крупская цэнтральная раённая бібліятэка ім. Я. Купалы" выдадзены буклеты: "У сімвалах нашы карані"(аб сімвалах Крупскага раёна); "Легенды і

паданні Крупшчыны”; “Бібліятэкі Крупшчыны. Гісторыя і сучаснасць”(матэрыялы агляду-конкурсу на лепшы летапіс бібліятэкі); дапоўнены буклет “Цуды Крупшчыны”.

Працягвалася праца над стварэннем буклетаў з серыі “Знакамітыя людзі Крупшчыны”: “Руплівы сейбіт на ніве філалогіі” (да 65-годдзя з дня нараджэння мовазнаўцы, літаратуразнаўцы Старычонка В. Д.)

З серыі “Знакамітыя землякі-героі вайны” выдадзены буклеты: “Не зарастае памяць забыццём”(да 95-годдзя з дня нараджэння Лукашэвіча А. С.); “Па слядам вялікай мужнасці” (прысвечаны герою вайны Лютаму А. С.); “Хай золатам ззяюць імёны герояў”(прысвечаны Лыціну А. С.); “Пусть помнят живые, пусть знают потомки” (прысвечаны герою Сурыну М. А.) і “Мужнасці і стойкасці – вечнае слава” (да 75-годдзя з часу здзяйснення подзвігу І. А. Мазгавым) і інш.

Лагойскай цэнтральнай раённай бібліятэкай падрыхтаваны і выдадзены інфармацыйныя выданні: “Пашпарт Лагойскага раёна”, “Лагойшчына-2020: краязнаўчы каляндар”, “Каляндар знамянальных і памятных дат на 2020 год”, буклеты: з серыі “Землякі-юбіляры” – “Тышкевич Евстафий: к 195-летию со дня рождения”; з серыі “Пісьменнікі юбіляры” – “Абрысы лёсу: да 60-годдзя з дня нараджэння У. Мазго”, “Кругі надзеі і дабра: да 100-годдзя з дня нараджэння А. Асіпенкі”, “Люблю будзённы дзень: да 100-годдзя з дня нараджэння А. Дзеружынскага”, “ Паміж нябесным і зямным: да 70-годдзя з дня нараджэння Г. А. Каржанеўскай”,“Са шчырым пачуццём: да 90-годдзя з дня нараджэння Е. Лось”, “Святло зямных дарог: да 65-годдзя з дня нараджэння М. Мятліцкага”, “Творца ў часе і прасторы: да 75-годдзя з дня нараджэння З. Прыгодзіча”, “Я – акіяна жытняга калоссе: да 105-годдзя з дня нараджэння А. Куляшова”, “Я беларускаму слову малюся: да 80-годдзя з дня нараджэння У. Скарынкіна”.

У ДУК “Любанская раённая цэнтральная бібліятэка” штоквартальна выдаваўся анатаваны спіс “Любаншчына на старонках рэспубліканскага друку”. Падрыхтаваны зборнікі

вершаў “Любіць родны край” і “Натхненне малой радзімы” самабытнага паэта А. Вялічка.

ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка” падрыхтавала рэкамендацыйны паказальнік “95 – год з дня нараджэння Хведара Бачылы, камандзіра дыверсійнай групы Мінскага раёна”, інфармацыйныя бюлетэні “Аннополь на берегу реки”, “Заславль – древний город Беларуси”, “Игнатичи – старинная усадьба”, “Линия Сталина”, “Я эту землю Родиной зову. Михановичи”, “Новое Поле. Усадебно-парковый ансамбль”, “Спасо-Преображенская церковь”, “Дворец в Прилуках”, “История усадьбы в Сёмково”, “Лагерь смерти – Тростенец”.

ДУК “Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча” падрыхтаваны і выдадзены матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі да 85-годдзя А. Ліса, пісьменніка, фальклярыста, доктара філалагічных навук “Песня ў спадчыну”, краязнаўчы даведнік “Славутыя людзі Маладзечаншчыны” і інш.

Да юбілея народнага мастака Беларусі Васіля Пятровіча Шаранговіча, ураджэнца Мядзельшчыны ДУ “Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Танка” выдадзены буклет “З народу, з народам, народны…”.

ДУК “Нясвіжская цэнтральная раённая бібллятэка імя А. Пранузы” былі падрыхтавана брашура “Нясвіж – горад з гісторыяй”.

ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка” падрыхтаваны рэкамендацыйныя спісы літаратуры, прысвечаныя ўстановам і арганізацыям Салігорска і Салігорскага раёна: “ОАО “Стройтрест №3 Ордена Октябрьской революции”, “Хоккейный клуб “Шахтер”, “Волейбольный клуб “Шахтер”, “Футбольный клуб “Шахтер”.

У ДУ “Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка” былі падрыхтаваны інфармацыйна-бібліяграфічныя краязнаўчыя выданні: “Витольд Цераский – известный ученый-астроном и педагог: к 170-летию со дня рождения”, “Нясцерпны боль на ўсё жыццё: з гісторыі Слуцкага канцлагера”, “Слуцкі пояс – нацыянальная рэліквія Беларусі”.

ДУК “Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка” выдала паказальнік літаратуры да 200-годдзя ўраджэнца Чэрвеньскага раёна, знакамітага кампазітара Станіслава Манюшкі “Славутая замля славутых продкаў”.

## Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей

### *Асноўныя паказчыкі дзіцячых бібліятэк*

Сучасны інфармацыйны свет змяняецца літаральна на вачах, і гэтак жа імкліва мяняюцца чытацкія перавагі і інтарэсы юных чытачоў. Але кніга па-ранейшаму неабходная, бо яна адкрывае дзіцяці свет, вучыць суперажываць, спачуваць, радавацца. І задача дзіцячых бібліятэк – абудзіць, выхаваць і ўмацаваць у неакрэплай душы гэтую каштоўную здольнасць.

Бібліятэкі Мінскай вобласці, усведамляючы сваю важную ролю ў фарміраванні духоўна-маральнага светапогляду дзяцей і падлеткаў, надаюць дадзенай катэгорыі чытачоў асаблівую ўвагу.

Мінулы 2019 год працягваў праходзіць пад знакам **Года малой радзімы** і **75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

Таму прыярытэтным напрамкам у рабоце дзіцячых бібліятэк Міншчыны было выхаванне ў школьнікаў грамадзянскасці і патрыятызму, любові да Радзімы, да духоўнай спадчыны, роднай мовы, захаванне культурнай і гістарычнай спадчыны. А таксама належную ўвагу бібліятэкі па абслугоўванні дзяцей Мінскай вобласці надавалі арыентацыі дзяцей і падлеткаў на духоўныя і агульначалавечыя каштоўнасці, на распаўсюджванне краязнаўчых, прававых, экалагічных, эстэтычных ведаў, на паглыбленне ведаў аб здаровым ладзе жыцця, арганізацыю вольнага часу дзяцей, актыўна выкарыстоўвалі інавацыйныя формы прапаганды літаратуры сярод дзяцей і падлеткаў з мэтай павышэння цікавасці да кнігі і чытання.

Бібліятэчным абслугоўваннем дзіцячага і падлеткавага насельніцтва Мінскай вобласці ў справаздачным годзе займалася 20 дзіцячых бібліятэк.

Паслугамі публічных бібліятэк вобласці карысталася 152,8 тыс. чытачоў-дзяцей (у 2018 годзе – 152,4 тыс.; 2017 г. – 151,5 тыс.).

Чытачамі **дзіцячых бібліятэк** з'яўляліся 42,5 тыс.чалавек (у 2018 годзе – 46,3 тыс; 2017 годзе – 46,4 тыс.). Карыстальікам было выдадзена 709,7 тыс.экз.дакументаў (у 2018 годзе – 635,5 тыс.экз.; 2017 г. – 726,5 тыс.экз.).

Дзіцячы чытач складае 37,5% ад агульнай колькасці (408,1 тыс.) карыстальнікаў.

Дзяцей да 15 год налічвалася 37,7 тыс. (у 2018 годзе – 39,7 тыс.; 2017 г. – 40,3тыс.).

У склад карыстальнікаў дзіцячых бібліятэк, акрамя дзяцей да 15 гадоў, уваходзяць таксама бацькі, настаўнікі, вучні старэйшых класаў, студэнты.

З мэтай рэалізацыі дзяржаўнай бібліятэчнай палітыкі, накіраванай на захаванне і развіццё патэнцыялу сельскіх тэрыторый, у вобласці функцыяніруюць 269 бібліятэк аграгарадкоў, якімі далучана да чытання 44,6 тыс. дзяцей і падлеткаў (у 2018 годзе – 44,1 тыс.; 2017 г. – 43,9; у 2016 г. – 43,1 тыс.). Назіраецца павелічэнне колькасці чытачоў-дзяцей у аграгарадках.

Бібліятэкі вобласці імкнуцца павялічыць колькасць чытачоў шляхам стварэння ўмоў для максімальнага задавальнення чытацкіх запытаў.

У дзейнасці дзіцячых бібліятэк Мінскай вобласці галоўным прыярытэтам заставалася – далучэнне юных карыстальнікаў да чытання і бібліятэкі. Таму асаблівая ўвага надавалася выкананню прагнозных паказчыкаў Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2016-2020 гады, якая прадугледжвае штогадовы прырост колькасці наведванняў на 4%.

У 2019 годзе колькасць наведванняў у дзіцячых бібліятэках склала 385,3 тыс. (у 2018 г. – 402,5 тыс.; 2017 г. – 403,3 тыс.; 2016 г. – 356,5 тыс., 2015 г. – 425,5 тыс.).

Актыўнасць наведвання (наведвальнасць) дзіцячых бібліятэк па вобласці склала 9,1 (у 2018 г. – 8,7; 2017 г. – 8,7), чытальнасць – 16,7 (у 2018 г. – 16,6; 2017 – 20,8), абарачальнасць фонду – 1,7 (у 2018 г. – 1,8; 2017 г. – 2,2).

У апошнія гады наведвальнасць дзіцячых бібліятэк вобласці ўзрастае за кошт **віртуальных наведванняў** бібліятэчных сайтаў. За справаздачны год Інтэрнэт-рэсурсы дзіцячых бібліятэк вобласці аддаленыя карыстальнікі наведалі 16,5 тыс.разоў.

У час канікул карыстаюцца дзіцячымі бібліятэкамі і іншагароднія школьнікі.

Бібліятэчны фонд дзіцячых бібліятэк вобласці налічвае 412,3 тыс. экз. дакументаў (у 2018 г. – 436,5 тыс. экз.; 2017 г. – 443,6 тыс.экз.; у 2016 г.– 453,1 тыс.экз.).

У сярэднім на адну бібліятэку прыходзіцца 20,6 тыс. экз. (у 2018 г. – 20,7 тыс. экз.; 2017 г. – 21,1 тыс.экз.; у 2016 г.– 21,6 тыс.экз.).

Доля выбыцця выданняў з агульнага фонду дзіцячых бібліятэк склала 19,6 тыс.экз. (у 2018 г. - 29,1 тыс.экз.; 2017 г. – 29,4 тыс.экз.; у 2016 г.– 28,8 тыс.экз.).

Новыя паступленні налічваюць 15,7 тыс. экз. (у 2018 г. –16 тыс. экз.; 2017 г. – 17,4 тыс.экз.; у 2016 г. –17,3 тыс. экз.). З іх новых кніг – 8,9 тыс.экз. (у 2018 г. – 7,6 тыс.экз.; у 2017 г. – 7,1 тыс. экз.; у 2016 г. – 7 тыс.экз.). Лічба аб'ёму паступленняў новых кніг у дзіцячыя бібліятэкі рэгіёнаў на працягу года вызначаецца неаднолькавасцю: ад 141 экз. (Плешчаніцкая ГПДБ), 169 экз. (Клецкая ДБ), 199 экз (Рудзенская ГПДБ), 212 экз. (Дружненская ДБ), 240 экз. (Стаўбцоўская ДБ), 244 экз. (Гарадзейская ГПДБ), 271 экз. (Смалявіцкая ДБ), 289 экз. (Пухавіцкая ДБ) да 620 экз. (Капыльская ДБ), 711 (Любанская ДБ), 760 экз. (Бібліятэка сямейнага чытання "Верасок"), 788 экз. (Старадарожская ДБ), 814 экз.дакументаў (Уздзенская ДБ) і 830 экз. дакументаў (Салігорская ДБ).

Надзённым пытаннем застаецца папаўненне кніжных фондаў сучаснай галіновай і мастацкай літаратурай для дзяцей. Сродкі, якія выдзяляюцца на камплектаванне кніжнага

фонду нязначныя. Аб гэтым сведчыць абмежаваны спіс паступленняў новых кніг для дзяцей у сельскія філіялы. Недастатковая абнаўляльнасць фондаў у некаторых сельскіх бібліятэках звязана з абмежаваным паступленнем новых выданняў з-за недастатковага фінансавання, з аднаго боку, і са станам бібліятэчных фондаў, часта перагружаных старой і састарэлай літаратурай, з другога.

Падтрымліваць інфармацыйны патэнцыял і прываблiваць юных наведвальнікаў дзіцячым бібліятэкам дапамагае падпіска на перыядычныя выданні (часопісы) – 471 назва (у 2018 г – 598 назваў; 2017 г. – 658; 2016 г. – 749). Як бачна, нягледзячы на вялікую ролю перыядычных выданняў у жыцці падрастаючага чытача, з году ў год у бібліятэках Мінскай вобласці працягваецца тэндэнцыя да скарачэння колькасці назваў дзіцячых часопісаў і газет. Гэта звязана з пастаянным ростам кошту падпісных выданняў і зніжэннем узроўню фінансавання на падпіску. Сельскія бібліятэкі прапаноўваюць юным чытачам 5-8 назваў часопісаў. Нядрэнна камплектуюцца перыёдыкай Старадарожская дзіцячая бібліятэкіа(52 назвы часопісаў), бібліятэка сямейнага чытання "Верасок" Маладзечанскага раёна (41 назва часопісаў), Стаўбцоўская і Бярэзінская ДБ (па 37 назваў часопісаў), Салігорская ДБ (36 назваў часопісаў), Валожынская ДБ (33 назвы часопісаў). Невялікую колькасць часопісаў атрымліваюць Смалявіцкая ДБ (14 назваў часопісаў), Пухавіцкая ДБ (15 назваў часопісаў), Уздзенская ДБ (18 назваў часопісаў) і Любанская ДБ (19 назваў часопісаў) На жаль, дзіцячыя біблятэкі мала атрымліваюць расійскіх дзіцячых часопісаў.

Бібліятэчны фонд дзіцячых бібліятэк, акрамя кніжных выданняў, уключае электронныя дакументы, сярод якіх электронныя энцыклапедыі, слоўнікі, тэсты, навучальныя праграмы.

Назіраецца далейшая інтэнсіфікацыя працэсу **камп'ютарызацыі дзіцячых бібліятэк**, насычэненне іх электронным, аўдыёвізуальным абсталяваннем. У Мінскай

вобласці камп'ютарызавана 20 дзіцячых бібліятэк. У дзіцячых бібліятэках налічваецца 38 камп'ютараў. Доступ у Інтэрнэт і электронную почту маюць 20 бібліятэк.

Значна пашырыліся межы дзіцячых бібліятэк у інтэрнэт-прасторы дзякуючы сацыяльным сеткам "УКантакце", "Facebook", "Аднакласніках" і "Instagram". Інфармацыйныя падставы для зносін самыя розныя: цікавыя мерапрыемствы, святы, сустрэчы з пісьменнікамі, цікавымі людзьмі і інш. Гэта дазволіла дзіцячым бібліятэкам не толькі абменьвацца інфармацыяй, але і стаць актыўнымі ўдзельнікамі рэспубліканскай і сусветнай інфармацыйнай прасторы. Тэлемасты, скайп-канферэнцыі, вебінары ў дзіцячых аддзелах Слуцкай ЦРБ, Барысаўскай ЦРБ, Маладзечанскай ЦРБ злучаюць бібліятэкараў і чытачаў у розных гарадах краіны.

Усе значныя падзеі, анонс мерапрыемстваў, новая, актуальная інфармацыя размяшчаецца на афіцыйных сайтах бібліятэк, дзе таксама даюцца спасылкі на прадстаўніцтвы ў сацыяльных сетках, што значна палягчае карыстальнікам працэс іх выяўлення.

Па-ранейшаму бібліятэкі вобласці надавалі значную ўвагу выкананню **платных паслуг,** арыентаваных на задавальненне запытаў наведвальнікаў, на пашырэнне даступнасці і камфортнасці карыстання інфармацыйнымі рэсурсамі. Найбольш запатрабаванымі былі наступныя: ксеракапіраванне і скан іраванне дакументаў, набор тэкста; раздрукоўка на прынтары, каляровая раздрукоўка дакументаў, выдача кніг з камерцыйнага фонду бібліятэкі, выдача аўдыёвізуальных матэрыялаў, выкананне даведак і тэматычных падборак, правядзенне масавых мерапрыемстваў па заказу навучальных устаноў, выступленні лялечных тэатраў, выраб навагодняй сувенірнай прадукцыі і інш.

Дзіцячыя бібліятэкі актыўна ўкараняюць у практыку сваёй работы інтэрактыўныя формы, шырока выкарыстоўваюць сучасныя тэхналогіі: віртуальныя турнэ, відэа ролікі, медыякалейдаскопы, слайд гутаркі, слайд рэпартажы, TV-гіды, дні электроннай кнігі, кніжныя міні-

тэатры, інтэрактыўныя фэшэн-дасье і бібліятэчныя пляцоўкі; займаюцца выхаваннем інфармацыйнай культуры школьнікаў.

Так, дзіцячы аддзел Барысаўскай ЦРБ працуе па праграме “Школа інфармацыйнай культуры”, якая прадугледжвае правядзенне слайд гутарк з элементамі гульні, інфармацыйных гадзін, урокаў-практыкумаў.

Цікава праходзяць урокі інфармацыйнай культуры ў Лагойскай ДБ, дзе адбыліся ўрокі па тэмах “В мир знаний – через библиотеку”, “От первых экспериментов до уникальных проектов”, “Источники книжной культуры”, “Чем опасен интернет” і інш.

Аматарскае аб’яднанне па выхаванню інфармацыйнай культуры “Сябры кнігі” існуе ў Мядзельскай ДБ.

Сучаснымі з’яўляюцца дзіцячыя аддзелы Барысаўскай ЦРБ, Слуцкай РЦБ, Бярэзінская ДБ, Салігорская ДБ, Валожынская ДБ, Уздзенская ДБ, Пухавіцкая ДБ, бібліятэка сямейнага чытання “Верасок, у якіх з мэтай развіцця і ўдасканалення інфармацыйна-адукацыйнай культуры, інтэлектуальнага росту і задавальнення пазнавальных запытаў дзяцей і падлеткаў працуюць **інфармацыйна-адукацыйныя цэнтры**. Магчымасці інфармацыйна-адукацыйных цэнтраў выкарыстоўваюцца пры правядзенні ўрокаў інфармацыйнай культуры. Наведвальнікі ІАЦ удзельнічаюць ў пазнавальных анлайн-гадзінах, медыяаглядах, медыяпрэзентацыях, анлайн-падарожжах, гадзінах анімацыі, турнірах знаўцаў камп’ютара, медыялекторыях і інш.

Трывалыя кантакты з **мясцовымі сродкамі масавай інфармацыі** дапамагаюць бібліятэкам у сваіх рэгіёнах знаёміць жыхароў з падзеямі бібліятэчнага жыцця раёна, гісторыяй роднага краю, фарміруюць станоўчы імідж бібліятэкі ў грамадстве.

З патэнцыйных удзельнікаў партнёрства можна вылучыць сродкі масавай камунікацыі: электронныя мас-медыя, друк, тэлебачанне.

Актывізавалася дзейнасць па рэкламаванні бібліятэк, іх фондаў і паслуг па мясцовым радыё.

Публікацыі ў раённых газетах, якія рыхтуюцца як журналістамі, так і супрацоўнікамі бібліятэк, паведамляюць аб мерапрыемствах для дзяцей, рэсурсах і паслугах бібліятэк. Інфармацыйная падтрымка бібліятэчных мерапрыемстваў з боку СМІ садзейнічае папулярызацыі кнігі і матывацыі чытання, прыцягнення ў бібліятэку новых чытачоў.

Лепшы вопыт работы дзіцячых бібліятэк вобласці атрымлівае адлюстраванне на старонках прафесійных часопісаў “Бібліятэка прапануе” і “Бібліятэчны свет”.

Найбольш эфектыўны спосаб агляду дзейнасці дзіцячых **бібліятэк – іх рэкламаванне.** Мэтай рэкламных кампаній з'яўляюцца прыцягненне ў бібліятэку новых карыстальнікаў, іх больш актыўнага чытання і сістэматычнага наведвання бібліятэкі юнымі чытачамі.

Традыцыйнымі ў рэкламе дзіцячых бібліятэк застаюцца экскурсіі, дні адчыненых дзвярэй, прэзентацыі праектаў бібліятэк, рэкламныя акцыі, піяр-апытанні, флэшмобы і інш.

Імкненне дзіцячых бібліятэк знайсці сваё месца ў грамадстве спрыяе з'яўленню і распаўсюджванню разнастайных па форме і тэматыцы **інтэрактыўных выстаў.**

Фармат кніжных выстаў у дзіцячых бібліятэках вобласці вельмі разнастайны. Гэта і выстава-панарама, выстава-казка, выстава-рэпартаж, выстава-каляндар, выстава-хобі, выстава-сюрпрыз, выстава-інфармацыя, выстава-перасцярога, выстава-разважанне, выстава-інсталяцыя, выстава-заклік, выстава-папярэджанне, выстава-прынада, выстава-віншаванне, выстава-экспазіцыя, выстава-рэйтынг, выстава-фуршэт, выстава-здзіўленне, выстава-гульня і інш.

На выставах, акрамя кніг, перыядычных выданняў, прадстаўляліся фотаздымкі, буклеты, рэпрадукцыі карцін, дзіцячыя вырабы.

У Пухавіцкай РДБ набыў папулярнасць фармат выстаў “сушка”, на якім размяшчаюцца малюнкі маленькіх чытачоў: “Мая мама – лепшая на свеце”, “Як зберагчы свой дом ад пажару”, “Навагоднія фантазіі”, “Небяспека заўсёды побач”, “Я+кніга”.

Выставы-прынады (выставы ў вокнах дзіцячых бібліятэк) аформлены ў Слуцкай, Стаўбцоўскай і Салігорскай дзіцячых бібліятэках.

Чытачам аддзела па рабоце з дзецьмі Вілейскай РЦБ і гасцям горада ў мінулым годзе таксама былі прапанаваны выставы рознай тэматыкі на вялікіх вітражных вокнах: "Зімнія канікулы. Навагодняя Вілейка", "Гліняная казка" (Вілейскі дом рамёстваў), "Зимние увлечения" (ДУА "Вілейскі раённы цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі"), Дзень белых журавоў (бібліятэчная акцыя); выставы творчых работ узорнага клуба-майстэрні "Лучынка" і гуртка "Фантазія" (Нарачанскі СДК); "Звонкае лета" (выстава ўдзельнікаў студый "Майстрыха" і "Куфэрак" ДУК "Цэнтралізаваная клубная сістэма Вілейскага раёна"), "Ракетомоделирование" (выстава ўдзельнікаў аб'яднання па інтарэсах ДУА "Нарачанская СШ"), "По жизни с увлечением" (выстава творчых работ Місюль Н.В.). У навагоднія і калядныя святы вокны аддзела ўпрыгожвала выставачная экспазіцыя "З Калядамі і Новым годам".

Чытачам Уздзенскай ДБ прыйшлася да спадобы кніжная выстава-сюрпрыз "Книжные жмурки".

Узаемадзеянне **з калегамі з іншых гарадоў і краін** дае магчымасць дзіцячым бібліятэкам Міншчыны пашыраць межы бібліятэчных зносін, а таксама садзейнічае прафесійнаму росту спецыялістаў.

Хочацца адзначыць, што ў апошнія гады значна пашырыліся межы **міжнароднага супрацоўніцтва** з бібліятэкамі Расіі. Яно перастала быць асабліва прафесійным. Да супрацоўніцтва запрашаюцца пісьменнікі, арганізоўваюцца з імі онлайн сустрэчы, праводзяцца віртуальныя гульні, конкурсы для юных чытачоў. У конкурсах прымаюць удзел цэлыя сем'і.

Найбольш актыўна у гэтым кірунку працуюць публічныя бібліятэкі Барысаўшчыны.

Да 115-годдзя А. П. Гайдара дзіцячы аддзел Барысаўскай ЦРБ прыняў удзел у навукова-практычнай канферэнцыі "Гайдар. Время. Мы", якая праходзіла ў г. Клін

Маскоўскай вобласці, а таксама у цэлым цыкле анлайн-сустрэч, прысвечаных жыццю і творчасці А. П. Гайдара. Быў арганізаваны конкурс па стварэнні буктрэйлераў "Читаем Гайдара". Галоўнай мэтай конкурсу з'яўлялася папулярызацыя творчасці А. П. Гайдара як крыніцы выхавання духоўна-маральных каштоўнасцяў у дзяцей на прыкладах герояў яго твораў. Акрамя вучняў школ г. Барысава ў конкурсе таксама прынялі ўдзел дзеці з г.Клін Маскоўскай вобласці і г. Пскова. Цікава прайшоў і Міжнародны літаратурны турнір знаўцаў "Любимых детских книг творец. И верный друг ребят…".

Да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне юныя барысаўчане, навучэнцы школ Беларусі і калінінградскія школьнікі прынялі ўдзел у міжнародным патрыятычным конкурсе даследчых работ "Память: одна на всех" і ў Міжнароднай акцыі "Читаем детям о войне".

Наведвальнікі дзіцячага аддзела Барысаўскай ЦРБ прымалі таксама ўдзел у такіх Міжнародных акцыях як: "Наши истоки. Читаем фольклор", дзе адбыліся мерапрыемствы, прысвечаныя гісторыі беларускай мовы і літаратуры; "Книжка на ладошке" – акцыя па прыцягненні дзяцей дашкольнага ўзросту і іх бацькоў да чытання сучаснай дзіцячай літаратуры (г.Самара); дабрачыннай акцыі "Кораблик доброты 2019" і інш. Прымалі ўдзел у Міжнародным конкурсе дзіцячай творчасці "Ёлка Чука и Гека" (г.Клін); у міжнародных вебінарах у рамках Міжнароднага бібліятэчнага праекта "Пскоўшчына-Барысаўшчына: грані супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння".

Дзіцячы аддзел Слуцкай РЦБ, у рамках літаратурнай кампаніі "Чытаем разам з пісьменнікам", арганізаваў раённы літаратурны фестываль па папулярызацыі беларускай мовы і літаратуры "Случчанскія вытокі" сярод выхаванцаў дзіцячых дашкольных устаноў горада і раёна. Чытанні завяршыліся online-сустрэчай "Чулая душа Васіля Віткі" з дзіцячай бібліятэкай-філіялам №6 г. Мінска, якая носіць яго імя. У

тэлемосце прынялі ўдзел беларускія пісьменнікі Расціслаў Бензерук і Анатоль Бензерук.

Дзіцячы аддзел Слуцкай ЦРБ ўдзельнічаў ў міжнародным праекце “Жывая вясна”. Іх сумесная пазнавальная праграма “Жалобная кніга прыроды” была прысвечана Чырвонай кнізе.

На міжнароднай канферэнцыі “Бібліятэка для дзяцей як тэрыторыя сучасных магчымасцяў”, якая праходзіла у цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэцы імя М.Астроўскага г. Мінска, свой праект “Стартап “Open air: “Бібліятэчныя лаўкі” прадставіла загадчыца дзіцячага аддзела Слуцкай РЦБ.

Уздзенская дзіцячая бібліятэка падтрымлівае сувязі з дзіцячай бібліятэкай МБУК “Шатурская міжпасялковая раённая бібліятэка” горада-пабраціма Шатура (Расія). Таксама супрацоўнікі бібліятэкі ўпершыню прынялі ўдзел у Міжнароднай акцыі “Книжка на ладошке–2019”, арганізаванай муніцыпальнай бюджэтнай установай культуры гарадской акругі горада Самара “Централизованная система детских библиотек”.

Бібліятэкі г.Маладзечна прымалі ўдзел у шостым Міжнародным адкрытым форуме “Друзья Городка. Портреты памяти: Городок и его освобождение”.

Супрацоўнікі аддзела па рабоце з дзіцячым чытачом Жодзінскай ЦБ былі ўдзельнікамі VI Міжнароднага кангрэса “Библиотека как феномен культуры” ў НББ.

У справаздачным годзе бібліятэкі Міншчыны значна актывізавалі сваю дзейнасць па распаўсюджванні чытання і кнігі сярод дзяцей і падлеткаў, павышэнні ролі ў жыцці насельніцтва рэгіёна, пашырэнні функцый і дыяпазону бібліятэчных паслуг.

Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання дзяцей і падлеткаў дзіцячых біблятэк Міншчыны была **накіравана на выкананне Дзяржаўных праграм:** “Культура Беларусі” на 2016-2020 гг., “Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь” на 2016-2020 гг., “Адукацыя і маладзёжная палітыка” на 2016-2020 гг., “Ахова навакольнага

асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў” на 2016-2020 гг., “Энергазберажэнне” на 2016-2020 гг., “Аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці насельніцтва” на 2016–2020 гг., “Развіццё фізічнай культуры і спорту ў Рэспубліцы Беларусь” на 2016-2020 гг., “Пераадоленне наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на 2011-2015 г.г. і на перыяд да 2020 года”, “Міласэрнасць”, “Памяць Міншчыны”, “Дзеці. Сям’я. Кніга” і інш.

На якаснае і аператыўнае задавальненне культурных, духоўных, адукацыйных патрэб карыстальнікаў накіраваны **мэтавыя праграммы і бібліятэчныя праекты:** праект “Расцём разам з кнігай” і праграма “Клопат” па падтрымцы дзяцей з фізічнымі абмежаваннямі (Бярэзінская ДБ); праект для дзяцей дашкольнага ўзросту “Книга – мостик в мир чудес” (Клецкая ДБ); педагагічны праект “Книга открывает мир наук” і летні праект “Лето с доброй книгой” (Капыльская ДБ); гісторыка-краязнаўчы праект “Памяць аб вайне” і праграмы “Сонца на кніжнай старонцы”, “Наша спадчына” (Любанская ДБ); праграмы “Карусель стихов и сказок” і “Родник” (Крупская ДБ); праграма “Мы – за здоровое будущее” (Лагойская ДБ); праграмы “Наш экадом – Мядзельшчына” і “Открываем книгу – открываем мир” (Мядзельская ДБ); праграмы па арганізацыі канікулярнага чытання дзяцей і падлеткаў “Канікулы з карысцю” і па падтрымцы чытання дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту “Чытанне адкрывае свет” (Валожынская ДБ); праграмы па рабоце з сям’ёй і падтрымцы сямейнага чытання “Островок семейного чтения” і па арганізацыі летніх чытанняў “Дзяцінства кніжнае смяецца” (Уздзенская ДБ); краязнаўчы праект “Край мой – гонар мой” (Смалявіцкая ДБ); праекты па творчаму падыходу да развіцця дзіцяці “Книжное зернышко”; па рабоце з дзецьмі з абмежаванымі магчымасцямі “Согреть своей заботой” і па рабоце з дзецьмі-сіротамі “Дом, где согреваются сердца”(Салігорская ДБ); праграмы “Дашкалёнак-кнігалюб” і “Канікулы. Чытанне з задавальненнем!” (дзіцячы аддзел Слуцкай РЦБ); праграмы “Библиокроха”, “Зялёныя дні ў

бібліятэцы" і праекты па папулярызацыі і падтрымкі чытання "ЗаЧтение", "БиблиоЛеди" (аддзел па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ); праграма па абслугоўванню дашкольнікаў і малодшых школьнікаў "Падрастаю з кніжкай Я" (аддзел па рабоце з дзецьмі Чэрвенскай ЦРБ); праект па патрыятычнаму выхаванню школьнікаў "Без срока давности", праграмы па краязнаўству "Зямля мая, святая і адзіная. Адраджэнне" і "Книга. Лето. Да здравствует библиотека!" (Заслаўская ДБ); праграмы "Да вытокаў сваіх вяртаемся","Быць здаровым – гэта модна", "Кропелькі вечнасці", "Лета з кнігай", "Край мой – Маладзечаншчына" (да Года малой радзімы) (бібліятэка сямейнага чытання "Верасок" Маладзечанскай ЦРБ); праграмы "Міласэрнасць", "Спадчына", "Родная мова", "Сэрцам кут замілаваны" (Старадарожская ДБ) і інш.

Кожная дзіцячая бібліятэка выпрацавала ўласную праграму арганізацыі абслугоўвання чытачоў з улікам спецыфікі свайго рэгіёна і патрабаванняў канкрэтнага дзіцяці.

Стартаваў доўгатэрміновы літаратурны інфармацыйна-забаўляльны прект "Чытаем! Вучымся! Гуляем! " у Бярэзінскай ДБ; у Любанскай ДБ рэалізоваўся крэатыў-праект "Рунь" па выяўленню і развіццю літаратурна-мастацкіх здольнасцей у падлеткаў.

У дзіцячым аддзеле Слуцкай РЦБ адбылося адкрыццё міні-праекта "Чытанне ў фармаце open-air: Бібліятэчныя лаўкі". Супрацоўнікі дзіцячага аддзела прасоўваюць сацыяльны стартап "Open air: "Бібліятэчныя лаўкі", як добры варыянт інтэграцыі бібліятэкі ў гарадскую прастору. У сацыяльных сетках створана суполка з такой назвай.

Валожынская дзіцячая бібліятэка ўключылася ў рэалізацыю сацыяльнага праекта "Калідорныя дзеці" па арганізацыі культурнай і творчай дзейнасці, вольнага часу і адпачынку дзяцей, чые сем'і пражываюць у інтэрнатах.

У рамках Года малой радзімы Пухавіцкая ДБ далучылася да шырокамаштабнага праекта "Пухавіцкі край – адходы раздзяляй", заснавальнікамі якога з'яўляюцца Еўрапейскі Саюз, Экапартнёрства, Пухавіцкі раённы

выканаўчы камітэт, Пухавіцкая раённая інспекцыя прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Справаздачны год быў годам плённай працы бібліятэк г.Узда ў сферы рэалізацыі аўтарскіх праектаў, прызваных забяспечыць паўнацэннае і ўсебаковае развіццё дзяцей: праект па фарміраванні ў дзяцей навыкаў пажарнай бяспекі з дапамогай кнігі і гульні “Комната НАС-ТРОЕ-ния: Книга, Я, Безопасность”; праект “Лялечны тэатр “Каласавічок” ставіць сваёй мэтай паказаць лялечны тэатр як гульнявую форму бібліятэчнай работы, якая аб'ядноўвае тэатр – ляльку – кнігу; праект па далучэнні дзяцей да кнігі “Говорящая книга: читают дети” садзейнічае павышэнню цікавасці да чытання літаратуры ў дзяцей і падлеткаў; праект па арганізацыі чытання і вольнага часу дзяцей і падлеткаў у перыяд школьных канікул “Литературные сезоны” прадугледжвае забяспечэнне інтэлектуальнага адпачынаку непаўналетніх і развіццё творчых здольнасцй дзяцей; праект па стварэнні інтэлектуальных і духоўных зносін у культурным асяроддзі “Весь год встречаем мы гостей” ставіць сваёй мэтай арганізацыю сустрэч з удзелам людзей, якія цікавыя менавіта падрастаючаму пакаленню; вэб-праект “Пісьменнікі Уздзеншчыны – дзецям”.

Па цікавым праектам працуе аддзел дзіцячага чытання Жодзінскай ЦГБ: “Играем квест в библиотеке” – правядзенне квэст-гульняў для дашкольнікаў і школьнікаў у канікулярны час; выставачны краязнаўчы праект “Малая родина – Жодино” з экскурсіямі па выставачнай экспазіцыі да Года малой Радзімы; праект па прасоўванні праваслаўнай літаратуры цэнтра духоўнай асветы сумесна з ЦГБ “Театр теней “Свет и тени”; праект “Растем вместе с книгой” і праект “Живёт Победа в поколениях”.

Змястоўныя праекты рэалізоўвае дзіцячы аддзел Барысаўскай ЦРБ ім.К.Х.Каладзеева: “Нам не жить друг без друга” па прапагандзе беларускай літаратуры і знаёмству з беларускімі пісьменнікамі; праграмы “Особый ребенок” і “Милосердие”; “К книге и чтению – через досуг и общение”; “Там, на неведомых дорожках…” па прыцягненню да чытання

дашкольнікаў і малодшых школьнікаў, імідж-праект “Зямля бацькоў нашых”, накіраваны на адраджэнне культурнай спадчыны Беларусі.

Усведамленне важнасці і зацікаўленасці дзяцей у выпрацоўцы ў сябе лідэрскіх якасцяў, прывяло да стварэння ў бібліятэцы праекта “Школа юнага лідара”, у рамках якога адбываюцца комплексныя заняткі з выкарыстаннем такіх форм работы, як кніжныя выставы-агляды “Путь лидера”; гульні на знаёмства “Снежный ком”, “Белка” і “Три слова о себе; дыскусійныя арэлі “Лидеры и общество”, “Кто он, тимуровец?”; відэалекторыі “Что такое лидерство”, “О лидерстве”; творчая майстэрня “Формула вдохновения” і інш.

Бібліятэка сямейнага чытання “Верасок” Маладзечанскай ЦРБ прымае актыўны ўдзел у конкурсах грантавых праграм. У мінулым годзе бібліятэка распрацавала гуманітарны праект “Территория равных возможностей” (стварэнне на базе бібліятэкі сацыякультурнага цэнтра, які садзейнічае рашэнню праблем, звязаных з абслугоўваннем бібліятэкай людзей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя, выкарыстоўваючы сучасныя камп’ютэрныя тэхналогіі).

У аддзеле па рабоце з дзецьмі Вілейскай РЦБ працуе праект “Бібліятэка для сям’і: выхавальнік на гадзіну”. Праект прадугледжвае арганізацыю адпачынку дзяцей (ва ўзросце ад 6 да 10 гадоў) на пэўны час, пакуль адсутнічаюць іх бацькі. Мэта праекта – павысіць інтарэс да кнігі і бібліятэкі праз арганізацыю цікавай, пазнавальнай і інтэлектуальнай вольнай часіны. Для дзяцей арганізаваны пакой казак, дзе яны могуць не толькі пагуляць, але і прыняць удзел у конкурсах, віктарынах, паглядзець мультфільмы. Для дзяцей праводзяцца экскурсіі і гульні. Таксама паспяхова рэалізуюцца праекты “Любі свой край і ўслаўляй” і “Цуды сваімі рукамі”. На прыканцы навучальнага года стартаваў летні праект “Вместе весело читать”.

Дзякуючы гэтым праграмам дзіцячым бібліятэкам Міншчыны ўдалося пашырыць і паглыбіць сваю дзейнасць у рэгіёнах, зрабіць яе канкурэнтаздольнай на рынку

інфармацыйна-адукацыйных паслуг, пашырыць кантынгент чытачоў, набыць вялікі круг сяброў і партнёраў.

У справаздачным годзе дзіцячыя бібліятэкі Міншчыны **ўдасканальвалі і ўзбагачалі формы супрацоўніцтва з установамі,** якія займаюцца выхаваннем дзяцей у сваіх рэгіёнах: з агульна-адукацыйнымі школамі, дзіцячымі садкамі, цэнтрам карэкцыйнага развіцця і рэабілітацыі дзяцей, з аддзяленнем дзіцячага сацыяльнага прытулку, інспекцыяй па справах непаўналетніх, ассацыяцыяй шматдзетных сямей, школай мастацтваў, аддзелам па рабоце з моладдзю, раённымі камітэтамі ГА “БРСМ”, цэнтрам творчасці дзяцей і моладзі, тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, інспекцыяй прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, раённымі арганізацыямі ветэранаў, гісторыка-краязнаўчымі музеямі, летнімі аздараўленчымі лагерамі і іншымі. Таксама наладжваюцца партнёрскія сувязі з іншымі дзіцячымі бібліятэкамі, Саюзам пісьменнікаў Беларусі, Мінскай грамадскай арганізацыяй “Дети не для насилия”, праваслаўнай царквой, з якімі сумесна распрацоўваюцца мэтавыя праграмы і праводзяцца мерапрыемствы.ятэкамі

Набываюць папулярнасць у працы дзіцячых бібліятэк Міншчыны **аматарскія аб’яднанні, клубы і гурткі** па розных захапленнях.

Сярод найбольш цікавых: клуб “Класная Кампанія” і лялечны гурток “Пятрушка” (Бярэзінская ДБ); экалагічны клуб “Свирелька” і клуб “Здоровяк” (Капыльская ДБ); экалагічны клуб “Геоленок” і літаратурны “Теремок” (Лагойская ДБ); клуб аматараў казкі “Чароўны куфэрак” і мультклуб “Вясёлая карусель” (Пухавіцкая ДБ); краязнаўчы клуб “Крынічка” і клуб для падлеткаў “Ровесник” (Крупская ДБ); аматарскае аб’яднанне па інфармацыйнай культуры “Сябры кнігі” і лялечны гурток “Лукамор’е” (Мядзельская ДБ); гурток для

дзяцей малодшага ўзросту “Сонейка”(аддзел па рабоце з дзецьмі Вілейскай РЦБ) і інш.

Вылучаецца клубная дзейнасць дзіцячай бібліятэкі г.Жодзіна, дзе плённа працуюць клубы выхаднога дня “Смешарики” і “Игротека в библиотеке”, літаратурны клуб “В гостях у книги”, клуб “Подросток”, у якіх выкарыстоўваюцца сучасныя формы работы з дзіцячым чытачом: мульт-тэрапія, тэатр ценяў, гульні-падарожжы, квэст-гульні, майстар-класы, гульні-віктарыны.

Нязменным поспехам карыстаецца клуб “Верасок” пры аддзеле па рабоце з дзецьмі Чэрвеньскай ЦРБ. Шмат новых звестак аб Беларусі атрымалі ўдзельнікі клуба на мерапрыемствах з цыклу вандровак па абласцях Беларусі “Пазнаём Беларусь разам”. Вынікам падарожжаў па Беларусі стала краязнаўчая віктарына “Вывучаем Беларусь разам”.

Супрацоўнікі бібліятэкі сямейнага чытання “Верасок” Маладзечанскай ЦРБ правялі шэраг мерапрыемстваў для наведвальнікаў клуба “Нядзельныя сустрэчы”, сярод якіх: спартыўны калейдаскоп “Со спортом дружить – здоровым быть”, гадзіна карысных парад да Сусветнага дня здароўя “Сохрани себя для жизни”, відэакруіз па старонках Чырвонай кнігі Беларусі “На красной странице – звери и птицы”, гадзіна займальнай экалогіі “Загадкі прыроды роднага краю”, калейдаскоп цікавых фактаў “В капле воды отражается мир”, поле цудаў “Планета литературных сокровищ”, бібліяграфічны лабірынт “Вместе с книгой на каникулы”, караван кніг “Улыбнулись книжки – к нам пришли детишки!”, літаратурны дыліжанс “Герои книжных полок зовут тебя читать”, казачнае асарці “Волшебный ворох сказок”, відэакруіз “Этот прекрасный и красочный мир”, мультсеанс “В гостях у двенадцати месяцев”, музычны калейдаскоп “Всех объединила музыка”, навагодні казачны серпанцін “Зимних сказок чудеса” і інш.

Для дзяўчынак-падлеткаў у Салігорскай ДБ паспяхова працуе клуб “Дзявочыя сакрэты”. Мэта клуба: арганізацыя занятасці і вольнага часу падлеткаў, дапамога ў выбары іх

жыццёвай пазіцыі. Для дзяўчынак адбыліся такія мерапрыемствы, як гурман-пасяджэнне “Приходите к нам на чай!”, пазнавальная віктарына “Рождества волшебные мгновенья”, размова-абмеркаванне “На семейной книжной полке”, гадзіна зносін “Один день из жизни библиотекаря”, гадзіна псіхалогіі “Познаю себя и других” і інш. З вялікай зацікаўленасцю дзеці наведваюць і экалагічны клуб “Лесавічок”, дзе яны спазнаюць шмат новага і цікавага са свету прыроды. Пры бібліятэцы паспяхова працуе музей лялек.

Ужо не першы год пры аддзеле па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ працуе дыскусійны клуб для падлеткаў “Дыялог”. Мерапрыемствы клуба садзейнічалі маральна-эстэтычнаму і прававому выхаванню школьнікаў і праходзілі ў форме круглага стала, трэнінгаў, дыялогаў і дыскусій, на якія запрашаліся псіхолагі, медыкі, прадстаўнікі праваахоўных органаў.

Працягвала працаваць літаратурнае аб’яднанне юных паэтаў “Першацвет” у Старадарожскай дзіцячай бібліятэцы, у якім ладзяцца літаратурна-краязнаўчая гадзіны, вечарыны паэтычнага настрою, паэтычныя гадзіны, інтэлектуальныя гульні, арганізоўваюцца конкурсы юных чытальнікаў вершаў “Детские поэты – детям”. Плённа працуе і экалагічны клуб для дзяцей малодшага ўзросту “Буслік”, дзе праходзяць акцыі-заклікі, турніры юных эколагаў, экалагічныя КВЗ, пазнавальныя эка-гадзіны, экалагічныя марафоны і гульні.

Штомесяц збірае маленькіх старадарожцаў за адным сталом гурток “Чамучка”. Для ўдзельнікаў гуртка прайшлі: рыцарскі турнір “Сегодня праздник всех мужчин и подрастающих мальчишек”, гульнёвая праграма “Умелые руки не знают скуки”, гульня-віктарына “Сказка – ложь, да в ней намёк…”, пазнавальная гадзіна “Вселенная интересных книг”, экалагічнае падарожжа “Загадки морских глубин”, інфармацыйная гадзіна “Здравствуй, Зимушка -зима!”. Падлеткі актыўна наведваюць гурток “Эрудыт”.

З задавальненнем наведвалі клуб выхаднога дня “Солнышко” юныя чытачы Смалявіцкай ДБ.

Сямейны клуб “7 Я” Заслаўскай ДБ спрыяў паляпшэнню духоўнага клімату сям'і, умацаванню кантактаў паміж бацькамі і дзецьмі.

Мэтай літаратурна-пазнавальнага клуба “Чабарок” Клецкай ДБ з’яўляецца развіццё ў дзяцей цікавасці да чытання праз папулярызацыю лепшых твораў дзіцячых пісьменнікаў, пашырэнне кругагляду, арганізацыя вольнага часу.

**Акцыі** традыцыйна займаюць ганаровае месца сярод масавых формаў работы па распаўсюджванні чытання і кнігі сярод дзяцей і падлеткаў. У практыку работы бібліятэк трывала увайшлі такія бібліятэчныя акцыі, як “Кінь мышку – бяры кніжку!”, “У Новы год з новай кнігай”, “Любіце кнігу круглы год”, “Читать – это модно”, “Читай всегда, читай везде!”, “У камп’ютара не сядзі, да нас прыхадзі!” “Есть страна Читалия…”, “Удиви родителей – прочитай книгу!”, “Читают все – читайте и вы!”, “Першыя чытачы студзеня”, “Подвешенная книга”, “Подари ребёнку книгу, подари ребёнку мир!”, “Приведи друга в библиотеку” і інш.

Папулярнымі формамі ў апошні час сталі вулічныя флэшмобы: “Как пройти в библиотеку”, “Читаем стихи о войне”, “Читают все – читай и ты!”, “Чтение на ступеньках” і інш.

Вулічныя акцыі ў падтрымку чытання дзяцей і падлеткаў набіраюць абароты. Дзіцячыя бібліятэкі пашыралі сферу свайго ўплыву, актыўна выходзілі ў зоны адпачынку гаражан: “Литературная беседка в парке”, “Читающий бульвар”, “Книжная аллея”, “Читай-дворик”, “Літаратурны лужок”, “Летний читальный зал под открытым небом”, “С книжкой на скамейке”, “Читающий маршрут”, “Литературный автобус”, “Библиопикник на природе”, бэбі-арт пляцоўка “Пад кніжным парасонам”.

Упершыню для дзяцей г.Вілейкі ў перыяд летніх канікул праводзіліся летнія чытанні пад адкрытым небам. Для ўсіх жадаючых прайшоў “Марафон здоровья – 2019”, дзе адбыліся летнія спартыўныя, пазнавальныя і літаратурныя мерапрыемствы для дзяцей.

Бібліятэка сямейнага чытання “Верасок” Маладзечанскай ЦРБ арганізоўвала дзіцячыя літаратурна-гульнёвыя пляцоўкі у парку культуры і адпачынку імя Перамогі: у гонар свята 1 мая – “Наш край встречает Первомай”, да Дня Купалля – бібліяфэст “Любімы горад гартае старонкі”. У рамках праекта “Пра цябе, мой родны горад, я з любоўю раскажу”, на тэрыторыі каля бібліятэкі, быў арганізаваны бібліятэчны бульвар “Весёлый островок”, прымеркаваны да Дня абароны дзяцей. У рамках праекта “З любоўю да Беларусі” супрацоўнікі бібліятэкі правялі бібліятаксі “Зямля, якой і ты часцінка”. Дзеці “падарожнічалі” па роднаму краю і адказвалі на пазнавальныя пытанні.

Каля будынкаў дзіцячых бібліятэк арганізоўваюцца інфармацыйныя і гульнявыя пляцоўкі, ствараюцца фотазоны.

Дзіцячыя бібліятэкі пастаянна ўдзельнічаюць у рэспубліканскіх, абласных і раённых акцыях.

У рамках рэспубліканскай акцыі “Культурны маршрут “Мая Беларусь: сучасныя пісьменнікі – дзецям”, пры падтрымцы выдавецтва “Народная асвета” ў дзіцячых бібліятэках вобласці арганізоўваліся сустрэчы з сучаснымі беларускімі пісьменнікамі: Ірынай Токаравай, пісьменнікамі з Оршы Сяргеем і Галінай Трафімавымі і інш.

Аддзел па рабоце з дзецьмі Дзяржынскай РЦБ прыняў ўдзел у Міжнароднай акцыі “ Кнігавічкі” па далучэнню дзяцей да кнігі і чытання.

Арганізацыя шматлюдных акцый у адкрытым асяроддзі дапамагае бібліятэкам быць бачнымі ў сваіх рэгіёнах.

Супрацоўнікі дзіцячых бібліятэк асабістую ўвагу звярталі на **чытацкае развіццё дашкольнікаў** і **першакласнікаў.**

Прабуджэнню ў дашкалят цікавасці да кнігі і чытання садзейнічала школа маленькага чытача “Я не чытач – я толькі вучуся…” Уздзенскай ДБ.

Улічваючы выхаваўчае ўздзеянне казкі на асобу дзіцяці, у дзіцячым аддзеле Барысаўскай ЦРБ быў распрацаваны праект “Там, на невядомых дарожках... ” па прыцягненні да

чытання дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. У рамках праекта нязменным поспехам карысталіся пастаноўкі лямцавага тэатра “Вандроўны чамаданчык”.

Дзяржынская ДБ працягвала работу па рэалізацыі праекта па прыцягненню дзяцей і іх бацькоў да кніжнай культуры “Книжки для подготовишки” і праграмы “Сёння-зярнятка, заўтра – раслінка”, мэта якой – духоўна-маральнае выхаванне дзяцей, знаёмства з лепшымі ўзорамі дзіцячай літаратуры, знаёмства з праваслаўнымі святамі, святынямі і традыцыямі беларускага народа. Пачалі рэалізацыю праекта “Краязнаўчая палітра” па распаўсюджванню краязнаўчых ведаў сярод дашкольнікаў. Карыстаецца вялікім попытам у юных чытачоў і іх бацькоў студыя развіваючага чытання “Я чытаю! Я расту”. У рамках студыі праводзіўся цыкл творчых гадзін “Казкі і фарбы”.

Аддзел па работе з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ працягваў работу па праекту “Бібліякроха”. Мэта праекта – фарміраванне ўстойлівай цікавасці старэйшых дашкольнікаў да кнігі праз стварэнне адзінай сістэмы працы паміж ўстановамі дашкольнай адукацыі, бібліятэкай і сям'ёй. У гэтым праекце выкарыстоўваецца прынцып “кальцавой пошты”. Чароўны мяшэчак з кнігамі і цацкамі для дзяцей, рознымі заданнямі, буклетамі, дыскамі і літаратурай для бацькоў пакідаецца ў дзіцячым садку і перадаецца з сям'і ў сям'ю. У бібліятэцы арганізаваны пакой для вольнага часу і творчасці дзяцей з бацькамі.

Па сумеснаму праекту “Почемучка-книголюб” працуе аддзел дзіцячай літаратуры Маладзечанскай ЦРБ і ДУА “Яслі-сад № 32”.

З мэтай прываблівання дашкольнікаў да чытання і кнігі Клецкая ДБ распрацавала праект “Книга – мостик в мир чудес”.

Гурток для дзяцей малодшага ўзросту “Сонейка” працуе ў аддзеле па рабоце з дзецьмі Вілейскай ЦРБ. Наведвальнікі гуртка прымалі ўдзел у конкурсе малюнкаў “Заточи карандаши и рисуй, читай, пиши…”, хіт-парадзе літаратурных герояў

“Пазнай мяне”, літаратурным лато па кнігах Э. Успенскага, дні казак для самых маленькіх.

Валожынская ДБ працуе па мэтавай праграме па падтрымцы дзіцячага чытання дашкольнікаў і малодшых школьнікаў “Чытанне адкрывае свет”.

Аддзел дзіцячага чытання ЦГБ г.Жодзіна рэалізоўваў праект “Растем вместе с книгой”. У рамках праекта прайшлі мерапрыемствы, якія спрыялі фарміраванню ў дзяцей цікавасці да кнігі: лялечныя спектаклі, інсцэніроўкі казак, гучныя чытанні, пазнавальныя гадзіны, квэст-гульні, конкурсы, майстэрні і інш.

Традыцыйна для першакласнікаў арганізоўваліся **Тыдні першакласнікаў і дні пасвячэння ў чытачы,** дзе вучні першых класаў з годнасцю праходзяць розныя выпрабаванні, чым пацвярджаюць ганаровае званне “Першакласнік”. Каралева Кніга кожнаму ўручае медаль “Умею чытаць”. Цікава праходзяць “Свята азбукі” і “Развітанне з букваром”.

На працягу справаздачнага года для вучняў першых класаў супрацоўнікі бібліятэкі сямейнага чытання “Верасок” Маладзечанскай ЦРБ праводзілі літаратурны круіз “Мы теперь читаем сами”. Знаёмілі дзяцей з папулярнай дзіцячай літаратурай і часопісамі праз бібліяграфічныя агляды “У свеце цікавых кніг” і “Па старонках дзіцячых часопісаў”.

Для дапытлівых чытачоў першых класаў дзіцячага аддзела Слуцкай ЦРБ кожны верасень праходзіць Дзень адчыненых дзвярэй “Аддаём кнігі ў добрыя рукі”. Шумна, весела праходзіць свята развітання з Букваром.

Прайшло шэраг мерапрыемтваў па пасвячэнню ў чытачы “З табою, кніга добрая, ідзем у цэлы свет” у Бярэзінскай ДБ.

Стала добрай традыцыяй у дзіцячых бібліятэках праводзіць першы урок **да Дня ведаў.** У справаздачным годзе ён прайшоў па тэме “Занімай, Беларусь маладая мая, свой пачэсны пасад між народам!”. Навучэнцы ва ўсіх рэгіёнах Мінскай вобласці ў гэты дзень здзяйснялі падарожжы па родным краі, узгадвалі гісторыю, прыроду, традыцыі і

культуру Беларусі, актыўна ўдзельнічалі ў краязнаўчых віктарынах.

Мінулы 2019 год характарызаваўся далейшым узмацненнем **масавай работы** дзіцячых бібліятэк Міншчыны, што дазваляла змястоўна арганізаваць вольны час дзяцей, спрыяла фарміраванню культуры зносін.

Каб прыцягнуць і ўтрымаць у бібліятэцы сучасных дзяцей і падлеткаў работнікі дзіцячых бібліятэк імкнуцца ўкараняць у сваю дзейнасць новыя формы правядзення мерапрыемстваў з выкарыстаннем камп'ютарных тэхналогій: літаратурны каламбур; літаратурны батл, літаратурны уікэнд, online-сустрэчы з пісьменнікамі, TV-гіды, квэсты, спрынт-конкурсы, літаратурнае караоке, лібмоб, дні электроннай кнігі, літаратурныя джунглі, фотакросінг, дэгустацыя літаратурных навінак, дыскусійныя арэлі, воркшоп, бібліяноч, літаратурны чамаданчык  і інш. Пры іх правядзенні ўдала спалучаецца кніжны матэрыял, гульнёва-забаўляльныя элементы, мультымедыйныя прэзентацыі, аўтарскія кліпы і электронныя гульні, якія паднялі бібліятэчныя мерапрыемствы на больш якасны ўзровень. Развіваецца буккросінг, ствараюцца буктрэйлеры і лэпбукі.

У аддзеле па рабоце з дзіцячым чытачом Жодзінскай ЦБ былі апрабаваныя новыя формы работы: квэст-гульня, аквагрым, крэатыў-лабараторыя, бібліяпазлы, казкатэрапія, інфармацыйная вітрына, мазгавы штурм, book-дайджэст, калаж чытацкіх пераваг, бібліяфрэш, кніжнае канфеці і літаратурны пікнік.

Сярод цікавых мерапрыемстваў  хочацца адзначыць інтэрактыўнае фэшн-дасье “Причуды моды” і бібліяподыум “Самые модные книги”, якія прайшлі ў Капыльскай ДБ.

Бібліяглобус пад назвай “Маёй Радзімы дзіўны свет” адбыўся ў Лагойскай ДБ.

Не першы год аддзел абслугоўвання дзіцячага чытача Дзяржынскай РЦБ праводзіць Кніжны  фрымаркет. У мінулым годзе наведвальнікі фрымаркета акрамя абмена кнігамі,  прынялі ўдзел у майстар-класе  “Модненько-Новогодненько” па  вырабу

навагодніх аксэсуараў. Дзецям прыйшлася да спадобы гульня-забава “ Бібліяфартуна”, працавала інтэрактыўная фотазона “Зимней сказочной порой” і тэатр цяней.

У чарговы раз юным чытачам Любанскай ДБ пасчасціла ўдзельнічаць у Бібліяночы-2019. У гэты дзень адбыўся квест “Литературное Зазеркалье”. Хлопчыкі і дзяўчынкі падарожнічалі па станцыях “Тайная комната Гарри Поттера”, “Салон гаданий Мадам Ля Бук”, “Библио Яга”, “Бармаглот”, “Ночной художник”, “Зазеркальная гримёрная”, “Игровая с Шерлоком Холмсом”. Дзецям прыйшлося пераадолець мноства перашкод, перш чым яны змаглі атрымаць галоўны прыз.

Бібліятэка сямейнага чытання “Верасок” Маладзечанскай ЦРБ прысвяціла “Бібліяноч-2019” Году малой радзімы і 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Мерапрыемствы бібліяночы былі аб’яднаны ў краязнаўчы серпантын “Мы этой Земли продолжение”.

Аддзел па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ у справаздачным годзе працягваў работу над творча-гульнявым праекце “Бібліяквэст”, мэта якога прасоўванне кнігі і чытання ў маладзёжным асяроддзі крэатыўнымі сродкамі. У рамках праекта адбыліся: тэатралізаваны квэст-рум “Welcome to England”, квэст-гульня “Галодныя гульні – 2019: інфармацыя выратуе свет” па матывах кніг С. Коллінз, літаратурны квэст па творах русскіх класікаў “Время сказочных приключений” і інш.

Добры вынік дае выкарыстанне комплексных формаў папулярызацыі кнігі і чытання.

Да дня бібліятэк у Салігорскай ДБ быў арганізаваны дзень адчыненых дзвярэй “Модно в XXI веке другом быть библиотеке”. У гэты дзень прайшлі розныя мерапрыемствы: экскурсія “В библиотеку с радостью за книжной мудростью”, гутарка “Необычные библиотеки мира”, інтэрактыўная гульня “Я люблю библиотеку”, відэафільм “История великих библиотек”, прадстаўлена кніжная выстава “Галерея книжных новинок”.

Дзіцячыя бібліятэкі шмат робяць дзеля далучэння дзяцей да кнігі і чытання, прапаганды беларускай мовы і літаратуры, сусветнай мастацкай літаратуры.

Усё больш дзіцячых бібліятэк распрацоўваюць **на перыяд школьных канікул праграмы**, якія прадугледжваюць прыцягненне дзяцей да кнігі, актывізацыю іх чытацкай дзейнасці.

Арганізацыя вольнага часу ў канікулярны перыяд – адна з асноўных задач праектаў "Канікулы з кнігай" аддзела абслугоўвання дзіцячага чытача Дзяржынскай ЦРБ, "Канікулы з карысцю" Валожынскай ДБ, "Открываем книгу – открываем мир" Мядзельскай ДБ і "Литературные сезоны" Уздзенскай ДБ.

Праект "У кніжак няма канікул" аддзела па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ накіраваны на фарміраванне актыўнай чытацкай дзейнасці і арганізацыі інтэлектуальна-напоўненага дасуга дзяцей і падлеткаў у час канікул з дапамогай чытання лепшых твораў мастацкай літаратуры. У рамках праекта падчас зімовых, вясновых, восеньскіх і летніх канікул у бібліятэцы арганізоўваюцца кніжныя выставы, акцыі, рыхтуюцца тэматычныя спісы літаратуры і праводзяцца цікавыя пазнавальныя мерапрыемствы.

Вялікую працу па арганізацыі дзіцячага адпачынку ў перыяд школьных канікул праводзіць Лагойская ДБ па праграме "Канікулы з кнігай", якая прадугледжвае актыўныя формы работы: святы кнігі, гульнявыя праграмы, інтэлектуальныя конкурсы і віктарыны, мультымедыйныя прэзентацыі, метэападарожжы, сустрэчы з пісьменнікамі і інш.

У рамках раённай праграмы "Канікулы. Чытанне з задавальненнем!" вядзецца работа ў дзіцячым аддзеле Слуцкай ЦРБ.

Падчас вясновых канікул застаецца нязменнай традыцыяй у бібліятэках вобласці праводзіць для школьнікаў **Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі.**

З цікавай і насычанай праграмай пад назвай "Здравствуй, Книжкина неделя!" прайшоў Тыдзень кнігі у

Любанскай ДБ; “В стране книжных чудес” у Лагойскай ДБ; “Весяліцца дзятва: Кніжкін тыдзень прыйшоў” у Пухавіцкай ДБ; “Все книжки в гости к нам” у Крупскай ДБ; “Именины книжки детской” у Клецкай ДБ; “Эти книги вам, читатели, фантазёры и мечтатели” ў Салігорскай ДБ; “З табою, кніга добрая, ідзём у новы свет!” у аддзеле па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ; “Да здравствует книга!” у Заслаўскай ГДБ; “В кругу друзей” у Смалявіцкай ДБ; “Вялікае свята, дзе кніг багата” ў Мядзельскай ДБ, “Книга – тайна, книга – клад, книга – лучший друг ребят” у Валожынскай ДБ, “Открывая книгу, открываем мир!” у дзіцячым аддзеле Барысаўскай ЦРБ, “Сустрэча з кнігай дорыць радасць!” у Бярэзінскай ДБ, “Добрым кнігам – добры дзень” у аддзеле па рабоце з дзецьмі Вілейскай ЦРБ і інш. .

Ва ўсіх дзіцячых бібліятэках Тыдзень дзіцячай кнігі адкрываўся яркімі тэатралізаванымі прадстаўленнямі.

Кожны дзень для юных наведвальнікаў бібліятэк у рэгіёнах ладзіліся экскурсіі па бібліятэцы, гульні і конкурсы, святы і ранішнікі, прысвечаныя кнізе, сустрэчы з пісьменнікамі, літаратурныя вечарыны, гульнёвыя праграмы, эрудыт-конкурсы, фальклорныя гульні, інфармацыйныя кактэйлі, літаратурны ералаш, гадзіны новай кнігі, брэйн-рынгі, літаратурныя падарожжы, сустрэчы з актуальнай кнігай, тэатралізаваныя прадстаўленні, мультпадарожжы і іншыя цікавыя мерапремствы.

Арганізацыя вольнага часу і бібліятэчнага абслугоўвання юных чытачоў на летніх пляцоўках **у летні час** становіцца неад’емнай часткай работы дзіцячых бібліятэк Міншчыны.

Стала добрай традыцыяй у першы дзень лета ва ўсіх дзіцячых бібліятэках святкаваць **Дзень абароны дзяцей,** у які праходзяць святы, конкурсы, літаратурныя вандроўкі і займальныя падарожжа ў дзіўную краіну дзяцінства.

Зрабіць адпачынак школьнікаў больш актыўным і карысным дапамагалі летнія праграмы чытання: “Лета кніжнае, будзь са мной” (аддзел абслугоўвання дзіцячага

чытача Дзяржынскай ЦРБ); “В гостях у книжного лета” (Лагойская ДБ); “Лето книжного цвета” (бібліятэка сямейнага чытання “Верасок” Маладзечанскай ЦРБ); “Лето с книгой и библиотекой” (Старадарожская ДБ), “Лета з добрай кнігай” (аддзел па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ), “Большая перемена” (дзіцячы аддзел Барысаўскай ЦРБ), “Летние библиоканикулы” (Крупская ДБ), “Ключ ад лета” (Смалявіцкая ДБ) і іншыя, якія прадугледжвалі цікавыя экскурсіі, вясёлыя праграмы, літаратурныя гульні і віктарыны, летнія бібліятэчныя квэсты, конкурсы летняга чытання**,** лялечныя спектаклі, прадстаўлення тэатра ценяў, гульнявыя выставы, акцыі “Библиотека под зонтиком”. Мэта праграм – зрабіць кнігу верным сябрам дзяцей у перыяд летніх канікул, прыцягнуць увагу дзяцей і іх бацькоў да сямейнага чытання, паказаць цікавыя выданні, якія маюцца ў фондах бібліятэк.

Кніжныя выставы “В каждой книге солнце”, “Волшебство книжного лета ”, “С книгой летом веселей”, “Лета, кніга, я – сябры!”, “Летние новинки ”, “В стране литературных каникул”, “Открой книгу и чудеса начнутся”, “Солнечные встречи с книгой”, “Путешествуй вместе с книгой”; пазнавальныя гадзіны, бібліякэшынгі, урокі бяспекі, відэакруізы, атракцыёны, біблія-паці, літаратурныя падарожжы, конкурсы, спаборніцтвы, квэст-румы і іншыя мерапрыемствы прыцягваюць юных карыстальнікаў у бібліятэкі ў час летніх канікул.

Шмат увагі надаецца развіццю **творчых здольнасцей асобы, выяўленню таленавітых дзяцей.** Пастаянна сочаць за творчасцю юных аматараў слова, дапамагаюць ім, арганізоўваюць і праводзяць раённыя і гарадскія конкурсы таленавітых дзяцей супрацоўнікі дзіцячых бібліятэк і аддзелаў па абслугоўванню дзіцячага чытача Маладзечанскай, Мінскай, Уздзенскай, Барысаўскай, Мядзельскай, Вілейскай, Пухавіцкай, Капыльскай, Дзяржынскай ЦРБ.

У Капыльскай дзіцячай бібліятэцы падведзены вынікі раённага конкурса дзіцячай творчасці “Вдохновение над

пушкинской строкой”, прысвечанага 220-годдзю з дня нараджэння А.С.Пушкіна.

Дзіцячы аддзел Барысаўскай ЦРБ правёў конкурс па стварэнні буктрэйлераў “Чытаем Гайдара”, прысвечанага 115-годдзю з дня нараджэння А. П. Гайдара. Асноўнымі задачамі конкурсу з'яўляліся: выяўленне, падтрымка і стымуляванне інавацыйнай творчай дзейнасці школьнікаў; засваенне імі сучасных метадаў рэкламы і стварэння анатацый кніг; выкарыстанне мультымедыйных тэхналогій.

Чацвёрты год чытачы аддзела па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ прымалі ўдзел у фестывалі паэзіі імя П.Пранузы “Голасам свайго пакалення”. На гэты раз у конкурсе юных чытальнікаў “Чытаем Паўлюка Пранузу” прынялі ўдзел госці з Эстоніі. Прайшло адкрыццё выставы “Чытаем і малюем вершы Паўлюка Пранузы” эстонскіх гасцей.

Разглядзець у дзіцяці талент і дапамагчы яму развіцца ў поўнай меры – галоўная мэта бібляітэк г.Беразіно. Для бярэзінскіх школьнікаў прайшоў форум адораных дзяцей, на якім ладзіліся цыклы выстаў творчых работ “Нашы таленавітыя чытачы”, дзейнічалі фотавыставы “Навагодні калейдаскоп“, “Кніжная вясёлка лета”, “Восеньскія эцюды” і выставы дзіцячых малюнкаў “Мая матуля!”, “Сям’я – прытулак душы”, ”Калядная казка ў маім малюнку” і інш.

У бібліятэцы сямейнага чытання “Верасок” Маладзечанскага раёна прайшоў раённы злёт юных талентаў “Я заяўляю свету аб сабе”, прысвечаны Году малой радзімы і 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Конкурс стаў яшчэ адной магчымасцю для развіцця творчых здольнасцей дзяцей. Таксама адбыўся фотаконкурс “Селфи с книгой” і была арганізавана выстава-конкурс “Кніжкі-малышкі – сваімі рукамі”.

Аддзел па рабоце з дзецьмі Нясвіжскай ЦРБ у рамках праекта “БиблиоЛеди” правёў конкурс юных чытачак “БиблиоЛеди – 2019”. Праект накіраваны на падтрымку статусу і ўзняцце прэстыжу чытаючых дзяцей.

У бібліятэках шмат увагі надаецца рабоце па эстэтычнаму выхаванню дзяцей, стварэнню ўмоў для іх самарэалізацыі і творчага развіцця. Формы і метады, якія выкарыстоўваюцца ў бібліятэчнай практыцы ў гэтым кірунку самыя разнастайныя: кніжныя выставы, конкурсы і выставы дзіцячых малюнкаў, літаратурна-музычныя кампазіцыі, гадзіны мастацтва, вечары, сустрэчы, агляды літаратуры, гутаркі, майстар-класы, лялечныя гурткі, дзейнічалі клубы і аб'яднанні па інтарэсах.

Аддзел па рабоце з дзецьмі Чэрвеньскай ЦРБ арганізаваў для школьнікаў цыкл гутарак па мастацтву, прысвечаных рускім і беларускім мастакам: "Беларускі пейзажны жывапіс", "Нацюрморты Івана Хруцкага" і інш. Эстэтычная гадзіна "Если видишь на картине…" распавяла дзецям аб мастацкіх творах вялікіх рускіх майстроў партрэтнага жывапісу: І.Рэпіна, В.Трапініна, І.Крамскога. Аб сваім земляку Х.Суціне супрацоўнікі падрыхтавалі прэзентацыю "Х. Сутин: Путешествие длиною в жизнь".

Фарміраванне эстэтычнай культуры дзяцей малодшага школьнага ўзросту ў Заслаўскай ДБ ажыццяўляе клуб "Казачная скарбонка".

Дзіцячыя бібліятэкі Міншчыны актыўна працавалі **над пашырэннем сваіх сацыяльных функцый.** Яны не застаюцца ў баку ад вырашэння праблем, звязаных з асветай і выхаваннем дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі здароўя, развіццём іх творчых здольнасцей, арганізацыяй вольнага часу.

Галоўнай задачай у працы бібліятэк з гэтымі групамі карыстальнікаў з'яўлялася рэалізацыя іх творчага патэнцыялу, з дапамогай далучэння іх да бібліятэчных мерапрыемстваў, дзе яны змогуць мець зносіны с аднагодкамі.

Адным з прыярытэтных накірункаў работы дзіцячых бібліятэк з’яўлялася іх **сумесная дзейнасць з цэнтрам карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі** (ЦКРАіР) **і тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва (**ТЦСАН) па абслугоўванні **дзяцей-інвалідаў**. У каардынацыі з імі бібліятэкі ўдзельнічалі

ў дабрачынных акцыях па выкананні праграмы “Міласэрнасць”, развівалі абслугоўванне на даму, ладзілі мерапрыемствы.

Паказальны вопыт работы Салігорскай ДБ. Плённае супрацоўніцтва звязвае бібліятэку з цэнтрам карэкцыйнага развіцця, навучання і рэабілітацыі. Сумесная праца з групай дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі вядзецца ў рамках праекта “Согреть своей заботой”. Праект накіраваны на забеспячэнне адкрытага доступу да інфармацыі дзецям з абмежаванымі магчымасцямі і іх бацькам праз інфармацыйна-бібліятэчнае абслугоўванне і культурна-адукацыйную дзейнасць.

Надаецца вялікая ўвага дзецям-сіротам і дзецям, бацькі якіх пазбаўленыя бацькоўскіх правоў, якія знаходзяцца ў сацыяльна-педагагічным цэнтры Салігорскага раёна. Шмат гадоў бібліятэка падтрымлівае цесную сувязь з цэнтрам. Сумесна распрацаваны цыкл мерапрыемстваў “Дом, где согреваются сердца”. Бібліятэкары наведваюць выхаванцаў цэнтра, прыносяць часопісы і ладзяць для іх мерапрыемствы: кніжная палітра “Вот такие мы друзья: библиотека, книга, я”, экалагічны калейдаскоп “Я хочу дружить с природой”, ярмарка карыснай інфармацыі “Ключи к здоровью”, хвіліны радаснага чытання “Любимый выдумщик”. Але самымі папулярнымі ў дзяцей застаюцца лялечныя прадстаўленні тэатра “Забава”.

У справаздачным годзе Бярэзінская ДБ у рамках мэтавай праграмы **“Клопат**” сумесна з ЦКРАіР і РЦСАН праводзіла мерапрыемствы па падтрымцы дзяцей з фізічнымі абмежаваннямі, ладзіліся прадстаўлення лялечнга гуртка “Пятрушка”.

Крупская ДБ аднавіла работу па праграме “И сказка лечит” для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. Цыкл пазнавальна-забаўляльных гульняў, якія праводзяцца ў ЦКРАіР для дзецей-інвалідаў (11 чалавек) былі накіраваны на развіццё інтэлектуальных і фізічных здольнасцей дзяцей. Не абыходзяць увагай супрацоўнікі бібліятэкі і мерапрыемствы па міласэрнасці. А таксама працуюць над рэалізацыяй

сацыяльнага праекта па развіццю творчых здольнасцяў малодшых школьнікаў і дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі “Играем вместе”.

Навучэнцы Слуцкага раённага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі з’яўляюцца даўнімі гасцямі і актыўнымі ўдзельнікамі мерапрыемстваў дзіцячага аддзела Слуцкай ЦРБ. Для іх ладзяцца лялечныя спектаклі, казачныя віктарыны, пазнавальныя гульні. Навучэнцы цэнтра размяшчаюць у дзіцячым аддзеле свае творчыя работы. У інфармацыйна-адукацыйным цэнтры бібліятэкі ладзілася выстава званочкаў інваліда па зроку У. Палазнік, якая налічвае больш за 250 экспанатаў з розных краін свету.

Дзеці з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі могуць карыстацца фондам аўдыё-відэа дакументаў.

Наведвальнікі Слуцкага аддзела дзённага знаходжання для інвалідаў ДУ “Слуцкі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва” прымалі ўдзел у сустрэчы-інклюзіі “Рознакаляровыя старонкі для радасці”.

Выхаванцы аддзялення прытулку ГУА “Слуцкі сацыяльна-педагагічны цэнтр” былі запрошаны на Тыдзень дзіцячай кнігі “Бібліятэка, кніжка, я – разам верныя сябры”. Дзеці паглядзелі лялечнае прадстаўленне з Бабай Ягой, з задавальненнем удзельнічалі ў літаратурнай гульні, успаміналі любімых казачных герояў, здзейснілі займальную экскурсію па залах бібліятэкі. У завяршэнні праграмы быў праведзены майстар-клас па вырабе закладкі для кнігі.

У супрацоўнікаў аддзела па рабоце з дзецьмі Чэрвеньскай ЦРБ наладжаны сувязі з выхаванцамі аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, выхаванцамі ЦКРАіР. Традыцыйна для іх праводзяцца экскурсіі ў бібліятэку “Дом – дзе жывуць кніжкі”, агляды-знаёмства з казачнымі творамі для дзяцей “Казка за казкай”. З вялікай цікавасцю яны ўдзельнічалі ў пазнавальнай праграме “Чистота – для здоровья нам нужна” з праглядам відэаролікаў і

мультфільмаў. Дзеці заўсёды з задавальненнем гартаюць кнігі і часопісы, глядзяць мультфільмы.

“Жыццё патрабуе міласэрнасці” – сумесны праект бібліятэкі сямейнага чытання “Верасок” Маладзечанскай ЦРБ з аддзяленнем дзённага знаходжання маладых інвалідаў Маладзечанскага РТЦСАН і ЦКРНіР, накіраваны на адаптацыю ў грамадстве людзей з абмежаванымі магчымасцямі. У рамках праекта “Жыццё патрабуе міласэрнасці” супрацоўнікі бібліятэкі правялі мерапрыемствы: экалагічны кактэйль “Таямніцы роднай прыроды”, творчую майстэрню “Пасхальные фантазии” і арганізавалі выстаўкі творчых работ наведвальнікаў РТЦСАН: “Пасхальный сувенир” і “Тепло наших рук”.

Выхоўваць у дзяцей пачуццё міласэрнасці, дабрыні, спачування – мэта праекта “Дадзім надзею дзецям” аддзела па рабоце з дзецьмі Вілейскай ДБ. Праект ажыццяўляецца сумесна з тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і Вілейскай спецшколай-інтэрнатам.

Для дзяцей са слабым зрокам пры дзіцячым аддзеле Барысаўскай ЦРБ абсталяваны тыфлакуток, дзейнічае праграма “Особый ребёнок”. Сумесна з ГУО “Борисовский районный центр коррекционно-развивающего обучения и реабилитации” супрацоўнікі дзіцячага аддзела праводзяць індывідуальныя заняткі па навучанні камп’ютарнай пісьменнасці з выкарыстаннем праграмы “Гукавы падручнік”. У інтэрактыўным дзіцячым цэнтры “Росток” праходзяць практычныя заняткі Borisov InfoUSA з дакумент-камерай IQBoard. Дакумент-камера IQBoard шматфункцыянальная, якая забяспечвае поўную візуалізацыю, яна ўсё выводзіць на экран або інтэрактыўную дошку.

Дзеці з абмежаванымі магчымасцямі вывучаюць асновы інфармацыйнай пісьменнасці для далейшай самастойнай працы ў сучаснай прасторы

У Любанскай ДБ дзейнічала кніжная выстава “Кнігі, якія дапамагаюць жыць”, на якой былі прадстаўлены кнігі, якія дапамагаюць зразумець і распазнаць чужы боль і перажыванні,

патрэбу ў дапамозе і падтрымцы, уменні спачуваць і гатоўнасці прыйсці на дапамогу. Дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ўдзельнічалі ў займальным падарожжы “Краіна Чыталія запрасіла сяброў”.

Дзіцячыя бібліятэкі Міншчыны штогод праводзяць дабрачынныя акцыі: “Кораблик доброты” (дзіцячы аддзел Барысаўскай ЦРБ), “Добрым словом друг друга согреем” (Крупская ДБ), “Чым больш гадоў — тым больш шчасця” (Любанская ДБ), Уздзенская ДБ удзельнічала ў рэспубліканскай дабрачыннай акцыі “Нашы дзеці” і інш.

Ва ўсіх бібліятэках арганізоўваліся кніжныя выставы, адкрытыя прагляды, мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня інвалідаў і да Дня пажылога чалавека.

Сацыяльная тэматыка сёння закранула многія напрамкі дзейнасці дзіцячых бібліятэк. Павялічылася яе роля ў інфармацыйнай рабоце, ствараюцца банкі дадзеных, дзе змешчана інфармацыя па праблемах дзяцінства, аб сацыяльна-псіхалагічных службах , дзе можна азнаёміцца з інфармацыяй па такім пытанням, як правы дзіцяці, дзеці-сіроты, прыёмная сям'я, цэнтры дзіцячай творчасці, атрымаць даведкі аб навучальных установах, знайсці тэлефоны службаў даверу, выратавання, занятасці і іншыя.

**Прававое выхаванне** з’яўляецца важнай часткай фарміравання асобы чытача. З дапамогай дзён і гадзін прававых ведаў, урокаў права і маралі, прававых гульняў, гадзін разважання, літаратурна-пазнавальнах гадзін супрацоўнікі дзіцячых бібліятэк знаёмяць сваіх чытачоў з правамі дзяцей у краіне і свеце, інфармуюць аб адказнасці за правапарушэнні. Рэкламуецца дзейнасць дзіцячага прававога сайта mir.pravo.by, праходзяць сустрэчы з супрацоўнікамі праваахоўных органаў, псіхолагамі, валеолагамі і медработнікамі.

Дзіцячыя бібліятэкі не застаюцца абыякавымі да працэсу выхавання дзяцей, якія знаходзяцца ў **сацыяльна небяспечным становішчы** (СНС) і навучэнцаў з якімі праводзіцца **індывідуальная прафілактычная праца** (ІПП).

Яны будуюць стратэгію і тактыку выхаваўчага ўздзеяння на дзяцей, якія адносяцца да “групы рызыкі”, з дапамогай розных формаў і метадаў бібліятэчнай дзейнасці: арганізоўваюць псіхалагічна камфортную прастору для дзяцей з небяспечных сем'яў; аказваюць маральную дапамогу непаўналетнім, якія знаходзяцца ў складанай жыццёвай сітуацыі; арганізоўваюць дасугавую дзейнасць.

У дзіцячым аддзеле Барысаўскай ЦРБ мэтанакіравана вядзецца праца з дзецьмі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Супрацоўнікі аддзела ў рамках праграмы “Міласэрнасць” праводзяць цыкл мерапрыемстваў сумесна з аддзяленнем “Дзіцячы сацыяльны прытулак”: экскурсіі “Знакомство с детской библиотекой” і этнаграфічныя экскурсіі “Сядзіба, альбо хатка з матчынай душой”; гучныя чытання “Очень голодная гусеница”; лялечныя спектаклі “Дед Мороз и коза Дереза”, “Крошечка-Хаврошечка”, “Щелкунчик и мышиный король”, “Теремок”, “Мама Му чытае”.

У гэтых дзяцей ёсць праблемы з вучобай і паводзінамі, але некаторыя з іх любяць праводзіць вольны час у бібліятэцы, прымаюць актыўны ўдзел у мерапрыемствах.

Ва ўсіх бібліятэках ёсць спісы дзяцей “групы рызыкі”, якія штомесяц удакладняюцца. Дзякуючы сацыяльнаму партнёрству са школамі, псіхолагамі, інспекцыяй па справах непаўналетніх бібліятэкары фіксуюць любыя змены ў спісах дзяцей “групы рызыкі”, тым самым маюць магчымасць рэгуляваць прафілактычную працу ў гэтым кірунку.

Такія дзеці прыцягваюцца да работы ў дзіцячых клубах і гуртках, да сістэматычнага чытання і да ўдзелу ў мерапрыемствах. Індывідуальная работа з дадзенай катэгорыяй дзяцей і падлеткаў фіксуецца ў “Картатэцы назіранняў”.

Не застаецца ў баку ад бібліятэчнага жыцця і такі сацыяльны інстытут, як **сям’я.** Бібліятэкі дапамагаюць бацькам і іх дзецям у вырашэнні праблем сямейнага выхавання,

захавання сямейных традыцый, правядзення творчага і змястоўнага вольнага часу.

Асаблівая ўвага надаецца і **шматдзетным сем'ям.**

Пры сённяшнім пашырэнні сацыяльных функцый дзіцячыя бібліятэкі Мінскай вобласці выкарыстоўваюць больш актыўныя формы ўзаемадзеяння з юным чытачом і яго сям'ёй праз традыцыйныя сямейныя святы, бацькоўскія гадзіны, дні дабрыні, калейдаскопы сямейных гісторый, круглыя сталы, кніжныя выставы. Асноўныя мерапрыемствы ладзіліся да Міжнароднага жаночага дня, Міжнароднага дня сям'і, Дня маці.

Шукаюць і знаходзяць цікавыя формы работы з сям'ёй дзіцячыя бібліятэкі і дзіцячыя аддзелы цэнтральных бібліятэк Барысаўскага, Пухавіцкага, Маладзечанскага, Дзяржынскага, Старадарожскага, Капыльскага, Валожынскага, Уздзенскага, Мядзельскага, Вілейскага раёнаў і г. Жодзіна.

Як бачна мінулы год вылучаецца актыўнай **выхаваўчай і асветніцкай работай дзіцячых бібліяэк і аддзелаў па абслугоўванню дзіцячага чытача.** Усе асноўныя, знакавыя мерапрыемствы праходзілі ў адпаведнасці з прыярытэтамі года і прысвячаліся Году малой радзімы ў Рэспубліцы Беларусь і 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пільную ўвагу бібліятэкі Міншчыны надавалі фарміраванню патрыятызма і грамадзянскасці дзяцей і падлеткаў, распаўсюджванню краязнаўчых, прававых, экалагічных, эстэтычных ведаў, пытанняў па здароваму ладу жыцця, духоўнаму выхаванню, прафарыентацыі моладзі, папулярызацыі дзіцячай кнігі і кніг беларускіх пісьменнікаў. Ствараліся спрыяльныя ўмовы для самаразвіцця падрастаючай асобы, раскрыцця і падтрымкі творчых здольнасцей дзяцей, арганізацыі іх вольнага часу і сямейнага адпачынку. Актыўна выкарыстоўваліся інавацыйныя формы прапаганды літаратуры сярод дзяцей і падлеткаў з мэтай павышэння цікавасці да кнігі і чытання.

Сёння можна канстатаваць, што дзіцячыя бібліяэкі і аддзелы па абслугоўванню дзіцячага чытача з'яўляюцца

інфармацыйнымі цэнтрамі па праблемах дзяцінства, арганізатарамі чытання дзяцей, іх вольнага часу і творчай дзейнасці.

Нягледзячы на дасягнутыя вынікі, **застаецца шэраг невырашаных пытанняў.** Недастатковае фінансаванне не дазваляе забяспечыць у неабходнай ступені колькаснае і якаснае камплектаванне фондаў, мадэрнізаваць тэхнічную аснашчанасць бібліятэк і своечасовае ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы. Заклапочанасць выклікае сітуацыя з папаўненнем фондаў сучаснай дзіцячай літаратурай у сельскай мясцовасці. Не ў поўнай меры вырашана кадравая праблема. Неабходнасць у спецыялістах перавышае колькасць студэнтаў-выпускнікоў.

Сучасныя школьнікі перайшлі да інфармацыйнага складу жыцця, што, у сваю чаргу, значна ўплывае на памяншэнне прытоку нывучэнцаў старэйшых класаў у бібліятэкі, асабліва ў чытальныя залы. Дзяцей усё больш займае камп'ютар, інтэрнет. Практычна ўсе падлеткі маюць персанальныя камп'ютары. Значна высокі працэнт школьнікаў далучаецца да камп'ютара ў больш ранім узросце, чым было раней.

Але наведванне масавых мерапрыемстваў, сустрэча з сябрамі, правядзенне асабістага дасуга застаецца адной з патрэб юных чытачоў. І супрацоўнікі бібліятэк імкнуцца зрабіць дасуг дзяцей больш змястоўным і забаўляльным.

Пошук новых форм і метадаў работы ў арганізацыі абслугоўвання дзіцячага чытача ў вобласці не спыняецца.

## Камплектаванне і арганізацыя адзінага фонду

Бібліятэчны фонд – упарадкаваная сукупнасць дакументаў, якія адпавядаюць задачам і профілю бібліятэкі і прызначаны для выкарыстання і захоўвання.

Фонд публічных бібліятэк Мінскай вобласці на 01.01.2020 складае 5 953 996 экз. дакументаў. За мінулы год, у параўнанні з 2018 г., ён зменшыўся на 151 682 экз.

У 2019 г. значная ўвага надавалася даручэнню Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па накіраванні на камплектаванне фондаў бібліятэк не менш 12% грашовых сродкаў ад сумы бюджэтнага фінансавання на ўтрыманне дадзеных устаноў.

Так з бюджэту вобласці на камплектаванне бібліятэчных фондаў і набыццё правоў доступу да электронных інфармацыйных рэсурсаў выкарыстана 1,8 млн. рублёў, што складае 13,3 % ад бягучага фінансавання бібліятэк. Пры гэтым (у сярэднім па вобласці) 64,6 % ад сукупнага аб'ёму фінансавання было накіравана на аплату падпіскі на перыядычныя выданні. Толькі ў сетцы публічных бібліятэк Барысаўскага, Бярэзінскага, Валожынскага, Любанскага, Пухавіцкага, Салігорскага раёна і г. Жодзіна грашовыя сродкі выкарастаныя на падпіску склалі меней 60 %. У той жа час у некаторых сетках публічных бібліятэк аплата падпіскі перавышае 82,3 % ад агульнага памеру фінансавання.

З мясцовага бюджэту на набыццё кніг і другіх дакументаў (за выключэннем перыёдыкі) было выкарыстана 622,6 тыс. рублей. Сеткі публічных бібліятэк г. Жодзіна, Бярэзінскага, Барысаўскага, Пухавіцкага, Салігорскага і Валожынскага раёна атрымалі на пакупку кніг і іншых дакументаў ад 57,7 % да 41,0 % ад агульнага аб'ёму бюджэтнага фінансавання накіраванага на камплектованне бібліятэчных фондаў. Сеткам публічных бібліятэк Любанскага, Дзяржынскага, Клецкага, Слуцкага, Мінскага, Уздзенскага, Мядзельскага, і Чэрвеньскага раёнаў было вылучана ад 38,3 % да 32,2 %; публічныя бібліятэкі Вілейскага, Капыльскага, Нясвіжскага, Маладзечанскага, Лагойскага, Старадарожскага , Смалявіцкага і Крупскага раёнаў асвоілі ад 28,8 % да 16,6 %. Толькі ў сетцы публічных бібліятэках Стаўбцоўскага раёна на набыцце кніг за кошт мясцовага бюджэту было выдзелена 7,6 % ад агульнага фінансавання, накіраванага на папаўненне

фонду. На набыццё сацыяльна значных выданняў было выкарыстана 23,9 % ад агульнай сумы на набыццё кніг і другіх дакументаў. Так у выніку за кошт мясцовага бюджэту было набыта 67 903 экз. кніг, у тым ліку 13 098 экз. сацыяльна значных выданняў.

Штогод бібліятэкі вобласці выкарыстоўваюць розныя крыніцы камплектавання. Так, дзякуючы падарункам чытачоў і розных арганізацый, фонды бібліятэк папоўніліся на 20 272 экз. кніг на агульную суму 70,0 тыс. рублей. За кошт рэспубліканскага бюджэту фонды бібліятэк папоўніліся на 1 966 экз. дакументаў на суму за 55,8 тыс. рублёў.

У выніку за 2019 г. праз розныя крыніцы камплектавання ў фонды публічных бібліятэк вобласці паступіла 228,1 экз. дакументаў. Большая частка новых паступленняў застаецца ў цэнтральных бібліятэках.

Ва ўсіх сістэмах публічных бібліятэк вобласці ў сярэднім адзін сельскі філіял (без уліку бібліятэк аграгарадкоў) атрымліваў каля 97 экз. кніг. У той жа час адзін сельскі філіял сеткі публічных бібліятэк Лагойскага і Любанскага раёна ў сярэднім атрымаў 49 і 45 экз. кніг. Рэпертуар перыядычных выданняў па вобласці ў сярэднім складае 13 назваў часопісаў і 6 назваў газет.

Па ранейшаму значная ўвага надавалася камплектаванню бібліятэк аграгарадкоў. У сярэднім адна бібліятэка аграгарадка атрымала каля 135 экз. кніг, 16 назваў часопісаў і 8 назваў газет.

Неабходнай умовай для аптымізацыі якасці бібліятэчных фондаў з'яўляецца своечасовае выяўленне і выключэнне састарэлых па змесце, зношаных і дублетных дакументаў. Так у выніку за 2019 г. з фонду публічных бібліятэк вобласці выключана 379,8 тыс. экз. дакументаў, у тым ліку кніг – 183,5 тыс. экз., перыядычных выданняў – 193,5 тыс. экз., іншых дакументаў – 2,8 тыс. экз. Дакументы выключаліся па наступных прычынах: зношаныя – 41,7 %, састарэлыя па змесце – 2,7 %, дублетныя, страчаныя і іншыя

прычыны – 4,7 %,  па прычыне заканчэння тэрміну захоўвання – 50,9%.

Пытанні стану і выкарыстання фондаў абмяркоўваюцца на нарадах пры дырэктары, работа з фондам адлюстроўваецца ў планах работы і справаздачах бібліятэк.

## Інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне

Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне на працягу многіх гадоў застаецца адным з найважнейшых напрамкаў дзейнасці бібліятэк Мінскай вобласці.

На працягу справаздачнага года працягвалася праца па выкананні **бібліяграфічных даведак**. Так у бібліятэках Салігорскага раёна па запытах чытачоў у 2019 годзе было выканана 10 418 бібліяграфічных даведак (у 2018 годзе – 10648 даведак). Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка вяла ўлік толькі складаных даведак, для якіх патрэбен быў прагляд многіх крыніц. За 2019 год выканана 64 даведкі (у 2018 годзе – 101 даведка). За справаздачны перыяд Стаўбцоўская цэнтральная раённая бібліятэка выканала 900 бібліятэчна-бібліяграфічных даведак, што на 26 даведак менш у параўнанні з мінулым годам. Па запытах чытачоў у 2019 годзе бібліятэкамі г.Жодзіна  было выканана1451 бібліяграфічная даведка (у 2018 годзе – 1521). Бібліятэкі Дзяржынскага раёнавыканалі 1104 даведкі (у 2018 годзе – 1513). Бібліятэкі Крупскага раёна выканалі 1148 даведак ў 2019 г., што на 42 даведкі больш, чым у 2018 г. (2018 г.–1106). Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна выканала 4045 даведак (2018 г. – 4033).

На працягу 2019 года праводзілася праца па ўдасканаленню **сістэмы каталогаў і картатэк**. Бібліятэкі вобласці дапоўнілі СКА новымі тэматычнымі рубрыкамі: “150 год Перыядычнай табліцы Мендзялеева”, “Выбары – 2019”,“Перапіс насельніцтва – 2019”, “100-годдзе стварэння БССР”, “75-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-

фашысцкай акупацыі”, “25-годдзе Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь”, “Сацыяльныя сеткі”, “Партнёрскія сувязі Беларусі”, “ІІ Еўрапейскія гульні –2019”, “Выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу”.

На сённяшні дзень ва ўсіх раёнах Мінскай вобласці працуюць публічныя цэнтры прававой інфармацыі (ПЦПІ), якія ўяўляюць сабой пункты свабоднага доступу грамадзян да афіцыйна-прававой інфармацыі.

Усе цэнтральныя бібліятэкі прадастаўляюць карыстальнікам доступ да прававой БД “Эталон”, якая з’яўляецца дзяржаўным інфармацыйна-прававым рэсурсам Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь і дазваляе атрымаць хуткі доступ да эталоннай прававой інфармацыі ад першакрыніцы, а таксама да іншай найбольш запатрабаванай і карыснай інфармацыі: навінаў заканадаўства, даведнікаў, слоўнікаў юрыдычных тэрмінаў і азначэнняў і інш.

На 01.01.2020 у Мінскай вобласці дзейнічае 96 публічных цэнтраў прававой інфармацыі (ПЦПІ), у тым ліку на базе абласной бібліятэкі – 1, раённых і гарадскіх бібліятэк – 32, гарпасялковых і сельскіх бібліятэк – 63.

Агульны фонд ПЦПІ складае 45 800экз. За перыяд 2019 года ў цэнтры ПЦПІ звярнуліся 5 300карыстальнікаў і колькасць наведванняў склала 16 900, па іх запытах выдадзена каля 12 000 даведак.

З нагоды перапісу насельніцтва ў бібліятэках Мінскай вобласці былі падрыхтаваны тэматычныя выставы, прэс-дасье: “Перапіс насельніцтва 2019: погляд на сучаснасць – крок у будучыню!”, “Колькі нас? Якія мы?”, “Перапіс насельніцтва-2019”, “Перапішыся он-лайн!”.

Падрыхтаваны і праведзены тэматычныя інфарміны: “Выбары–2019”, “Зрабі свой выбар” ,“Выбаршчыкам аб кандыдатах”, “Твае правы, выбаршчык”, “Выбары – дзяржаўны абавязак грамадзяніна”, “Выбары на старонках перыядычных выданняў”.

У перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 7-га склікання ў кожнай бібліятэцы Мінскай вобласці дзейнічаў Куток выбаршчыка, у рамках якога былі арганізаваны тэматычныя выставы, інфарм-выставы, выставы-заклікі "Насустрач выбарам", "Думай, вырашай, выбірай" і інш. Вяліся папкі-дасье "Маладому выбаршчыку", "Інфармацыя выбаршчыку", "Выбары. Грамадства. Улада", "Выбарчы акорд" і інш.

Бібліятэкі Міншчыны паспяхова праводзяць працу **па бібліяграфічным інфармаванні**. У бібліятэках Дзяржынскага раёна на індывідуальнай інфармацыі састаяла 43 абаненты, якія былі праінфармаваны аб 1109 выданнях рознай тэматыкі: "Працоўнае заканадаўства", "Народная культура Беларусі", "Сацыяльныя аспекты рыначнай эканомікі", "Сацыяльная работа ў школе", "Музеі. Музейная справа ў Рэспубліцы Беларусь" і інш. Групавой інфармацыяй было забяспечана 39 абанентаў. Усяго за год ім рэкамендавана 792 выданні па тэмах: "Выхаваўчая сістэма сучаснай сельскай школы", "Развіццё сельскай гаспадаркі на сучасным этапе", "Дзейнасць органаў мясцовай улады на сучасным этапе", "Сучасная сістэма дашкольнага выхавання".У бібліятэках Лагойскага раёна для інфармавання чытачоў аб новай літаратуры ў дапамогу прафесійнаму чытанню ажыццяўлялася групавое інфармаванне 40 калектываў па тэмах: "Воспитательный процесс: теория и практика", "Физическое воспитание и здоровье школьников", "Игры и развлечения дошколят", "Тэхнічнае абслугоўванне і рамонт аўтамабіляў, эксплуатацыя аўтамабіляў, захаванне перавозных грузаў, бяспека руху на аўтамабільным транспарце", "Медыцына на службе здароўя чалавека", "Новая літаратура ў дапамогу выхаванню дашкольнікаў і самаадукацыі выхавацеляў", "Новая літаратура ў дапамогу вытворчасці", "Тэхнічная бяспека птушкафабрыкі", "Обучение. Воспитание. Развлечения", "Краски и ноты", "Радуга идей", "Творы для пазакласнага чытання", "Читаем малышам, "Беларуская літаратура", "У

дапамогу пазакласнаму чытанню”, “У свеце дзіцячай літаратуры”, “У дапамогу навучальнаму працэсу”, “Новае ў сельскай гаспадарцы”, “Беларуская літаратура. Творчасць паэтаў і пісьменнікаў”, “Чамучка пазнае свет”, “Будзе вольны час – пачытай ты нас”, “Крытыка і літаратуразнаўства” і інш. Было складзена 146 інфармацыйных спісаў. Індывідуальную інфармацыю ў бібліятэках Лагойскага раёна атрымлівалі 78 абанентаў па тэмах: “У дапамогу вывучэнню беларускай літаратуры”, “У сяброўстве з прыродай”, “Дзіўнае побач”, “Экалагічнае выхаванне ў пачатковых класах”, “У дапамогу правядзенню масавых мерапрыемстваў”, “Сам сабе псіхатэрапеўт”, “Методыка і вопыт навучання прадмету: гісторыя”, “Лекі без аптэкі: дыябет”, “Кветкі ў інтэр’еры”, “Магія творчасці”, “Зялёны дызайн”, “Любознайке на заметку”, “Мы растем”, “Кактус и компания”, “Большая перемена”, “Удивительное рядом”, “Корзинка рукодельницы”, “Школа безопасности”, “Вінаградныя клопаты”, “Новыя творы беларускіх аўтараў”, “Смачнае печыва”, “Навука агародніка”, “Сам сабе садоўнік”, “Каляровая клумба” і інш. Усяго было складзена 303 інфармацыйныя спісы. Індывідуальнае інфармаванне бібліятэк Любанскага раёна вялося для 89 абанентаў, сярод якіх кіраўнікі ўстаноў горада і раёна, спецыялісты народнай гаспадаркі, медыцынскія работнікі, працаўнікі АПК, выхавацелі і настаўнікі мясцовых навучальных устаноў, кіраўнікі гурткоў і аматарскіх аб’яднанняў, выхавацелі дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, а таксама хатнія гаспадыні, пенсіянеры, інваліды, вучні школ і інш. Сярод тэм індывідуальнага інфармавання можна вылучыць наступныя: “Абрадавая дзейнасць і фальклор Любаншчыны”, “Дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Прыёмныя і патранажныя сем’і”, “Людзі, чые магчымасці абмежаваныя, і работа з імі”, “Дашкольнае выхаванне і навучанне”, “Старасць – у радасць!”, “Уречье на страницах газет”,“Лекавыя расліны і іх прымяненне”, “Рукоделье не безделье”, “Свет веры, свет духоўнасці”, “Навіны жывёлагадоўлі”, “ТБ на канапе”, “Смачны пост” і інш. Нязменнай папулярнасцю

карыстаюцца такія тэмы, як “Кветкаводства”, ”Здаровы лад жыцця”, “Парады пчаляру”, Народныя рэцэпты”, “Ураджайны агарод”, “Хатняя ферма” і інш. Групавое інфармаванне вялося для 61 абанента, сярод якіх: сельскія Саветы, тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, школы рамёстваў і дэкаратыўна-прыкладной творчасці, цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, школы мастацтваў, цэнтры дзіцячай творчасці, установы аховы здароўя, дамы культуры, калектывы навучальных устаноў раёна, а таксама калектывы мастацкай самадзейнасці, фальклорныя ансамблі, гурткі, аматарскія клубы і аб’яднанні, такія, напрыклад, як аб’яднанне кветкаводаў-аматараў “Арабенія” пры Камунараўскім СДК, фалькгурт “Беражнічка” пры Пластокскім СДК, аматарскае аб’яднанне “Берагіня” пры Тальскім СДК і інш. Яны інфармаваліся па такіх тэмах як: “Фальклор. Этнаграфія. Народныя звычаі”, “Лад жыцця беларусаў”, “Любаншчына на старонках рэспубліканскага друку”, “Сацыяльнае абслугоўванне. Састарэлыя людзі. Інваліды”, “Народны лячэбнік”, “Здаровы лад жыцця”, “Экалагічнае выхаванне”, “Клопат. Дабрыня. Міласэрнасць”, “Калі хобі – кветкаводства”, “Тым, хто не жадае старыцца”, “Выпускнікам і абітурыентам” і інш.

**Прапаганда ББВ (бібліяграфічныя ўрокі, Дні бібліяграфіі, бібліяграфічныя агляды)** таксама добра арганізавана бібліятэкамі вобласці. На працягу года праводзілася навучанне чытачоў асновам інфармацыйна-бібліяграфічнай культуры ў бібліятэках Слуцкага раёна.Усяго бібліятэкамі раёна было праведзена 188 бібліятэчных заняткаў і 43 дні бібліяграфіі: “У свет інфармацыі праз бібліятэку”, “Падарожжа ў краіну дзіцячых кніг”, “Сто вопросов в голове, а ответы… в словаре!”, “Какие тайны хранят каталоги?”, “В книжном царстве – каталожном государстве”,“Сістэма каталогаў і картатэк бібліятэкі”, “Библиография в помощь читателям”, “Бібліяграфічны калейдаскоп”, “Зовёт страна Читалия”, “Русской речи государь под названием словарь”, “Учись искать и выбирать”, “Искусство быть читателем”,

“Кладовая знаний”, “Справочное царство – мудрое государство”, “Новое время – новый взгляд”, “Слов драгоценные клады: словари бывают разные”, “Тайны библиографии”, “Каталогі – твае памочнікі ў выбары кніг”, “Хто шукае, той заўсёды знойдзе: энцыклапедыі і даведнікі бібліятэкі”, “Спутники читателя: справочники, энциклопедии, словари”, “Интересно знать, где, что и как искать”.У справаздачным годзе бібліятэкамі Клецкага раёна было праведзена 48 Дзён бібліяграфіі: “Клецкая зямля гісторыяй багата. Краязнаўчая картатэка”, “Даведачна бібліяграфічны апарат”, “Добро пожаловать, в книжную Вселенную”, “Кнігі і іх стваральнікі”, “Говорит и показывает библиотека”, “Пошук кніг вядуць чытачы”, “Усё ведаюць энцыклапедыі, даведнікі, слоўнікі”, “Знаёмства з бібліятэкай”, “Газеты і часопісы для разумовага развіцця”, “Таинственная паутина: ресурсы Интернет”, “Наша информация –Ваш успех”, “Твае першыя энцыклапедыі, слоўнікі, даведнікі” і іншыя.Бібліятэкі Клецкага раёна на працягу года вялі прапаганду бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў сярод навучэнцаў школ. Праведзена 10 аглядаў бібліяграфічных дапаможнікаў. Усяго бібліятэкамі Лагойскага раёна было праведзена 72 бібліяграфічныя агляды па тэмах: “Знаменитый автор Шерлока Холмса”, “Мы ўспамінаем пра вайну”, “Праблемы экалогіі ў сучаснай літаратуры”, “Добрыя парады для вашага здароўя”, “Летапіс мужнасці”, “Пра час, асобу і народ”, “Абпаленыя старонкі”, “Для любога ўзросту: ад дзяцей ла дарослых”, “Лабірынты страху”, “Прырода роднага краю”, “Время великих событий”, “Правдивые книги войны”, “Крок у прафесію”, “Па старонках “Чырвонай кнігі”, “Вайна вачыма падлеткаў”, “Чарадзеі роднага слова”, “Любімыя кнігі дзяцінства”, “Беларускія пісьменнікі дзецям” і інш.У 2019 годзе бібліятэкамі Лагойскага раёна было праведзена 8 Дзён бібліяграфіі на розныя тэмы: “Как ориентироваться в библиотеке”, “СБА и его возможности”, “Чудеса? Нет, наука”, “Зямля, дзе пачаўся твой лёс”, “Пазнай Беларусь – і ты яе палюбіш”, “Што?Дзе?Калі?”, “Далёкія і блізкія суродзічы”, “Чытаць Пушкіна дапамагае

бібліяграфія” і інш. Дні бібліяграфіі ўключалі агляды літаратуры, кансультацыі, гутаркі па выкарыстанню даведачна-бібліяграфічнага апарату, па культуры чытання. З вучнямі школ праводзіліся ўрокі інфармацыйнай культуры. Праведзена 66 бібліяграфічных урокаў бібліятэкамі Валожынскага раёна. У Валожынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы таксама праводзіліся бібліятэчна-бібліяграфічныя агляды новай літаратуры, так і тэматычныя. Так, напрыклад, да 220-годдзя з дня нараджэння Аляксандра Пушкіна 6 чэрвеня 2019 года ў Валожынскай ЦБ для ўсіх жадаючых пазнаёміцца з творчасцю рускага паэта, празаіка, драматурга, стваральніка рускага літаратурнага языка быў праведзены агляд літаратуры “Поэт на все времена”. Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П.Труса правяла цыкл экскурсій-знаёмстваў з інфармацыйнымі рэсурсамі для вучняў сярэдніх і старэйшых класаў “Як прайсці ў бібліятэку?.. Віртуальную”, “Абітурыент – 2019”. Для выхаванцаў школьных летнікаў праведзены экскурсіі па бібліятэцы па азнаямленню з даведачна-бібліяграфічным апаратам і электроннымі інфармацыйнымі рэсурсамі. У сельскіх бібліятэках прапаганда бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў ажыццяўлялася ў розных формах. Шырока выкарыстоўвалася такая форма, як экскурсіі па бібліятэцы: “Падарожжа ў Чыталію”, “Путешествие в Книгоград”. Былі праведзены бібліятэчныя ўрокі: “Як ты, кніга, збудавана?”, “Што вы ведаеце пра кнігу?”, гутаркі: “Даведачная літаратура. Слоўнікі. Дзіцячая энцыклапедыя”, “Откуда книга к нам пришла”, бібліяграфічныя гульні і трэнінгі: “Остров периодики”, “Каждый должен разбираться, как с книгой обращаться”, “Биографическая азбука доктора Даля” і інш. Найбольш распаўсюджанай формай знаёмства чытачоў з кнігай у бібліятэках Чэрвеньскага раёна з’яўляюцца бібліяграфічныя агляды. У бібліятэках раёна прайшлі агляды па наступных тэмах: “Чтение для души”, “Зямлі маёй роднае слова”,“В царстве флоры и фауны”,“Новые книги – новые имена”,“Дорогая сердцу книга о войне”, “Дзе ручнік, там і хлеб”,“Як быць здаровым кожны дзень табе падкажа кніга”,

“Летапіс мужнасці”. Для чытачоў ладзіліся тэматычныя прагляды літаратуры: “Осторожно! СПИД”, “За здаровы лад жыцця”,“Читайте, читайте, страницы листайте” ,“Наш дом – планета Земля”. Праведзена 20 бібліяграфічных аглядаў у бібліятэках Дзяржынскага раёна: “БССР страницы 100-летней истории” (мультымедыйны агляд-прэзентацыя), “Белорусская государственность: от Статута до Конституции” (мультымедыйны агляд-прэзентацыя), “С юмором по жизни: ТОП-10 позитивных книг, которые избавят Вас от хандры и плохого настроения”, “Хоррор, ужасы, ужастики”.

Трэба адзначыць і працу бібліятэк ў падрыхтоўцы **бібліяграфічных выданняў**. Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя М.Танка падрыхтавала друкаваную прадукцыю, накіраванаю на прапаганду здаровага ладу жыцця і прафілактыку шкодных звычак: буклеты “Знай свои права – управляй своим будущим!”, “Алкоголю скажем: “Нет!”, “Время бросать курить”і інш. Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка падрыхтавала бібліяграфічныя газеты: “Ты в сердце, Солигорщина родная!” (да 95-годдзя ўтварэння Салігорскага раёна), “Героическая Беларусь” (да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў), “Афганистан болит в моей душе…” (да 30-годдзя вываду савецкіх войскаў з Афганістана); “Хранители слова!” (да Дня бібліятэк); інфармацыйныя і рэкамендацыйныя спісы: “Сям'я ў сучасным грамадстве” (да Міжнароднага дня сям’і), “Здаровы Я – здаровая краіна!” (Вып. № 1 в серыі «Здаровы лад жыцця»), “Футбольны клуб “Шахцёр”, “Валейбольны клуб “Шахцёр”, “У дапамогу механізатару”, “У дапамогу жывёлаводаў”, “Інавацыйнае развіццё АПК”, інфармацыйныя буклеты: “З гонарам выкананы доўг” (да 30-годдзя вываду Савецкіх войскаў з Афганістана, “Асцярожна! Гульнявая залежнасць”, “Здароўе – гэта будучыня!”, “Сям'я ў сучасным свеце” (да Міжнароднага дня сям'і). Уздзенскай цэнтральнай раённая бібліятэкай імя П.Труса падрыхтаваны штогадовы рэкамендацыйны спіс новай літаратуры рэлігійнай тэматыкі: “Свет незгасальны – 2019”. У рамках рэспубліканскай

міжведамаснай праграмы “Забота” выдадзены рэкамендацыйны агляд: “Працоўная чвэрць” з аглядам працоўнага заканадаўства для падлеткаў. Жодзінскай цэнтральнвай гарадской бібліятэкай падрыхтаваны рэкамендацыйныя бібліяграфічныя спісы літаратуры: “Яны выканалі свой абавязак, мы захаваем пра гэта памяць”, прысвечаны 30-й гадавіне выводу войскаў з Рэспублікі Афганістан,“Іх подзвіг мы ў сэрцы захоўваем” да 75-годдзя освобождения Беларуси ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, “17 лістапада 2019 года Выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі беларусь 7-га склікання”, “Перапіс насельніцтва 4-30 кастрычніка 2019 года”, “ІІ Еўрапейскія гульні ў Мінску 21-30 чэрвеня 2019г.”,“75 гадоў вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў”,“75 гадоў Перамогі”, “30-я гадавіна вываду савецкіх войскаў з Рэспублікі Афганістан”. Працягвалася работа па складанні бібліяграфічных дапаможнікаў па найбольш важных, актуальных тэмах і праблемах у бібліятэках Слуцкага раёна. У 2019 былі выдадзены рэкамендацыйныя спісы літаратуры: “Великая Победа в именах и датах: к 75-летию освобождения Слутчины от немецко-фашистских захватчиков”, “Гісторыя газеты – гісторыя раёна: да 100-годдзя выхаду газеты “Слуцкі край”, “Выборы в Палату представителей Национального собрания Республики Беларусь седьмого созыва”, “Их будущее – в наших руках: за строкой Декрета № 18 “О дополнительных мерах по государственной защите детей в неблагополучных семьях”, краязнаўчы каляндар “Памятныя даты календара, 2020 г. Слуцк, Слуцкі раён”.

Бібліятэкі вядуць працу над папаўненнем створанай **БД «Аналітыка»**. Да прыкладу, БД “Аналітыка” Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х.Каладзеева змяшчае 349878 бібліяграфічных запісаў, папоўнілася на 9017 запісаў у параўнанні з 2018 годам. БД “Аналітыка” Жодзінскай цэнтральнай гарадской бібліятэкі папоўнілася на 2058 пазіцый і зараз мае ў БД 56896 бібліяграфічных запісаў. БД “Артыкулы” Мядзельскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя

М.Танка ўключае 4034 запісы (уведзена 920 запісаў). База даных “Артыкулы” Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі папоўнілася 5763 запісамі і на 01.01.2020 года склала 47162 запісаў. БД “Аналітыка” Валожынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі налічвае 8435 бібліяграфічных анатаваных запісаў (уведзена 525 запісаў). БД “Аналітыка” Уздзенскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П.Труса змяшчае 3417 бібліяграфічных запісаў, папоўнілася на 500 запісаў.

У 2019 годзе Жодзінскай цэнтральнай гарадской бібліятэкай створаны паўнатэкставыя электронныя рэсурсы па актуальных сацыяльна-палітычных тэмах: “II Еўрапейскія гульні ў Мінску 21-30 чэрвеня 2019г.”, “75 гадоў вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў”, “Перапіс насельніцтва 4-30 кастрычніка 2019 года”,“100 гадоў БССР”,“30-я гадавіна вываду савецкіх войскаў з рэспублікі Афганістан”, “75 гадоў Перамогі”. У Барысаўскай цэнтральнай раёнай бібліятэцы імя І.Х.Каладзеева праводзілася работа па фарміраванні паўнатэкставых баз дадзеных мясцовай генерацыі: ФБД даных "Памяць Барысаўшчыны”, БД “У дапамогу школьнікам”, БД “Вяртанне да вытокаў”, БД “Слова краязнаўцы”. На 01.01.2020 аб'ём усіх БД уласнай генерацыі склаў 2179 запісаў.

Паспяхова працягваецца праца бібліятэк вобласці ў **кансорцыуме "LibКард"**. За 2019 г. супрацоўнікі Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С. Пушкіна распісалі 1615 артыкулаў,супрацоўнікі Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х.Каладзеева –1255 артыкулы.

Падводзячы вынікі можна зрабіць выснову, што ў бібліятэках Мінскай вобласці бібліяграфічнае абслугоўванне як кірунак дзейнасці захоўвае сваю значнасць. Але эфектыўнасць і якасць даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк залежыць ад магчымасці выкарыстання сеткавых інфармацыйных рэсурсаў і стану даведачна-бібліяграфічнага апарату.

# Метадычная дзейнасць

Дзейнасць аддзелаў бібліятэчнага маркетынгу цэнтральных бібліятэк вобласці ў 2019 годзе была накіравана на вывучэнне, распрацоўкуі падтрымку сучасных перадавых напрамкаў у рабоце, павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў, умацаванне сувязей з грамадскасцю, стварэнне пазітыўнага іміджу бібліятэк.

У мінулым годзе публічнымі бібліятэкамі Мінскай вобласці вялася работа па рэалізацыі праграм і праектаў, якія распрацаваны ў дапамогу павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў: міжнародныя праекты “Псковщина – Борисовщина: грани сотрудничества”, “Библиотека без границ: интеграция в мировое библиотечное пространство” (Барысаўскі раён); праграма “Ступені майстэрства” (Любанскі, Маладзечанскі раёны); праграма “Библиолестница” (Мінскі раён); праект “Мастерство – путь к успеху” (Смалявіцкі раён); праект “Майстэрства і якасць – шлях да поспеху” (Чэрвеньскі раён).

Узровень прафесійнай падрыхтоўкі работнікаў вызначае якасць і эффектыўнасць дзейнасці бібліятэк. Сістэматычна праводзяцца семінары, практыкумы, нарады, круглыя сталы, дні метадычнай дапамогі і інш. Так, у 2019 годзе былі праведзены семінары: “Солнце на книжной странице“: организация летнего досуга несовершеннолетних в библиотеках Борисовского региона” (Барысаўскі раён); “Бібліятэка – інфармацыйна-дасугавы цэнтр забеспячэння патрэб непаўналетніх у адукацыі, прафарыентацыі, у духоўным і эстэтычным развіцці” (Бярэзінскі раён); “Віртуальная пляцоўка сельскай бібліятэкі – старонкі ў сацыяльных сетках” (Вілейскі раён); “Новыя формы арганізацыі масавай работы ў бібліятэках як спосаб прасоўвання кнігі і чытання” (Валожынскі раён); “Прыярытэт здароўе: фарміраванне здаровага ладу жыцця ў насельніцтва” (Дзяржынскі раён); “Нетрадыцыйныя формы візуальнай і масавай работы бібліятэк” (Клецкі раён); “Бібліятэка і экалогія: вопыт, традыцыі і інавацыі” (Крупскі раён); “Адкрываем радзіму –

пазнаём сябе: бібліятэчнае краязнаўства сёння” (Лагойскі раён); “Заканадаўчая база па рабоце з непаўналетнімі ў сістэме бібліятэк” (Любанскі раён); “Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне дакументаў”. (Маладзечанскі раён); “Библиотечное обслуживание пользователей в сфере духовно-нравственного воспитания” (Мінскі раён); “Сучасная бібліятэка ў грамадзянска-патрыятычным выхаванні асобы” (Мядзельскі раён); “Фарміраванне актыўнай жыццёвай пазіцыі, патрыятызму, законапаслухмянасці і культуры ў прадстаўнікоў маладога пакалення сродкамі культурна-асветніцкай работы” (Пухавіцкі раён); “Здаровае дзяцінства – здаровая нацыя: арганізацыя асветніцкай работы бібліятэк з чытачамі дзіцячага ўзросту і бацькамі” (Слуцкі раён); “Краязнаўства ў сучаснай бібліятэцы: стварэнне інфармацыйнага асяроддзя” (Смалявіцкі раён); “В диалоге с современной книгой: работа библиотек по популяризации книг белорусских авторов” (Салігорскі раён); “Дарите людям доброту: место и роль библиотеки в системе социальной защиты населения” (Старадарожскі раён); “Інавацыйная дзейнасць бібліятэк: актуальныя пытанні тэорыі і практыкі” (Стаўбцоўскі раён); “Фарміраванне культуры сямейных адносін на аснове праваслаўных традыцый” (Уздзенскі раён); “Сучасныя падыходы да арганізацыі працы з дзіцем і яго сям'ёй па прафілактыцы супрацьпраўных паводзін непаўналетніх, сямейнага недабрабыту ў Чэрвеньскім раёне” (Чэрвеньскі раён); “Раскрытие фонда через наглядные формы пропаганды книги” (г. Жодзіна).

Адбыліся круглыя сталы: “Борисовский район – 95 славных лет” (Барысаўскі раён); “Чытанне, як фенамен захаванасці культурнай спадчыны” (Клецкі раён); “Чытач-падлетак у бібліятэцы: праблемы і формы работы” (Крупскі раён), “План – аснова дзейнасці бібліятэкі. Планаванне на 2020 год” (Любанскі раён); “Арганізацыя бібліятэчнай прасторы: пошук сэнсу і формы” (Маладзечанскі раён); “Повышение эффективности деятельности публичных библиотек по организации содержательного досуга несовершеннолетних пользователей” (Нясвіжскі раён); “Чтение как фактор

преодоления асоциальных явлений в детской и молодежной среде” (г. Жодзіна).

Наладжваліся практыкумы: “Свободное творчество в библиотеке – пишем синквейн” (Барысаўскі раён); “Асноўныя цяжкасці пры растаноўцы картак АК і СК. Правілы растаноўкі кніжнага фонда” (Валожынскі раён); “Бібліятэчнае краязнаўства як фактар павышэння культурнага патэнцыялу рэгіёна” (Клецкі раён); “Вядзенне ўліковай дакументацыі. Паступленне і выбыццё дакументаў у фонды сельскай бібліятэкі” (Крупскі раён); “Стварэнне бібліятэчнай рэкламнай прадукцыі з дапамогай праграмы Microsoft Publisher” (Любанскі раён); “Деятельность библиотек по комплектованию фондов” (Мінскі раён); “Формы и методы популяризации книг военной тематики” (Салігорскі раён); “Работа з фондам перыядычных выданняў” (Узденскі раён); “Библиоимидж: социально-психологические основы” (г. Жодзіна).

Сярод іншых форм павышэння кваліфікацыі бібліятэчных кадраў – кансультацыі і метадычныя парады, канферэнцыі і інш.

Павышэнню прафесійнага майстэрства маладых супрацоўнікаў і супрацоўнікаў без спецыяльнай адукацыі спрыяюць разнастайныя па тэматыцы адаптацыйныя заняткі, практыкумы, пасяджэнні ў “Школе пачынаючага бібліятэкара”, “Школе маладога бібліятэкара”, “Школе камп’ютарных ведаў”, “Школе маладога спецыяліста”, “Альтэрнатыўнай школе бібліятэкара”, на “Факультэце бібліятэчных ведаў”. Так, у 2019 годзе былі разгледжаны наступныя пытанні: “Я предлагаю свой опыт”, “Самообразование – ступень роста” (Барысаўскі раён); “Справаздачнасць у бібліятэцы: асаблівасці, патрабаванні, рэкамендацыі” (Вілейскі раён); “Сучасны падыход у арганізацыі бібліятэчнай прасторы” (Валожынскі раён); “Бібліятэчная азбука” (Дзяржынскі раён); “Сучасны падыход да арганізацыі бібліятэчнай прасторы” (Клецкі раён); “Библиотечные квесты как инновационная форма работы” (Мінскі раён); “Інфармацыйная культура карыстальнікаў” (Слуцкі раён); “Масавая работа ў бібліятэцы” (Смалявіцкі

раён); “Библиотечное обслуживание читателей в сельском клубе-библиотеке” (Салігорскі раён).

З мэтай вывучэння інфармацыйных запатрабаванняў карыстальнікаў і ўдасканальвання іх абслугоўвання ў бібліятэках вобласці на працягу справаздачнага года праводзіліся сацыялагічныя і маркетынгавыя даследаванні, анкетаванні і апытанні: “Подросток: мои читательские предпочтения” (Валожынскі раён); “Чытанне беларускай літаратуры ў бібліятэцы” (Крупскі раён); бліц-апытанне “Што для вас бібліятэка?” (Пухавіцкі раён).

Пазітыўны ўплыў на стан бібліятэчнай справы ў раёне аказвае выдавецкая дзейнасць. У дапамогу бібліятэкарам складаюцца метадычныя рэкамендацыі, парады і дапаможнікі, сцэнарыі да юбілеяў пісьменнікаў і г.д. Так, у 2019 годзе былі выдадзены наступныя метадычныя рэкмендацыі: “Рекомендации библиотекарям по вовлечению несовершеннолетних, состоящих на различных видах учета в культурно-досуговую деятельность через библиотечное обслуживание“ (Валожынскі раён); “Проектная деятельность в библиотеке: от замысла к реализации” (Вілейскі раён); да Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі “Добрыя кнігі – сябры назаўжды” (Любанскі раён); “Библиографические справки: виды, выполнение, учёт” (Мінскі раён); “Уличные формы библиотечной работы” (Смалявіцкі раён); “Советы начинающему библиотекарю” (Чэрвеньскі раён). На працягу мінулага года ажыццяўляўся выпуск прафесійных інфармацыйных зборнікаў: “Бібліятэчны калейдаскоп” (Валожынскі раён); “Біблія-навіны.” (Старадарожскі раён); “Справы бібліятэчныя”, “Жыццё бібліятэк Стаўбцоўскага раёна” (Стаўбцоўскі раён).

Былі распрацаваны і выдадзены сцэнарыі да юбілеяў пісьменнікаў і дзеячаў культуры і навукі: да 75-годдзя беларускага мастацтвазнаўцы і этнографа Міхася Раманюка “Вандроўнік па краіне Беларусь. Міхась Раманюк” (Дзяржынскі раён); да 195-годдзя з дня нараджэння Я. Тышкевіча “Тышкевич Евстафий” (Лагойскі раён); да 95-

годдзя з дня нараджэння Артура Вольскага “Свет беларускай казкі” (Маладзечанскі раён).

Станоўчую ролю ў стымуляванні работы бібліятэк адыгрывае штогодні рэспубліканскі конкурс “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры”. Прызёрамі XXVII конкурсу сталі: у намінацыі “За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем” – Мар’інагорская гарадская бібліятэка сеткі публічных бібліятэк Пухавіцкага раёна (трэцяя прэмія); у намінацыі “За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы” – ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка” (першая прэмія), Ракаўская сельская бібліятэка ДУ “Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка” (трэцяя прэмія); у намінацыі “За падтрымку і развіццё чытання” – Бярэзінская дзіцячая бібліятэка ДУК “Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка” (першая прэмія).

Публічныя бібліятэкі Мінскай вобласці таксама адзначаны на V Рэспубліканскім конкурсе “Библиотека – центр духовно-нравственного просвещения и воспитания”: спецыяльная прэмія – ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х. Каладзеева”; намінацыя “Духоўна-маральнае выхаванне дзяцей і моладзі” – ДУК “Цэнтральная гарадская бібліятэка г. Жодзіна” (другое месца), Гатаўская сельская бібліятэка-клуб ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка” (трэцяе месца); намінацыя “Патрыятычнае выхаванне на праваслаўных традыцыях” – ДУК “Узденская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса” (другое месца).

Станоўчую ролю ў стымуляванні работы бібліятэк адыгрываюць штогадовыя раённыя прафесійныя агляды-конкурсы. У 2019 годзе былі арганізаваны і праведзены: конкурс на лепшую арганізацыю работы “75 гадоў без вайны” (Вілейскі раён); агляд-конкурс на лепшае афармленне краязнаўчых куткоў “Тут радзімы маёй пачатак” (Валожынскі раён); прафесійна-творчы конкурс “Мае землякі на дарогах вайны” (Дзяржынскі раён); конкурс буктрэйлераў “Чытай сваё” (Капыльскі раён), агляд-конкурс на лепшы артыкул аб сваёй працы “Мы ў газеце. Газета пра нас” (Крупскі раён); творчы

конкурс бібліятэкараў “Мой родны край – твая гісторыя жыве!” (Лагойскі раён); конкурс на лепшую бібліяграфічную прадукцыю краязнаўчай тэматыкі “Я нарадзіўся тут” (Любанскі раён); конкурс на лепшую віртуальную выставу “Равнение на Победу” (Мінскі раён); конкурс медыяпрэзентацый “Мой край” (Маладзечанскі раён); конкурс на лепшую пастаноўку работы па патрыятычнаму выхаванню “Памяць вялікага подвігу” (Мядзельскі раён); агляд-конкурс на лепшую арганізацыю і правядзенне краязнаўчага мерапрыемства, прысвечанага Году малой радзімы “Мой родны край – мая гісторыя жывая” (Слуцкі раён); конкурс праектаў “Ярмарка бібліятэчных ідэй” (Смалявіцкі раён); конкурс “Время библиотек” (Старадарожскі раён); конкурс па прапагандзе кніг ваеннай тэматыкі “Пра вайну раскажуць кнігі” (Узденскі раён).

Такім чынам трэба адзначыць, што метадычная дзейнасць, накіраваная на аказанне тэарэтычнай і практычнай дапамогі бібліятэкам Міншчыны, шматбаковая і эфектыўная, а таму формы работы дзеля дасягнення станоўчых вынікаў штогод удасканальваюцца і пашыраюцца.

**Бібліятэкі Міншчыны ў 2019 годзе: агляд дзейнасці**

**Складальнікі:** Анацка В.Л.
Барахоўская М.В
Вярхоўская К.Д.
Гіль В.М.
Крахмалюк К.І.
Лазарава І.П.
Несцярэнка А.Г.
Рудзянок І.С.

Падпісана да друку: 02.07.2020 г.

Тыраж 3 экз. Заказ № 2

220005 г. Мінск, вул. Гікалы, 4
ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна»